Л. В. Ракава

# Гісторыя на градках

агародніцтва на Беларусі





Л. В. Ракава

# Гісторыя на градках

## агароднiцтва на Беларусi



Мінск
«Беларусь»
2008

УДК 635.1/.8(476)(091)
ББК 42.34(4 Беи)
Р 19

Рэцэнзенты:
доктар гістарычных навук *А.Ул. Гурко;*
доктар гістарычных навук *І.У. Чаквін*

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу*
*Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

У кнізе выкарыстаны фота *М. Мельнікава,*
*Т. Габрусь, М. Віннікавай, Л. Ракавай*

**Ракава, Л.В.**
Р19 Гісторыя на градках: агародніцтва на Беларусі/ Л.В. Ракава. — Мінск : Беларусь, 2008. — 144 с. : іл.
ISBN 978-985-01-0814-2.

Кніга прысвечана аднаму са старажытных заняткаў беларусаў — агародніцтву. У ёй разглядаюцца асаблівасці апрацоўкі глебы, прылад працы, тэхналогіі вырошчвання і распаўсюджвання агародных культур у розныя гістарычныя часы ў розных сацыяльна-саслоўных групах. Значнае месца адводзіцца вераванням, звычаям і рытуалам беларусаў, звязаных з агародніцтвам. У аснову работы пакладзены старажытныя пісьмовыя актавыя дакументы, хронікі XVI—XVIII стст., матэрыялы архіваў XIX—XX стст. і дадзеных этнаграфічных даследаванняў 1960—2000-ых гг.

Разлічана на этнолагаў, гісторыкаў, культуролагаў, работнікаў сельскай гаспадаркі, студэнтаў ВНУ і шырокае кола чытачоў, якія цікавяцца гэтай праблемай.

**УДК 635.1/.8(476)(091)**
**ББК 42.34(4 Беи)**

**ISBN 978-985-01-0814-2**

© Ракава Л.В., 2008
© Афармленне. РУП «Выдавецтва «Беларусь», 2008

# УВОДЗІНЫ

Беларусы спрадвеку былі земляробамі, іх матэрыяльная і духоўная культура была класічна земляробчай. Неад'емнай часткай сялянскай гаспадаркі з'яўлялася агародніцтва. Адсутнасць крыніц не дазваляе вызначыць час, калі агародніцтва стала асобнай галіной у сістэме земляробства, узнікненне якога гісторыкі адносяць да эпохі неаліту (III тысячагоддзе да н. э.)[1]. Занятак агародніцтвам у беларусаў быў арыентаваны на забеспячэнне патрэб даволі вялікай у той час сям'і прадуктамі харчавання, дзе значную долю складала агародніна. Можна сказаць, што і сёння прадукцыя са свайго агарода ў многім забяспечвае жыццядзейнасць жыхароў вёскі і гарадскіх пасёлкаў, а для жыхароў асобных рэгіёнаў Беларусі з'яўляецца і асноўнай крыніцай даходаў. Здаўна на агародах вырошчвалі боб, гарох, капусту, буракі, моркву, пастэрнак, хрэн, пятрушку, цыбулю, часнок, рэпу, бручку, агуркі, мак і інш.

Развіццё агародніцтва на Беларусі мае асобую актуальнасць з-за малай вывучанасці і дыскусійнасці многіх пытанняў этнічнай гісторыі. Раскрыццё старажытных рысаў, пераемнасць і шляхі развіцця агародніцтва на землях Беларусі з эпохі феадалізму да нашых дзён уяўляюць цікавасць як для вырашэння этнагенетычнай праблемы, так і для разумення культурнай спадчыны беларусаў.

На напісанне гэтай работы аўтара навяла думка пра амаль поўную адсутнасць спецыяльных прац, прысвечаных гісторыі развіцця агародніцтва на Беларусі. Шматлікія апублікаваныя працы гісторыкаў утрымліваюць вельмі цікавыя звесткі аб развіцці сельскай гаспадаркі розных саслоўяў феадальнага і капіталістычнага грамадства, няроўнасці становішча розных сацыяльна-саслоўных груп, характары павіннасцяў і г. д. На жаль, пытанням матэрыяльнай і духоўнай культуры, у тым ліку і месцу агародніцтва ў быце насельнікаў Беларусі, удзяляецца мала ўвагі. Самыя агульныя звесткі аб гэтай вельмі важнай галіне матэрыяльнай культуры пачарпнуты аўтарам з прац вядомых гісторыкаў, археолагаў, этнографаў: М. Ры-

тава, П. Шпілеўскага, А. Грушэўскага, А. Кіркора, І. Сербава, М. Нікіфароўскага, Ю. Крачкоўскага, М. Улашчыка, Л. Малчанавай, Л. Мінько, В. Цітова, А. Лойкі, М. Спірыдонава, З. Капыскага, П. Казлоўскага, В. Голубева і інш. Найбольш значнай сярод іх з'яўляецца невялікая праца М.В. Рытава «Огородничество в Белоруссии. Современное состояние нашего сортоведения» (Доходное плодоводство. Курсы промышленного плодоводства и огородничества, читанные в разных пунктах России. А.К. Грелль. М., 1891). Яна дае ўяўленне аб тэхналогіі вырошчвання асобных агародных культур на сялянскіх агародах у XIX ст.

Базу нашага даследавання склалі старажытныя пісьмовыя крыніцы (акты, хронікі, інвентары маёнткаў), а таксама ўспаміны падарожнікаў, якія бывалі на беларускіх землях у розныя часы. Аўтарам вывучаліся таксама матэрыялы абласных, занальных і нацыянальнага архіваў краіны, дзе сааналізаваліся звесткі аб занятках агародніцтвам розных сацыяльных слаёў грамадства XIX—XX стст. Шырока выкарыстаны палявыя даследаванні супрацоўнікаў аддзела этналогіі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі і асабістыя запісы аўтара (2000—2008), зробленыя ў розных рэгіёнах Беларусі. Цікавыя звесткі аб агародніцтве аўтар знаходзіла ў фальклорных і літаратурных творах.

Як адзначалася, узнікненне земляробства на тэрыторыі Беларусі гісторыкі адносяць да эпохі неаліту (III тысячагоддзе да н.э.). Пры раскопках паселішчаў ранняга жалезнага веку знойдзены зярняты гароху, вікі, палявых (конскіх) бабоў, а таксама першае старажытнае рала (у в. Капланавічы Клецкага р-на). Цікавыя звесткі пра развіццё агародніцтва ў XVI—XVIII стст. даюць нам старажытныя акты, летапісы, хронікі.

З гэтай кнігі Вы даведаецеся, якія культуры былі распаўсюджаны на агародах у розныя гістарычныя часы, якой тэхналогіяй і якімі прыладамі працы карысталіся, а таксама пазнаёміцеся з народнымі ведамі, звычаямі, традыцыямі і рытуаламі, якія зберагалі нашы прашчуры і дзеды і якія, на іх погляд, павінны былі забяспечваць ураджайнасць палёў і агародаў, ахоўваць іх ад сіл стыхіі. Спадзяёмся, што чытачоў-агароднікаў могуць зацікавіць рацыянальныя прыёмы працы на агародах, якія можна скарыстаць і сёння.

## Глава 1

# РАЗВІЦЦЁ АГАРОДНІЦТВА Ў XVI—XIX стст.

Сельскагаспадарчая навука разглядае агародніцтва як галіну раслінаводства па вырошчванні спажыўных раслін па большай частцы на агароджаных участках зямлі. Спачатку яно служыла для задавальнення хатніх патрэб і рэзка аддзялялася ад паляводства[2]. Адрозніваюць два тыпы агародніцтва: адкрыты (вырошчванне на палях і агародах) і ахоўны (вырошчванне ў цяпліцах, парніках і пад больш простымі ўкрыццямі)[3]. Здаўна агародніну вырошчвалі ў адкрытым грунце, забяспечваючы асноўны збор прадуктаў і насенны матэрыял. Пазней з'явіліся цяпліцы, парнікі, плёначныя ўкрыцці, якія дазвалялі ліквідаваць сезоннасць у забеспячэнні насельніцтва свежай агароднінай.

Адносна паняцця **агарод** да нашага часу не існуе адзінай думкі. Большасць вясковых жыхароў агародам называлі ўчастак зямлі, засаджаны агароднінай[4]. Размяшчаўся агарод побач з домам за гаспадарчымі пабудовамі ці паміж імі, што было зручным для хуткай дастаўкі агародніны да стала. Часта паняцце «агарод» беларусы звязваюць з усёй зямлёй на сядзібе, уключаючы пасадкі бульбы, жыта, ячменю, канюшыны і інш. У асобных гаспадароў агародныя культуры высаджваюць паміж пладовых дрэў, размешчаных шырокімі радамі па ўсёй сядзібе, у другіх — традыцыйна ўздоўж сядзібы садзяць загоны капусты, буракоў, морквы, агуркоў, гарбузоў і іншых культур. Думаецца, што слова «агарод» ужываецца як у вузкім, так і ў шырокім сэнсе.

Назва «агарод» паходзіць, відаць, ад «агароджы» ці «окострожы»[5]. У старажытных дакументах акрамя назвы «агарод» («так же и огород тот, што я, Юрей Савицкий, прикупил тут-же подле того пляцу, подле влотовок»)[6], сустракаецца назва «капусник» — агарод, засаджаны капустай («плоты у капустника моего порубил и шкоды починил...»)[7], і зрэдку — «навоз» («тоть баринь...наехавши кгвалтомъ на властное поле мое, на навозъ...»)[8]. Апошняя назва («навоз») ты-

чылася прысядзібнай дзялянкі зямлі, добра ўгноенай і ўробленай.

Развіццё агародніцтва ў многім звязана з узроўнем развіцця вытворчых сіл грамадства, сістэмай землеўладання і землекарыстання, прыродна-кліматычнымі ўмовамі, удасканаленнем прылад працы, тэхналогіяй вырошчвання розных культур і іншымі фактарамі. Сельская гаспадарка ВКЛ была сацыяльна-эканамічнай асновай феадальнага грамадства, дзе землі, як асноўны сродак вытворчасці, вызначалі стан эканомікі ў дзяржаве. Самую вялікую частку яго жыхароў складалі сяляне.

Агародніцтвам, як і земляробствам у цэлым, займаліся не толькі сяляне, але і мяшчане, і слугі-агароднікі ў панскіх фальварках. У залежнасці ад прыналежнасці зямлі, якой карысталіся, сяляне падзяляліся на дзяржаўных (велікакняжацкія, гаспадарскія), баярскіх (шляхецкія) і царкоўных (духоўныя)[9]. Ворны зямельны надзел, памеры якога вызначаліся Статутамі ВКЛ для розных катэгорый сялянства, быў асновай натуральнай сялянскай гаспадаркі. Сяляне мелі спадчыннае права валодання надзелам. За карыстанне надзелам яны павінны былі плаціць грашовую рэнту, выконваць адработачныя павіннасці (паншчына), а таксама дзяржаўныя павіннасці па будаўніцтву і рамонту дарог, мастоў, перавозцы грузаў і інш. Па меры запрыгоньвання сялянства раслі і іх павіннасці. Калі ў пачатку XVI ст. яны працавалі на пана адзін дзень у тыдзень, то ў сярэдзіне стагоддзя — ужо два дні[10]. Інтэнсіўны працэс запрыгоньвання сялянства, замацаваны нормамі прыгоннага права, аформленнага ў Статутах ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг., знайшоў адлюстраванне ў абмежаванні яго правоў: адмена права пераходу селяніна ад аднаго пана да другога, права распараджэння нерухомай маёмасцю і інш.

Аграрныя пераўтварэнні другой паловы XVI ст., якія атрымалі назву «валочнай памеры», прадугледжвалі поўны ўлік і больш рацыянальнае размеркаванне зямлі, уніфікацыю існаваўшых сялянскіх павіннасцяў (замена даніны і чыншу паншчынай і г. д.), а таксама замацаванне права ўласнасці на зямлю за феадаламі.

У ВКЛ мелася асобая група сялян, якія пасяляліся на невялікіх участках зямлі і выконвалі ўстаноўленыя павін-

насці. Яны называліся «агароднікамі». Колькасць іх была невялікай. Так, у в. Лунінец у 1588 г. у маёнтку памешчыцы Барбары Кунцэвічаўны працавала 9 агароднікаў са сваімі сем'ямі, у якіх, як правіла, было па некалькі сыноў[11]. У памешчыцы Гарнастаевай у маёнтку Балаткова Брэсцкага павета было 8 агароднікаў, павіннасцю якіх быў адзін дзень працы ў тыдзень на пана, выкананне ў год 6 талок і выплата чыншу 6 грошаў літоўскіх[12]. У Паўла Каханоўскага — памешчыка в. Дзяргло Берасцейскага павета — працаваў 1 агароднік з сям'ёй, які меў асабістага вала[13].

Паводле «Уставы на валокі» 1557 г., агароднікі атрымалі надзелы зямлі па 3 моргі (1 морг = 0,71 га) і сяліліся вёскамі па 10—20 двароў паблізу фальваркаў[14]. Валочная памера 1557 г. увяла падворнае землекарыстанне ў заходняй і цэнтральнай Беларусі. За атрыманы надзел сяляне павінны былі адпрацоўваць у велікакняжацкіх і памешчыцкіх маёнтках 1 дзень у тыдзень без каня, а іх жонкі — 6 дзён за лета. Падчас правядзення валочнай памеры (канец 30-ых гг. XVI ст. — сярэдзіна XVII ст.) у катэгорыю агароднікаў пераводзілі і чэлядзь[15]. Аб надзяленні зямлёй чэлядзі сведчыць «Ліст» Жыгімонта Аўгуста ад 8 лютага 1562 г. аб дараванні пушкару Мсціслаўскага замка Логвіну Грыдкавічу «дворышча» з агародамі ў г. Мсціслаўі. Яму далі агарод былога пушкара Кузьмы Гапановіча за пэўную плату «черезъ ревизоров наших, з мръкговъ местъскихъ уставьленого...»[16]. У XVIII — першай палове XIX ст. «агароднікамі» зваліся ўжо жыхары вёсак і мястэчак, якія мелі толькі хату і агарод.

Устава вымушала, каб участкі мелі форму прамавугольніка, а кожная валока мусіла наразацца трыма роўнымі кавалкамі з размяшчэннем на сярэднім з іх сядзібы з агародам. Сядзіба мела наступны план: на адным баку размяшчалася хата, на другім — гумны, хлявы, свірны і інш. Хаця ўрад імкнуўся, каб адна сям'я брала цэлую валоку[17], на практыцы яе часта апрацоўвалі 2—3 сям'і блізкіх сваякоў ці суседзяў, каб лягчэй было заплаціць за яе чынш. У год вясковыя жыхары плацілі 106 грошаў з «добрай» валокі, 97 — з сярэдняй і 83 — з «подлай» валокі; гараджане адпаведна: 50, 40 і 30 грошаў[18]. Ва ўсходніх раёнах Беларусі памера пачалася толькі ў канцы XVI і завяршылася к сярэдзіне

XVII ст. На кожную фальварачную валоку тут мусіла быць 7 сялянскіх[19].

Сяляне-агароднікі дзяліліся на гарадскіх, панскіх і казённых. Акрамя прызначаных штогадовых плацяжоў у выпадку пагрозы вайны яны павінны былі дадаткова ўносіць падатак: «а тые огородники, которые ку огородом земли мают, по грошей три литовских» (1557 г.)[20]. Немалыя агароды мелі і мяшчане, якія дадаткова плацілі за іх: «хто при домех огород мети будет, тот особно з огорода дати мает» (1577 г.)[21]. Надзелы мяшчан г. Нясвіжа Мінскага павета, напрыклад, у 1592 г. складаліся з валокі палявой зямлі і пляцу сядзібнай (прутоў 8—12). З кожнай валокі плацілі па 40 грошаў, з сядзібных прутоў — па асмаку, з вулічных — па 5 пенязяў з кожнага. У павіннасць уваходзіла і адбыванне 3 талок[22]. Як сведчаць актавыя дакументы, памеры сядзібнай зямлі складалі ад 1/3 да валокі зямлі (1597 г.). З 77 агародаў, якія мелі жыхары Косава, плата складала па 30 грошаў з валокі[23].

У структуры плацяжоў у пачатку XVI ст. пераважалі грашовыя. У 30—40-ыя гг. XVI ст. адбыліся істотныя змены ў аграрных адносінах: попыт на сельскагаспадарчую прадукцыю на Захадзе выклікаў стварэнне фальваркаў, якія былі арыентаваны на вытворчасць прадукцыі на продаж. Землеўладальнікі пачалі ўводзіць сваю сельскагаспадарчую вытворчасць і пераводзіць сялян з аброку на паншчыну, што садзейнічала іх запрыгоньванню і абеззямельванню. Напрыклад, у маёнтку Радашковічы Менскага павета ў 1549 г. жылі 31 агароднік (малазямельныя) і 14 «убогіх» сялян, якія не вялі асабістай гаспадаркі[24].

Памеры павіннасцяў агароднікаў залежалі ад памераў надзелаў, ад якасці глебы і былі неаднолькавымі ў розных мясцовасцях. Так, на Пінскім Палессі агароднікі Сялецкія павінны былі з'яўляцца 2 дні ў тыдзень на пешую службу «з чым прыкажуць», а жанчыны — адпрацаваць 12 талок летам на прапалцы памешчыцкіх агародаў і ўборцы ўраджаю хлеба. Агароднікі Сціцічэўскія пешую службу неслі 3 дні ў тыдзень, а жанчыны адбывалі таксама 12 талок. Кнубоўскія агароднікі, надзел якіх пад сядзібай і агародам складаў 13 ці 19 прутоў, адбывалі толькі 10 талок[25]. Сяляне-агароднікі, якія належалі зямянцы Соф'і Хлудзінскай, гаспа-

дыні маёнтка Мрочкаў, у тыдзень адбывалі 4 дні талакі «за своим хлебомъ, а толоку два дни за панским хлебомъ от мала и до велика»[26]. Агароднікі фальварка Марачэўскага акрамя 2 талок павінны былі плаціць у год 15 грошаў[27].

Сяляне мусілі выконваць усе павіннасці, якія ўстанаўліваліся ўладай, таму што вінаватыя плацілі штраф ці караліся фізічна. Ва Уставе на валокі 1557 г. запісана: «и который человекъ не выйдет на работу, ино за первый день огурного заплатит грошъ, а за другій день барана; а коли и въ третий разъ огурится, або за пянствомъ не выйдет, ино бичемъ на лавце скарати, а дни повинные велети заробати...а не откупатися отъ работы никому»[28].

У каралеўскіх (казённых) сялян памеры надзелаў таксама былі рознымі, а павіннасці назначаліся старастамі, дзяржаўцамі ці адміністратарамі маёнткаў. Некаторыя вёскі карысталіся асобнымі прывілеямі і мелі асобныя абавязкі. Так, у ахоўным каралеўскім лісце Сеннікскім сялянам (1670 г.) яны былі наступнымі: з кожнай валокі штогод на дзяржаўную працу трэба было даваць па 8 рабочых дзён у год, плаціць у казну чыншу па 8 злотых і 9 грошаў і шмат якіх іншых плацяжоў[29]. Валокі былі цяглыя і чыншавыя. Прывілеяваныя сяляне в. Сцяпанавічы (1671 г.) замест павіннасцяў з кожнай цяглай валокі плацілі па 7 злотых 15 грошаў, з чыншавых валок — па 8 злотых 6 грошаў і 4 пенязі, а таксама неслі даніну: куры, гусі, зерне і інш.[30].

Аднак не ўсе вёскі мелі прывілеі. Большасць казённых сялян акрамя аплаты чыншу адбывалі і натуральныя павіннасці (12 рабочых дзён у год, 3 талакі, вазілі ў Брэст жыта, давалі адну падводу на 20 міль і гадавога вартаўніка ў тулупе, ботах, з тапаром і мяшком). У адрозненне ад памешчыцкіх сялян казённыя ў выпадку крыўд маглі звяртацца ў суд[31].

Сялянскія палі і агароды, дзе нястомна працавалі члены сям'і, а таксама іх хаты і гаспадарчыя пабудовы, як сведчаць дакументы, даволі часта падвяргаліся спусташэнням, якія ўчынялі жаўнеры, расійскія войскі, або ў час звычайных разборак паны-суседзі. Нездарма народная прыказка сцвярджала: «Паны дзяруцца, а ў мужыкоў чубы трашчаць». Так, у в. Якавічы, напрыклад, у 1693 г. жаўнеры падканцлера ВКЛ князя Радзівіла «въ поле потравили жатву, позаби-

2. Зак. 2839.

рали въ снопахъ, разорили огороды...», захапілі розныя сялянскія пажыткі на суму 1 тыс. злотых[32]. Межы сялянскіх земляў часта былі не пазначаны, а таму парушаліся памешчыкамі, з якімі сялянам цяжка было справіцца.

Становішча сялян было нялёгкім, яны цярпелі крыўды ад памешчыцкага самаўпраўства. Гаспадары маглі іх прадаць або закласці разам з зямлёй, захапіць і завезці куды-небудзь у іншае месца. Рабавалі сялян і чужыя паны са слугамі, рабілі патраву іх палёў і агародаў, ламалі і палілі агароджу. Так, у 1559 г. у скарзе пана Мялешкава зазначалася, што слугі суседа крыўдзілі яго сялян: у аднаго «...пожали и оселицу его плотъ, изгороду розметали и пожгли...», у другога — пааралі і паламалі плот, выаралі дарогі, у трэцяга — парубілі плот[33].

Прыгонныя сяляне былі бяспраўнымі, іх маглі закладваць разам з маёнткамі. Аб закладзе («заставе») агароднікаў сведчыць дакумент 1558 г., згодна з якім зямянін Марцін Бязвусы, які меў доўг перад бацькам і не мог яго аддаць, аддаў у «заставу» свой маёнтак Радзівілаўскі з «...тые люди з детьми ихъ з статки, зъ огороды...»[34]. Таму ўжо ў XVI—XVII стст. здаралася, што сяляне разам з сем'ямі збягалі ад аднаго памешчыка да другога або ў Запарожскую Сеч, у іншыя месцы. У актавых запісах гэтага часу сустракаюцца скаргі памешчыкаў на тое, што беглыя прыхапілі з сабой усё, што можна было ўзяць: скаціну, рэчы, адзенне і інш.

На Палессі яшчэ да валочнай памеры зямля, у тым ліку і агародная, была ва ўладанні так званых дворышч, якія былі сямейна-радавымі саўладальнікамі і вызначаліся кааперацыяй працы. Дворышчы мелі невялікія кавалкі зямлі ад 15 прутоў да 1 ці 1 $^1/_2$ морга. У сярэднім іх надзелы ўключалі ад паўвалокі да 1 $^1/_2$ валокі, якія складаліся з 20—25 асобных кавалкаў зямлі, раскіданых па розных урочышчах[35]. У залежнасці ад якасці глебы яе размяркоўвалі пад ворыва, сенакос, агарод (пад агарод выбіралі лепшую, больш урадлівую сухую балоцістую глебу). Такая сістэма захавалася і пасля валочнай памеры, якая поўнасцю была праведзена толькі ў паўночнай частцы.

Цэнтрам дворышча была сядзіба, яна складалася з жылых і гаспадарчых пабудоў і пэўнай колькасці зямлі пад

агароды, сады і пчэльнік, якая была паблізу сядзібы[36]. Дворышча было і адзінкай падаткаабкладання.

У іншых месцах адзінкай абкладання служылі дымы (сям'я, сялянскі дом, хата, гаспадарка) і службы. Дым уключаў, як правіла, адну сялянскую сям'ю ў сярэднім з 2—4 сынамі, братанічамі, прымакамі і г. д. Дымы аб'ядноўваліся ў службы, якія ўключалі, як сведчаць актавыя дакументы, ад 2—3 да 8 і болей дымаў. У іх часцей уваходзілі сваяцкія ці суседскія сем'і. Напрыклад, у маёнтку Вітаўляны Мінскага павета (1590 г.) служба Вазоўская складалася з сямі дымаў: «Марка Жыдовіч маетъ сыновъ чотыри, Антип, Есько, Андрей, Гордей; другій дым Юшко Жолнеровичъ, мает сынов три, Берунъ, Тимошъ и Окуло; третий дымъ Бурко Возвичъ, маетъ сыновъ два, Панкратъ и Матвей; четвертый дым Полуянъ Голубковичъ, маетъ сыновъ два, Онишко и Федоръ; пятый Мокота; шостый дымъ Прокопъ Строкъ, сыны три Климъ, Сенюкъ, Филонъ; семый дымъ Микита Строковичъ»[37].

Сяляне, паводле старажытных актаў, мелі палову ці валоку зямлі (бедныя — меней чым паўвалокі), якую аралі з дапамогай 1—2 валоў, некаторыя — яшчэ і 1—2 коней[38]. У гаспадарцы звычайна меліся 1—2 сахі, якія ў той час каштавалі даволі дорага, а таму нярэдка станавіліся здабычай злодзеяў ці «шкоднікаў». У ролі апошніх выступалі нядобразычліўцы з ліку сваякоў, суседзяў ці чужынцаў, якія маглі парубіць саху, паламаць[39] і нанесці такім чынам вялікую шкоду сям'і.

Становішча сялян у XVII—XVIII стст. пагоршылася. Феадалы дзеля большай даходнасці сваіх маёнткаў павялічылі паншчыну, асабліва адработачныя павіннасці. У другой палове XVIII ст. у сярэднім сяляне мелі паўвалокі ворнай і сенакоснай зямлі ці дзевяць з паловай дзесяцін[40]. Зямля пад агароды складала прыкладна каля 0,5 дзесяціны і меней. На кожны сялянскі дым, які з'яўляўся адзінкай адпраўлення павіннасцяў, у сярэднім прыпадала па 36 гвалтаў. А кошт работ і пабораў складаў 18 руб. 9 кап., што ў перакладзе на рабочыя дні складала 362 дні[41]. Гэта азначала, што амаль цэлы год адзін дарослы чалавек з сям'і павінен быў працаваць на пана. Жанчыны-сялянкі акрамя гвалтаў і паншчыны павінны былі выконваць усе работы на панскім агародзе:

рыхтаваць грады, садзіць і паліваць капусту і іншыя культуры, палоць, а восенню збіраць усю агародніну. Праца на панскім агародзе не рэгламентавалася: працаваць трэба было столькі, колькі спатрэбіцца. За кожную правіннасць атрымлівалі цялесныя пакаранні (удары вяроўкамі, розгамі, саджэнне на цэп і г. д.)[42].

Іншым было становішча баяр. Баяры да Гарадзейскага сейма 1413 г. былі вышэйшым ваенным і грамадзянскім саслоўем, якому ў ВКЛ давалі зямлю за заслугі «на праве земской военной службы», на якую яны павінны былі «ставіць каня» ці некалькі коней, у залежнасці ад колькасці зямлі. У сярэднім баяры трымалі па 5 валок зямлі, якую яны маглі прадаваць, мяняць, дарыць, закладваць. Так, у 1503 г., згодна з даравальнай граматай пінскага князя Фёдара Яраславіча, Савасцяну Валадзьку былі аддадзены 3 валокі і 12 моргаў зямлі «...з огороды овощовыми» і іншымі ўгоддзямі, за якія нашчадкі «...маюць служити конемъ на войну, яко и иные бояре нашы Пинские»[43].

«Устава на волоки» 1557 г. пагоршыла становішча баяр. Задуманая гэтым дакументам ліквідацыя цераспалосіцы вымагала каралеўскіх камісараў, надзеленых велізарнымі паўнамоцтвамі і ўладай, адсякаць ад земляў баяр столькі, колькі яны хацелі. Меркавалася, што ўзамен іх уладальнікі атрымаюць такую ж колькасць зямлі («отмену») у іншых месцах. Як сведчыць аналіз судовых спраў і іншых дакументаў, часцяком «адмены» яны так і не атрымоўвалі[44].

Сярод баяр былі і заможныя. Так, баяры Грушы пана Кашэраўскага (маёнтак Косава Слонімскага павета, 1597 г.), напрыклад, мелі 15 валок і 5 моргаў; баяры Грыдкі — 5 валок 20 моргаў; Зыбайлы і Запечкі — па 6 валок і 3 моргі[45]. Павіннасцю баяр гэтага маёнтка быў толькі развоз лістоў. Частка баяр не мела асабістай зямлі, сядзела ў якасці чыншавікоў на каралеўскіх ці памешчыцкіх землях і павінна была «с той земли службу служити»[46]. Паншчыну яны не адбывалі, а толькі 12 гвалтаў. За зямлю яны плацілі 30—40 злотых чыншу, а таксама даніну (курамі, мёдам, яйкамі, льном, ляснымі прадуктамі і інш.), выконвалі работы па рамонту мастоў, дарог, ветракоў, развозілі верхам лісты, пастаўлялі падводы[47]. У розных губернях і паветах плата была рознай, а павіннасці то скарачаліся, то павялічваліся. Пэў-

ныя павіннасці на карысць караля неслі і татары, якія жылі ў якасці вотчыннікаў на яго землях. Асобныя з іх мелі і «купленину» (зямлю), якой маглі распараджацца паводле свайго меркавання[48]. Многія татары мелі толькі сядзібную зямлю і займаліся агародніцтвам. Яны ўмелі добра яе апрацоўваць, і ў феадальны час «...произведения татарского огорода славятся как самые лучшие»[49].

Уладальнікамі вялікіх зямельных надзелаў былі магнаты і зямяне, якім давалі ў пажыццёвае карыстанне па некалькі валок зямлі ў розных месцах.

Паводле пацвярджальнага прывілею Яна Казіміра Гушчанскай і Тучнянскай шляхце, яна атрымлівала землі ў пажыццёвае валоданне за ваенныя заслугі, але павінна была з чатырох валок зямлі даваць каня і ўзброенага пахолка (селяніна) або плаціць штогадова чыншу ў памеры 1 капы і 6 грошаў літоўскіх з валокі[50]. Шляхціц Абрагімовіч атрымаў па прывілею Аўгуста III (1744 г.) 8 з паловай валок у в. Шыпавіцы, Цехнер — 5 валок (1763 г.); гатаўскі стараста Быстры ў 1760 г. — 12 валок і 3 вёскі з сялянамі (Пешкі, Міхалкі і Боркі)[51].

Паводле інвентара маёнтка Косава Слонімскага павета, які быў падзелены (1597 г.) паміж князямі Рыгорам Сангушкам і Мікалаем Кішкам, «огороду овощового, при дворе лежачого...пляцу дворного зъ огородомъ овощовымъ и зъ городищомъ вымьроно моркгов два, прутов шесть...»[52].

Доля агароднай зямлі была адносна невялікай. Звычайна ёй займалі некалькі моргаў ці прутоў. Так, у (1594 г.) маёнтку Беліца Мінскага ваяводства, як сведчыць дакумент, «...а погною зъ огородами всими коло двора моркговъ десетъ, прутов 15...»[53]. Велічыня агарода ў маёнтку в. Лазнікі Віленскага павета пана Лазніцкага разам з селішчам двара і гумна складала 4 моргі[54].

Шляхта, якая не магла апрацаваць зямлю, аддавала частку яе арандатарам ці пакідала пад пар або зараслі. Прадаць сялянам зямлю яна не мела права. Такая практыка землекарыстання ў XVIII ст. хутка прыводзіла многіх да збяднення.

Пытанне аб памерах агародаў у розных слаёў насельніцтва ў старажытны перыяд з'яўляецца вельмі цікавым. Крыніцы не заўсёды даюць яснае ўяўленне аб гэтым. Да таго ж пад назвай «агарод» часта мяркуецца палявая зямля. Часам

актавыя дакументы змяшчаюць удакладненне: «агарод ярынны» ці «агород «овощовы». Агародам «ярынным» у XVI ст. называлася частка сядзібнай зямлі, на якой сеялі збожжавыя. Уласна агарод выдзяляўся як «овощовы з навозы дворными»[55]. На такім агародзе часта раслі і пладовыя дрэвы.

На думку гісторыкаў, у XII—XIV стст. феадальныя замкі на Беларусі мелі ад 0,1 да 0,5 га ворнай зямлі[56]. Праўда, невядома, колькі яе ў той час адводзілася пад агароды.

У старажытных актах сустракаюцца звесткі пра продаж маёнткаў, дамоў з гаспадарчымі пабудовамі ў горадзе разам з агародамі. Гэта дае падставу меркаваць аб велічыні і кошту агародаў. Так, згодна з купчай ад 16 лютага 1645 г., шляхціц Петрашкевіч прадаў зямяніну Глушаніну за 1500 грошаў літоўскіх палову маёнтка Ляшчылавічы з сялянамі і зямлёй: «з грунтами пашными и непашными, з огороды овощовыми»[57]. Часам асобна прадавалася толькі агародная зямля. Напрыклад, магілёўскі мешчанін Аляксей Андросавіч прадаў 2 агароды Клішку Выголку, якія размяшчаліся ў Магілёве паміж агародамі баярына Лазара Андрэевіча і Аннушы Цыбораўскай за 100 грошаў літоўскіх[58].

Як сведчыць аналіз дакументаў, даражэй цаніліся агароды бліжэй да горада і яго цэнтра. Кошт іх залежыў ад велічыні (колькасці моргаў, прутоў), якасці і, вядома, ад колькасці пабудоў і іх стану. Так, магілёўскі мешчанін Трэпала ў 1577 г. прадаў свой дом «з огородом и зо всемъ будованемъ» за Дняпром за 2 капы 30 грошаў[59]. Дом з пабудовамі (сенцы, лазня, клець, стаўня) на вуліцы Шклоўскай у Магілёве «и горожу всю и з вороты и з пляцом, пляцу прутов піат без чверти...»[60] у 1577 г. быў ацэнены ў 12 коп грошаў[61].

Валоку зямлі ў гэты час за ракой Дубравенкай у прадмесці Магілёва можна было набыць за 2 капы 30 грошаў[62]. У самім Магілёве амаль столькі ж (2 капы) каштаваў 1 морг зямлі[63], а ў канцы Слабады (прадмесце Магілёва) 2 капы каштаваў дом з 5 прутамі зямлі[64]. У самім горадзе мяшчанскія агароды, у якія ўваходзілі і палявыя землі, па нашых падліках, у сярэднім налічвалі ад 0,5 да 8 моргаў[65], ці, у пераводзе на сучасныя меры, ад 35 сотак да 5,6 га.

Трэба дадаць, што асобныя мяшчане акрамя агародаў пры доме мелі агароды на ўскрайку горада, аб чым сведчаць купчыя аб продажы ўчасткаў за яго межамі. Гэта традыцыя

працягнецца і надалей. І ў XIX ст., як адзначаў А.С. Дэмбавецкі, амаль у кожнага магілёўскага мешчаніна быў невялічкі агарод пры двары, а другі агарод — на ўскрайку горада[66].

У XVI ст. жыхары мястэчак, гарадоў плацілі падаткі («плат волочный») з зямлі, у тым ліку з «агародных прутоў». У 1566 г. жыхары мястэчка Пяшчаткі заплацілі ўсяго 4507 $^{3}/_{4}$ грошаў, дзе «агародныя» склалі амаль палову — 2213 грошаў[67]. Мяшчанам трэба было плаціць па 10 грошаў чыншу з кожнага агарода і адслужыць летам па 4 талокі з агарода[68]. Мяшчане Оршы (1594 г.) плацілі па 5 грошаў з кожнага агароднага морга[69].

Агароды трымалі таксама цэрквы і манастыры. Фундушавыя запісы, якіх шмат ў актах, утрымліваюць звесткі пра 1—2, радзей болей валок зямлі, якія адпісваліся якім-небудзь прадстаўніком прывілеяванага саслоўя царкве, касцёлу ці манастыру. Прычым нярэдка ў гэтых запісах падкрэслівалася, што «агарод і сенажаць» — гэта даходныя артыкулы. Так, Пётр Азямблоўскі з Брэсцкага ваяводства ў 1718 г. адпісваў мясцовай царкве Прасвятой Багародзіцы 4 валокі зямлі «со всеми их доходными статьями» — агародамі і сенажацямі[70]. Кашталян віленскі Служка падарыў царкве ў Радванічах 2 валокі зямлі з «сенокосами и огородами»[71]. Паводле фундушавага запісу 1750 г., мінскі кашталян Русецкі ахвяраваў Касцяневіцкай царкве 2 валокі зямлі, з якіх палова была прызначана дзячку на агарод, а астатняе — свяшчэнніку, агарод якога быў насупраць царквы[72].

Вядомы магнат Іван Храптовіч у 1585 г. падараваў Прачысцінскай царкве Св. Багародзіцы ў маёнтку Ліпскі да дзвюх валок, якія яна атрымала ад яго бабкі, яшчэ 3 валокі «зо всими кгрунтами оремыми и неоремыми, зъ огороды овощовыми, зъ сады, зъ погноями, зъ навозами, зъ гаи и сеножатьми...»[73].

Пры раздзеле маёнткаў раздзелу падлягалі і землі свяшчэннікаў, якія ляжалі на гэтай зямлі. У дакуменце суда аб падзеле маёнтка Бераставіцы паміж ваяводам Андрэем Ляшчынскім, князямі Янушам Заслаўскім і Фёдарам Масальскім упамінаюцца «огороды и погнои поповские и подъ огородникамъ церковнымъ кгрунту морговъ пятнадцать...»[74].

У 1431 г. падскарбі літоўскі Аляксей Кмыта пачаў будаўніцтва царквы Св. Тройцы, а свяшчэнніку «на выживленье»

(пракармленне) даў зямлі 6 моргаў пад агарод і пад пабудову дома каля ракі Мухавец[75]. У 1609 г. фундушавы запіс дазваляў святару Бенядзікту ў в.Карошчынскай мець «з огородом при доме и на пашню волоку земли»[76].

Як бачна з прывілею Сігізмунда III на царкву Св. Мікалая ў в. Полайцы, якая валодала дзвюма валокамі зямлі, «застинками и огородами, до ней надлежачими...», святар Парфіновіч мог карыстацца ёй «до живота своего» і нічога не павінен быў плаціць «на ўрад Берасцейскі». Трэба было, як гаворыцца ў дакуменце, «тольку службу Божую въ оной церкви служити и за насъ господаря пана Бога просити...»[77].

Такім чынам, святары, у адрозненне ад мяшчан, ад падаткаў за зямлю вызваляліся. Так, у 1579 г. у вечнае валоданне атрымаў 10 валок зямлі ў в. Благавічы (непадалёку ад Чавус) святар мясцовай царквы Сямён Шырма. Акрамя таго, яму быў дадзены засценак пры дарозе ў Чавусы памерам у 33 моргі, на якім размяшчалася царква Св. Мікалая і дом святара, «построенный с дозволения Могилевского старосты»[78]. Дадаткова ён атрымаў дазвол на пабудову мельніцы і карчмы, з якіх павінен быў ужо плаціць падаткі, а «з оных десяти уволок и застенков, на замок Могилевски, платити ничого не повинен»[79].

У другой палове XVIII ст. існавалі два пункты гледжання на памер зямлі пад агароды. Так, Казімір Радзівіл і Францыск Сапега ў 1760 г. нават выдалі інструкцыю, у якой рэкамендавалася абмежаваць плошчу пад агароды на карысць таварных культур, а ўраджайнасць агароднiны павышаць за кошт паляпшэння апрацоўкі агародаў. Антон Радзівіл у 1792—1798 гг., наадварот, прапанаваў іх пашырыць і зрабіць таварнымі[80].

Вядома, што ў цэнтральнай і заходняй Беларусі 16 магнацкіх сем'яў валодалі 30 % усіх земель гэтага рэгіёна[81]. Увогуле пашырылася дваранскае землекарыстанне, якое налічвала амаль палову ўсіх земляў. Развіццё рынку ў сярэдзіне XVIII ст. стымулявала пашырэнне фальваркова-баршчыннай гаспадаркі, дзе агародніцтву стала надавацца бóльшае значэнне. Вядома, што прадукты сельскай гаспадаркі ў гэты час складалі 96 % экспарту. Як адзначаў П. Казлоўскі, у структуры экспартнай прадукцыі 83,5 % прыпадала на прадукты паляводства, 13,1 % — жывёлагадоўлі, 1,8 % — пча-

лярства і толькі 1,5 % — агародніцтва і садаводства, а таму выручка ад продажу яе складала 0,6 %[82]. Гэта азначае, што прадукцыя агародніцтва ў экспарце займала другаступенныя пазіцыі. Асноўная частка вырашчанай агародніны ішла на асабістыя патрэбы сямей і ўнутраны рынак.

У XIX ст. большасць сялян па-ранейшаму атрымлівалі зямлю ў карыстанне за баршчыну ці аброк. Памешчыкі, магнаты, буйныя землеўладальнікі асабіста распараджаліся і перыядычна ўстанаўлівалі ўраўняльна-душавыя перадзелы зямлі паміж сялянамі. Так, у Лідскім павеце надзел зямлі на душу складаў 4,4 дзесяціны, у Гродзенскім — 3,7, у Ваўкавыскім — 3,7, у Брэсцкім — 3,3 дзесяціны[83].

Віленская агульная камісія прапанавала, каб 1/30 частка пазямельнага ўчастка, якім карыстаўся селянін, лічылася сядзібнай, але яна не магла быць аддзелена ад палявога ўчастка. Селянін, атрымаўшы ўчастак, мог адгароджваць сабе агарод дзе хацеў і колькі хацеў[84]. Гэтая пастанова ўвайшла ў палажэнне 19 лютага 1861 г.

У XIX ст., згодна з інвентарамі, сялянскія надзелы па большай частцы былі ў паўвалокі, ці каля 9 з паловай дзесяцін на сямейства[85]. У Мінскай губерні ў 1877 г. на сялянскі двор прыпадала ў сярэднім па 17,2 дзесяціны. Да 1905 г. становішча прыкметна змянілася ў горшы бок і сярэдні надзел на двор па губерні скараціўся да 9,1 дзесяціны[86]. Гэтай зямлёй карысталіся вялікія сем'і, трэцяя частка якіх у вёсцы на канец XIX ст. была нераздзеленай і шматдзетнай (у сярэднім 8—10 дзяцей)[87]. Такімі вялікімі сямейнымі калектывамі апрацоўвалі сваю зямлю. З часам сыны выраслі, драбілася сям'я, драбіліся і надзелы, межавалася зямля.

Памеры сядзібы, па дадзеным М. Улашчыка, разам з садам і агародам, залежалі ад памераў участка і былі адносна вялікімі. Самы багаты селянін в. Віцькаўшчына Мінскай губерні, напрыклад, меў да двух гектараў, а самы бедны — каля паловы гектара прысядзібнай зямлі[88]. На ёй размяшчаліся жылыя і гаспадарчыя пабудовы, адзін або два вялікія двары, агарод, сад і невялікі лужок («аселіца»). Агароды займалі ад 1/4 да 1/2 усёй сядзібы і давалі значную частку прадуктаў выключна для спажывання ў сям'і[8]. Прыкладна такую ж плошчу пад агароды скарыстоўвалі сяляне іншых губерняў[90].

У канцы XIX ст. колькасць зямлі, якой карысталася сялянства, памешчыкі і засцянковая шляхта, была рознай. Так, у заможнай в. Віцькаўшчына Мінскай губерні ў паноў было па 200 дзесяцін зямлі і балот, засцянковая шляхта мела ўчасткі па 40—60 дзесяцін, часам большыя або меншыя, праваслаўныя хутаранцы — па 30—60, а бывала, і па 80—100 дзесяцін зямлі, былыя прыгонныя — ад 3—5 да 20 дзесяцін[91].

На сядзібах ваколічнай шляхты Магілёўшчыны ў сярэдзіне XIX ст. размяшчаліся дамы, да якіх прылягалі агароды з агароджай, якая аддзяляла як ад суседняй сядзібы, так і ад патравы хатняй скаціны. «Такая раздзельность частоколами и заборами каждой усадьбы и скрытие домов за заборами дает каждому хозяйству вид особняка, замкнутого, как будто каждый шляхтич живет отдельно от остального населения околицы, скрываясь за забором в свою хату, как улитка в свою раковину»[92].

Асобныя шляхецкія хутары (з 1—4 дварамі) мелі моцныя платы, прамыя добра ўробленыя агароды з садзікам і амаль заўсёды з пчэльнікам[93]. У Магілёўскай губерні сустракаліся гаспадары са 100 і болей дзесяцінамі зямлі. Частка шляхты мела невялікія і сярэднія надзелы, асобныя арандавалі зямлю па 20 рублёў за валоку ў 20 дзесяцін ці па 1 рублю за дзесяціну «на круг добрай і няўдобнай зямлі»[94].

Арандатарам жылося нялёгка: як толькі ён расчысціць і ўробіць участак зямлі, пан павышае яму арэндную плату ці зганяе на новы, неачышчаны[95]. Агарод меў вялікае значэнне з пункту гледжання забеспячэння прадукцыяй не толькі для селяніна, але і для гарадскіх служачых. Кожны з іх, хто паступаў на службу ў казённую палату, губернскае праўленне, земскі суд і г. д., меў, як правіла, сядзібу з агародам пад горадам ці ўвогуле жыў у ваколіцы за 5—6 вёрст ад яго[96]. Гэта дазваляла весці асабістую гаспадарку ў вольны ад працы час.

Прыродныя ўмовы ў часе былі рознымі, і сяляне, якія атрымалі аднолькавую колькасць зямлі, былі неаднолькава заможнымі. Пра ўраджайную зямлю для агародаў, дзе ўрадлівы слой — дванаццаць цаляў[97], пісаў Я. Колас у паэме «Новая зямля»:

Там, брат, гароды — чуеш, маці?
(Ён гэтым жонку падкупляе)
Так ураджайны, так багаты,
І блізка, тут жа каля хаты!
Сама зямля без гною тлуста,
І надта родзіцца капуста:
З вядро галоўкі вырастаюць,
З трох коп кадушку накладаюць!
А мак! а рэпа! морква, бручка!
А буракі, гуркі, пятрушка —
Ўсяго, ўсяго, ну проста — страх!
І ўсё там расце, як на дражжах.

Незайздросным было становішча сялян да адмены прыгону. У XIX ст. кожная сялянская сям'я ў тыдзень павінна была адпрацаваць 6 дзён паншчыны (3 мужчынскіх і 3 жаночых). Да гэтага трэба дадаць, што ў летні час колькасць іх павялічвалася за кошт гвалтаў. Павіннасцю сялян былі пасеў, праполка, а таксама збор ураджаю агародніны ў фальварку.

На паншчыну ішлі працаваць з усходам сонца «з чым прыкажуць», а заканчвалі з заходам. Баршчына складала 312 дзён у год. А калі пан клікаў на звышурочныя («гвалты»), часам па 2 чалавекі з сям'і, ці адбываць «старожу», селянін таксама не меў права адмовіцца. «Старожа» цягнулася 3 дні, калі клікалі да памешчыка «для помогания працом людзи дворовых»[98] ці ахоўваць маёнтак уладара ўначы.

З-за вялікай колькасці працоўных дзён селяніну, які разам з членамі сям'і павінен быў працаваць на панскіх палетках і агародах, не было сіл для працы ў асабістым агародзе і на полі. Па падліках З.Ю. Казлоўскага, з 216 сем'яў Берасцейскага, Віцебскага, Менскага, Аршанскага і Ашмянскага паветаў у другой палове XVIII ст. здольных да паншчыны было 756 чалавек, ці 64,9 % усіх членаў сямей. З іх 411 — дзеці (хлопчыкі і дзяўчынкі ад 12 да 18 гадоў). На адну сям'ю прыпадала 3,5 чалавекі працаздольных (1—2 дарослых і дзеці). Улічваючы, што акрамя працы ў сваёй гаспадарцы трэба было яшчэ адбываць паншчыну, на сваім полі ці агародзе штодня маглі працаваць толькі 1—2 чалавекі[99]. Становіцца зразумелым, якога напружання сіл ад селяніна патрабавала яго штодзённая праца. У такіх умовах не магло быць

эфектыўнага агародніцтва з-за нізкай прадукцыйнасці, прымітыўнасці сельскагаспадарчай тэхнікі і г. д.

Для працы ў памешчыцкіх агародах і на палях выкарыстоўвалі цяглых сялян. Але рабочых рук часта не хапала, і памешчыкі прымянялі наём шляхты, мяшчан, вольных і нават замежных падданых. Удзельная вага наёмнікаў на паўднёвым захадзе і захадзе Беларусі дасягала 27 %. У цэнтры яна была крыху ніжэй, а к усходу зніжалася да 9 %[100].У панскіх маёнтках, гледзячы ад іх велічыні, за ўстаноўленую плату працавалі пастаянныя рабочыя, батракі і батрачкі, ад 30 да 100 чалавек[101]. Яны і жылі побач у збудаваных хатах, мелі асабістыя агароды.

Паводле даследавання А. Лойкі, паншчына ў маёнтках дробнай і сярэдняй шляхты на захадзе і ў цэнтры Беларусі на 21 % перавышала паншчыну ў магнацкіх латыфундыях, а на ўсходзе — на 13 %[102] з-за значнай колькасці надзвычайных работ, якія адрывалі сялян ад працы на сваіх участках.

***Агароджа.*** Атрымаўшы ва ўладанне землі, трэба было вызначыць іх межы, таму што вельмі часта ўзнікалі спрэчкі паміж суседзямі, якія «казили» (псавалі. — *Л.Р.*) памежныя знакі ці пераносілі іх у іншае месца. Так узнікла патрэба ў агароджы.

Традыцыя «очерчивать» (межаваць) зямлю даўняя. Пад пасеў розных культур трэба было мець апрацаваны кавалак зямлі, для чаго нашы продкі расчышчалі і спальвалі лясы, хмызнякі, а сам лес «очерчивали», гэта значыць, у ніжняй частцы кожнага дрэва кругам здзіралі кару і яно ссыхала. Ссохлы лес называлі «чарцяжом», яго выпальвалі, знішчалі пні і ўзворвалі. Атрымліваўся прыдатны для сяўбы кавалак зямлі — «прарабак»[103], якім вельмі даражылі таму, што яго расчыстка была вельмі працаёмкай. Участак памячалі межавымі знакамі.

У XVI ст., як сведчаць актавыя запісы, па вуглах межавай зямлі насыпалі «нарожныя капцы», якія былі і малымі, і вялікімі. Вакол трэба было «копецъ обрубом обвести», гэта значыць, вырубіць невялікую прастору лесу. На версе капца ўмацоўвалі кол («паль»), на які, як правіла, ставілі межавы знак. Капцы насыпаліся на адлегласці «шести мерничьихъ шнуровъ»[104], як гаворыцца ў адным з дакументаў. Нам не-

вядома, колькі гэта было ў сучасных мерах адлегласці. Вядома, што для вымярэння адлегласці бралася вяроўка, якая мела назву «лыко», і тагачасная мера абазначалася, напрыклад, «у одно лыко»[105] («полянка простого поля у одно лыко», 1556 г.)[106]. Межавая лінія вакол зямлі называлася «стеною»[107], а вугал, які ўтвараўся межамі зямлі, — «пета», «пята»[108]. Часта капцы, на якіх ставіліся межавыя знакі ў выглядзе крыжоў («грані», «крыжы»), даволі глыбока — «...коло липы дванадцатый копецъ закопати, (и грани) въ липу врубати...»[109] — зарасталі хмызняком, дрэвамі.

Пастаянна з-за зямлі, яе межаў узнікалі спрэчкі паміж землеўладальнікамі, а часам здараліся гвалтоўныя наезды, самавольныя парушэнні межаў. Такіх судовых спраў нямала разглядалася ў розных месцах. Прывядзём некалькі з іх. У маі 1620 г. памешчык Радзівіловіч, сабраўшы некалькі ўзброеных людзей, напаў на жонку суседа памешчыка Гліндзіча, якая займалася сяўбой у асабістым агародзе, «...съ челядю своею домовою сеяла ярыны огородные а мяновите тоесть бобы и пастернакъ...», пабіў яе, вырубіў некалькі дрэў, знішчыў межавыя знакі і правёў новую памежную рысу. Прычым, як вынікае са скаргі, мяжу правёў «ушыръ на загонъ, а у должъ можетъ быти на трое гоны воловых...». Паспеў нават да новай мяжы паставіць камору і адрыну[110]. У 1559 г. людзі пана Дзевяткоўскага папсавалі межавыя знакі суседа: «два копцы на стене его милости розметалъ, а стену и межу зъ кгрунту выбралъ и иншие копцы оборалъ и две фои зъ гранями вырубалъ и выпалилъ...»[111].

Вельмі часта ў дакументах гаворыцца аб пашкоджанні межаў агародаў, якія абводзіліся агароджай: «его плотъ, изгороду розметали и пожгли...»; «...и изгороду его розметалъ...»; «подле того ячменю изгороду розметано, жердье и колье порубано...»[112]; «...ворота порубалъ, тынъ выломалъ...» (1566 г.)[113]; «...тыны, плоты все забралъ и до своего дома звозилъ...» (1555 г.)[114].

Аналіз актавых дакументаў сведчыць аб тым, што ў XVI ст. найбольш пашыранымі назвамі агароджы былі: паркан, плот, тын, замёт, дылованье (дилеванье). Часцей фігуруюць у дакументах такія сведкі: «паркан»[115], «кругом того двора огороды его милости намжачіе, почавши одъ двора...подле паркану надъ рѣку Полоту...»[116] (1618 г.); «плот около гум-

на и около двора окострожоный и ворота одни покрытые»[117] (1579 г.); «...гумно огорожоно новым заметомъ...»[118] (1591 г.); «тот дворъ заметом огорожен...»[119] (1599 г.); «...плот городживали...»[120] (1539 г.); «плоты поламалъ...»[121] (1540 г.); «...он угородилъ себе плоть берегъ межи от моего поля...»[122] (1540 г.); «...и огород плотомъ огородивши...»[123] (1592 г.); «домъ хоромы, тыны, плоты...»[124] (1555 г.); «тын выломал»[125] (1566 г.). Назва агароджы «плот» упамінаецца найбольш часта[126].

На плот і некаторыя іншыя віды агароджы выкарыстоўвалі жэрдзі, дошкі, колле і галлё: «...форост ольховы на гороженье...»[127] (1557 г.); «колля сосновего возъ»[128], «хворост и колье...»[129] (1557 г.); «подле того ячменю изгороду розметано, жердье и колье порубано...»[130] (1559 г.); «плот зъ хоросту около огорода и съ одного боку саду...»[131]. Каб загарадзіць («загамаваць») агарод, верх колля рабілі вострым: «острене того колля»[132]. Як сведчаць актавыя дакументы, перавозілі колле на вазах, у якія запрагалі валоў ці коней. Так, у маёнтку значыліся: «возъ рабочы лесованный, с колами кованными, другий возъ рабочий на немъ кола просте не ковано»[133].

Замёт рабілі з броўнаў, і ён быў невялікі па працягласці. Замётам, згодна з актавымі запісамі, звычайна агароджвалі двор ці палову двара ад вуліцы, часам ён даходзіў да паловы гумна: «...гумно огорожоно половица новым заметомъ»[134] (1591 г.). У агароджы двара рабіліся дзверы (фортка) у агарод і сад: «...фортка зъ двора до огорода овощового, другая фортка до садку...»[135]. Уяўленне аб тым, колькі трэба было матэрыялу на агароджу, дае дакумент 1679 г., у якім адзначаецца, што бурмістру пана Грабоўскага па 9 асмакаў за воз «купили форосту выготь ведле двора его возъ деветь...» і «...колля возъ...» за 15 асмакаў[136]. У панскіх маёнтках будавалі і дашчатую агароджу, якая называлася «дылеванье» («дилеванье»): «...дылеванье межи столпы зъ двухъ сторонъ ажъ до гумна»[137] (1581 г.); «...дылеванье до половицы двора зъ вротами...»[138] (1589 г.).

Асоба трэба сказаць пра цвікі, з дапамогай якіх мацаваліся дошкі, колле ў плоце ў XVI—XVIII стст. Першапачатковай нашай гіпотэзай было, што цвікоў у той час не існавала, а таму нам заставалася толькі здагадвацца, якім чынам

мацаваліся калкі ці дошкі да жэрдак і стаўбоў. Хутчэй за ўсё, што для гэтай мэты выкарыстоўвалі лазняк, лыка, вяроўкі, пяньку і іншыя падручныя сродкі. На гэту думку наводзілі нагляданні, што нават у 50-ыя гг. ХХ ст. сустракаліся розныя тыпы агароджы з такімі мацаваннямі.

Больш пільна праглядаючы дакументы, мы знайшлі сведчанні даволі шырокага ўжывання ў XVII ст. розных гатункаў цвікоў у будаўніцтве грамадскіх і асабістых пабудоў, а таксама для агароджы. Дакументы 1679—1681 гг. згадваюць аб набыцці: «гвоздя совитого латного кгонтового»[139]; «гвоздя великого на прибияне лать...»[140]; «гвоздя кгонтового до шаленяя...»[141]; «...гвоздя кгонтового на ворота...»[142]; «...гвоздовъ дванадцать, для прибияня шибъ...»[143]. Можна меркаваць, што набыць дастатковую колькасць адпаведных цвікоў для агароджы маглі пераважна заможныя слаі насельніцтва з-за іх даволі высокага кошту. Так, 1 капа «гвоздя совитого» каштавала 24 асмакі[144]; «гвоздя латного» — 10—12 асмакаў[145]; «гвоздя кгонтового» — 6 асмакаў[146]. «Цвечкі» ці «чвечкі» абыходзіліся 7 асмакаў за капу (1682 г.)[147]. За працу па агароджванню дубовага тыну рабочаму заплацілі за некалькі дзён 1 залаты і 10 асмакаў (1684 г.)[148].

Цікава, што сама агароджа мае ў Беларусі рэгіянальную спецыфіку і мае не толькі розныя назвы, але і спосабы ўзвядзення, выкарыстання для гэтай мэты розных матэрыялаў і г. д. З гэтай мэтай намі прааналізаваны матэрыялы этнаграфічных экспедыцый 1950—1960-ых і 2004 гг. Паводле старажытных актавых дакументаў, у XVI—XVII стст. агароджу часцей называлі ізгародай, плотам, парканам, замётам, тынам, а дашчаты забор — «дилеваньем»[149]. У больш позні час (XIX—XX стст.) агароджа на Беларусі мела некалькі назваў: частакол, тын, паркан, штыкеты, штакеты, штыкетнік, плот, забор, прасла, леска, замёт, пляцень, шалёўка, загарад, ізгарадзь і інш.

Паводле нашых даследаванняў, агароджу рабілі з жэрдак, дошак, калкоў, бярвенняў, плялі з лазы. Агульнай назвай з'яўляецца слова «плот»[150]. Матэрыялы этнаграфічных даследаванняў сведчаць аб тым, што слова «плот» як назва агароджы ў XX ст. было пашырана ва ўсіх рэгіёнах, за выключэннем Магілёўшчыны. Нягледзячы на адну назву, у кож-

ным рэгіёне плот рабілі не толькі з рознага матэрыялу (дошак, калкоў, жэрдак), але і розным па вышыні.

Асновай любой агароджы былі ўкопаныя ў зямлю слупы праз 3—4 м і прымацаваныя да іх жэрдкі («пярэчкі», «латы»), да якіх, у сваю чаргу, мацаваліся дошкі, калкі, штыкетнік. У асобных гаспадароў паміж дошкамі першага раду прыбіваліся пасярэдзіне больш вузкія. Плот уверсе меў часта прыгожую канфігурацыю ў выглядзе трохвугольнікаў, ромбаў і г. д., якая залежала ад фантазіі майстра. Плот з дошак у асноўным быў па прыцягласці ў некалькі метраў, якія аддзялялі хату і частку агарода ад вуліцы. Са шчыльна прыбітых дошак-шалёвак ён нярэдка быў вышынёй ад 1 да 2 і болей метраў[151]. Астатняя частка агароджы рабілася з больш вузкіх дошак (штыкетніка) ці з калкоў, якія прыбіваліся да жэрдак як ушчыльную, так і рэдка.

Даследаванне паказала, што ў цэнтральных і паўднёвых губернях часцей сустракаецца назва «плот», і гэты плот рабілі з доўгага вертыкальнага штыкетніку, а часткова — з гарызантальна прыбітага да слупоў ачэсанага жэрдзя[152]. На Магілёўшчыне такая агароджа часцей насіла назву «забор», і гэтая агароджа рабілася так: да слупоў прыбіваліся гарызантальна ў 2—3 рады жэрдкі, а потым да іх вертыкальна мацаваўся штыкетнік, дошкі ці круглыя калкі.

Плот забяспечваў найбольшую абарону ад жывёлы і злодзеяў. Праз шчыльна прыбіты штыкетнік не пралазіла нават курыца. Такую ж функцыю выконвалі «леска»[153] і «частакол»[154]. Заборы са штыкетніка часта мелі аднайменныя назвы: «штакет», «штыкет», «штахет», таксама «дыль»[155]. Калі ў назвах «плот», «штыкет», «забор» больш тэрміналагічнае адрозненне, то «частакол» азначае агароджу, як правіла, з нячышчаных калкоў, завостраных уверсе, якія прыбіваліся да жэрдак, часам апляталіся лазой[156]. Калкі ставіліся вертыкальна, прама ці ў выглядзе буквы «Х». Нярэдка яны былі вострымі і доўгімі, таму пералезці праз частакол было нялёгкай справай. На Магілёўшчыне такая агароджа насіла назву «леска» або «ізгарадзь». «Леска» рабілася са шчыльна падагнаных тонкіх альховых палак, арэшніку ці яловага суччя і пераплятася папарна па розных баках паралельна прыбітага да слупоў жэрдзя, утвараючы нешта падобнае на букву «Х». Рабілася яна звычайна са свежага,

не высахлага яшчэ сучча, каб не ламалася. Звычайна плотам ці «лескай» тут не абносілі ўсю сядзібу, а толькі агарод каля хаты, з-за недахопу матэрыялаў. На леску, якая аддзяляла двор ад агарода, гаспадыня вешала для прасушкі гарлачыкі, чугункі, слоікі і г. д.

Па дадзеных М. Рытава, на агароджу ў 100 сажняў трэба было набыць 400 калоў па 3 рублі за сотню, 10 вазоў галля па рублю за кожны воз і 10 рублёў аддаць за работу[157]. А гэта складала 32 рублі — сума, вялікая па цэнах канца XIX ст. Магчыма, гэта ўплывала на тое, што сяляне, не маючы дастатковых сродкаў на агароджу, саджалі вакол сядзібы дрэвы (ліпы, вішні, слівы і інш.), якія, разрастаючыся, стваралі жывую агароджу. Традыцыя гэта, па дадзеных аўтара, існавала і ў 50—60-ыя гг. XX ст. Часта сустракалася агароджа, якая называлася «прясла» (назва пашырана на Магілёўшчыне) і якой абносілася большая частка сядзібы. Да рэдка расстаўленых слупоў прыбіваліся ў 2—3 рады, а то і болей паралельныя жэрдкі, і такая агароджа ўратоўвала агарод ад патравы толькі буйной рагатай жывёлай. Пералезці праз прясла чалавеку ці дробнай жывёліне або птушцы не ўяўляла ніякай цяжкасці. Пасля Вялікай Айчыннай вайны для большай надзейнасці зверху і знізу яе нацягвалі калючы дрот, якога шмат валялася ў розных месцах[158].

Пашыраны былі ў Беларусі агароджы пад назвай «пляцень», якія рабіліся з лазы або з галля дрэў. Пляцень плёўся праз невялікія (меней 1 м) калкі. Па-майстэрску зроблены пляцень выглядаў прыгожа, аднак быў недаўгавечным, хутка перасыхаў, а галлё ламалася. Пляцень служыў агароджай ад жывёлы і птушак. Аднак пераадолець яго для курыцы ці казы не складала цяжкасці. Такія агароджы рабілі часцей удовыя і адзінокія жанчыны, якія не мелі мужчынскіх рук у гаспадарцы[159]. У XIX — першай палове XX ст. на Палессі і ў іншых месцах сустракаліся плятні вышынёй да 2 м і болей, шчыльна сплеценыя з лазы, якія былі надзейнай аховай агарода ад патравы жывёлай ці птушкай. Сплеценая агароджа часцей насіла адпаведную назву. Значна радзей плятнём называлі агароджу, падобную на частакол. Яна ўяўляла сабой прыбітыя да слупоў 3 гарызантальныя жэрдкі, пераплеценыя вертыкальна суччам. Такая назва сустракалася ў Гомельскай, Мінскай і некаторых іншых абласцях. Існавала

агароджа ў 3—6 гарызантальных жэрдак, прыбітых на адлегласці 30 см і болей да слупоў, або паміж двух слупоў паралельныя жэрдкі апляталіся да іх лазой у выглядзе ∞[160].

Найбольш старажытным відам агароджы, якая захавалася да сярэдзіны XX ст. і нават пазней, быў плот на шулах (шуляку), які называўся «паркан», «замёт», «забор (плот) на шулах закідны». Гэты плот рабіўся з бярвенняў (6—9), якія закідваліся ў спецыяльна зробленыя шпары ў шулах. Ён быў невялікі па працягласці і аддзяляў часцей за ўсё двор ад вуліцы, радзей — і частку агарода, што прылягала да гаспадарчых пабудоў. Цікава, што ў асобных раёнах Міншчыны зафіксавана назва «парка́ніна» (так называліся калкі ў плоце). Многія віды ранейшай агароджы існуюць і сёння. Разам з тым у невялікіх гарадах, пасёлках, у асобных жыхароў вёскі агароджа робіцца з выкарыстаннем камення, металу, спецыяльных пліт, металічнай сеткі і іншых матэрыялаў, якія ствараюць прыгожы выгляд дагледжанаму агароду.

***Глеба-кліматычныя ўмовы Беларусі і ўраджайнасць агародных культур.*** На развіццё агародніцтва вялікі ўплыў аказвае прыроднае асяроддзе, глеба-кліматычныя ўмовы Беларусі, якая знаходзіцца ў вобласці паўночных умераных шырот. Характар надвор'я, на думку вучоных, у многім залежыць ад масы Атлантыкі і заходніх ветраў, якія ўзімку выклікаюць снегапады, а летам — дажджы і пахаладанні[161]. Найбольш цёплымі месцамі ў Беларусі з'яўляюцца паўднёва-заходнія раёны. Звычайна колькасць ападкаў на Беларусі блізкая да нормы. Асабліва спрыяюць сельскагаспадарчай працы дажджы ў маі і ліпені («Май дажджлівы — год урадлівы» — сцвярджае народ). Аднак «Год на год не прыходзіцца», а таму здараліся засушлівыя ці занадта дажджлівыя гады, якія не спрыялі добраму ўраджаю.

Ян Баршчэўскі пісаў: «У нашым краі доўгая і нясталая зіма, часам мокрая, часам марозная і завейная, у лагчынах вада, а на пагорках паўночны вецер нішчыць пшаніцу і жыта, аднак жа дбайнасць і праца гаспадара можа перамагчы ўсё»[162].

Урадлівасць глебы залежала ад яе складу. Большасць тэрыторыі складалі дзірваніста-падзолістыя і падзоліста-балот-

ныя глебы[163]. Першыя падзяляліся на гліністыя, суглінкавыя, пясчаныя і супясчаныя, вельмі адчувальныя да засухі і залішняй вільготнасці.

На поўначы Беларусі пераважалі сярэдне- і цяжкасуглiністыя глебы, на захадзе і паўднёва-ўсходняй частцы — супясчаныя і пясчаныя. Лепшыя ўраджаі атрымліваліся на дзірваніста-падзолістых глебах Мінскай, Магілёўскай і часткова Віцебскай абласцей, а таксама на моцна дзірваністых глебах Прыпяцкага Палесся і багатых гумусам падзолістых глебах Прыпяцкага Левабярэжжа[164].

Мясцовыя экалагічныя ўмовы, характар глебы ў многім абумоўлівалі не толькі характар земляробства, але і яго спецыялізацыю і эфектыўнасць. На думку В.С. Цітова, «яны ў значнай ступені вызначалі прыёмы апрацоўкі глебы, асабліва землекарыстання, севазварот і адпаведныя ім аптымальныя канструкцыі сельскагаспадарчых прылад. У беларускіх губернях былі шырокавядомы некалькі сістэм земляробства, якія склаліся гістарычна: падсечна-агнявая, лясная аблога, трохполле і шматполле»[165]. У найбольш заселеных і асвоеных раёнах Беларусі, якімі былі лёсавыя раўніны Панёмання, цэнтральнай Беларусі і левабярэжжа Дняпра, у сярэдзіне XIX ст. ворныя землі складалі палову сельскагаспадарчых угоддзяў, а ў сістэме севазвароту гаспадарыла трохполле[166], хаця сустракалася двухполле і нават шасціполле (напрыклад, у маёнтку Храптовіча ў Бешанковічах), а таксама дзевяціполле.

У асобных месцах паўночнай і паўднёвай Беларусі малаўраджайныя дзярнова-падзолістыя глебы, шматлікія марэнныя ўзгоркі і азёры, вялікая колькасць вялізных камянёў, а таксама адносна невялікі вегетацыйны перыяд (178—185 дзён) на поўначы стваралі меней прыдатныя ўмовы для гаспадарання. Землі былі неаднолькавыя. Так, у Гродзенскай губерні, напрыклад, большасць земляў складалі пясчанасуглiністыя. У асобных месцах (напрыклад, у Пружанскім павеце) гэта былі сумесі гліны і мергеля, суглінка і балотнага чарназёму, прыдатныя для вырошчвання агароднiны. Такую ж урадлівую глебу (па большай частцы суглінак і балотны чарназём) мелі Кобрынскі і іншыя паветы. Паміж Чэрыкавым і Мсціславам у глебе былі суглінкі і вапна, што разам стварала мергель, карысны для раслін. Паміж Дуброў-

най і Мінскам зямля была сумессю чарназёму, глею і пяску. Але аднымі з самых ўрадлівых лічыліся землі паміж Нясвіжам і Наваградкам[167].

У Лепельскім павеце (в. Забалацце) глеба складалася з невялікага слою сумесі белага пяску і белай гліны. Перамешаную з гноем глебу называлі «шарою». «На одной и той жа десятине можно встретить суглинок, красный песок и шарую землю до того мелкого слоя, что стоит прозевать и не поднять элеватор на плуге, чтобы белый песок подпочвы выворотился наружу»[168]. Цяжка было апрацоўваць падзолістую цвёрдую і халодную глебу, якая мае шмат вады. Расліны на ёй вымакаюць ці запавольваюцца ў росце. Таму земляроб вымушаны быў вырываць па палях глыбокія канавы для сцёку вады.

Ураджайнасць глебы таксама была неаднолькавай. Іншаземныя аўтары, якія пабывалі на Беларусі, прызнавалі, што зямля тут адносна ўрадлівая. Так, вядомы вандроўнік барон С. Герберштэйн пісаў пра Гродзеншчыну, што ў ёй даволі добрыя ўраджаі, у адпаведнасці з прыродай. Вандроўнік П. Гейзенштэйн пра Полацкае ваяводства гаварыў, што яно не саступае па ўрадлівасці глебы іншым[169]. Вядомы вандроўнік Гваньіні нават прысвяціў гэтым пытанням работу, якая называлася «Спосаб ворыва і сеяння ў Беларусі, сумежнай з Масковіяй, і ў Вялікім княстве Літоўскім»[170], у якой шмат увагі ўдзяліў падсечнаму земляробству.

Ураджайнасць агародных культур у значнай ступені залежыць ад угнаення глебы. Здаўна ў якасці ўгнаення выкарыстоўвалі гной, хаця немагчыма дакладна вызначыць, калі ўпершыню пачалі яго выкарыстоўваць. Вядома, што ў Заходняй Еўропе яшчэ ў XV ст. не ведалі, што рабіць з ім, а ў Парыжы ў гэты час скідвалі яго ў Сену[171]. Беларускімі археолагамі знойдзены вялікія скопішчы гною ў пластах XVI—XVII стст.[172]. У XVI ст. у інвентарах маёнткаў сустракаецца ўпамінанне аб гноі: «...с полями навозными и ненавозными ялвыми и простыми»[173]; «...продавати, променяти, навозом навезти»[174]; «...бочка земли навозное полкопы грошей»[175]. Угноеныя палі ў XVI ст. называліся «гной», а поле для выпасу скаціны — «пагной», таму што яно паступова ўгнойвалася, дзякуючы жывёле. Гэтая розніца выражалася ў дакументах: «...зъ погноями, зъ навозами»[176].

Глеба заўсёды патрабавала ўгнаення, каб даваць добры ўраджай. У народзе казалі: «Зямелька нас корміць, а сама есці просіць», «Кладзі гной на гарод кожны год — будзеш хадзіць кажды дзень на гарод».

У XIX ст. на кожную дзесяціну ў Гродзенскай губерні вывозілася ад 150 да 200 вазоў гною[177]. Выкарыстанне ў якасці ўгнаення гною буйной рагатай скаціны традыцыйна склалася на Беларусі. Яго стараліся назапасіць. Часта змешвалі конскі, кароўскі і авечы гной з торфам і чарназёмам, скідваючы іх у агульную кучу вышынёй да 1 $^{1}/_{2}$ аршына[178]. Па-першае, гэта павялічвала абъём угнаення, а па другое, торф, які прапітваўся гнаянымі газамі, быў адным з лепшых тукаў і выкарыстоўваўся пераважна як ўгнаенне для парнікоў і агародаў. Дарэчы, гнаяныя кучы і кампостныя ямы паліваліся гнаяной жыжай (з-пад свіней ці кароў). У якасці ўгнаення выкарыстоўваўся глей і торф. На Магілёўшчыне ворная зямля, калі добра ўгнойвалася, давала добры ўраджай на працягу дзесяці гадоў без угнаення. У некаторых маёнтках Аршанскага павета ў зямлю ўносілі гной і мергель[179].

Гною ў гаспадарцы сялян не хапала нават для ўгнаення сваіх палеткаў. У першую чаргу ўгнойваліся сядзібныя агароды, бульбяныя пасевы. Да таго ж павіннасцю прыгонных сялян быў вываз часткі гною са сваіх хлявоў на панскія палеткі. Па ўспамінах старых жыхароў Магілёўшчыны, сяляне ў пачатку XX ст. з мэтай павялічыць колькасць гною на двары перад пуняй, дзе ўтрымлівалі жывёлу, падсцілалі салому, скідвалі розныя арганічныя адыходы (пустазелле, бадыллё, лісце буракоў і капусты і інш.), якія разам з экскрэментамі жывёлы прэлі і ўтваралі гной. Дзякуючы гэтаму на наступны год увесну селянін вывозіў толькі з двара да 10 вазоў гною[180].

Як адзначалася, вялікую ролю ў атрыманні добрага ўраджаю адыгрывала надвор'е. З надвор'ем цесна звязаны пасеў у тэрмін агародных культур, іх рост і ўраджайнасць. Так, 30 мая 1844 г. прадвадзіцель дваранства Бельскага павета паведамляў Гродзенскаму грамадзянскаму губернатару: «На полях Бельского уезда озимый хлеб начал колоситься, состояние коего хорошее, посев ярового хлеба и огородных овощей окончен и всходы оных медленны...чему препятствует

сухая холодная погода»[181]. У гэты год халодная, асабліва ноччу, без дажджоў, з моцнымі вятрамі вясна адмоўна адбівалася на росце раслін, марудны рост якіх адзначалі і ў іншых месцах Гродзеншчыны: Ваўкавыскім, Гродзенскім і іншых паветах[182]. У Мінскай губерні, дзе вясна пачалася цёплым надвор'ем у красавіку, а ў маі былі засуха і моцныя вятры, у чэрвені — праліўныя дажджы і халады, пагоршыўся рост і цвіценне розных культур, у тым ліку і агародніны. А ў нізкіх мясцінах на падзольнай глебе яна ўрадзілася асабліва дрэнна[183].

У 1882 г. у жніўні на Магілёўшчыне здарыліся замаразкі («ранішнікі»), якія моцна пашкодзілі расліны на палях і агародах і прынеслі сялянам вялікія страты[184].

Спецыяльная Віленская губернская камісія народнага харчавання была занепакоена становішчам, якое склалася ў выніку неспрыяльных атмасферных з'яў летам і вясной 1844 г. Яна пацвердзіла, што з 10 мая па 1 чэрвеня тэмпература паветра была халоднай, з дажджамі, а ночы «з прымаразкамі». У нізкіх месцах ураджай проста вымак. Град летам пашкодзіў, а ў асобных месцах знішчыў пасевы агародніны, як, напрыклад, у Лынтупах памешчыка Бучынскага, а таксама ў Раманішках — Даўгялы, Байкоўшчыне — Юрагі і многіх іншых[185]. Заставалася толькі спадзявацца на тое, што ежы хопіць да будучага ўраджаю. Невялікі ўраджай гародніны 1844 г. паўплываў на рост яе кошту.

Раннія замаразкі восенню не далі магчымасці сабраць агародніну ў час. Стварылася такое становішча, як канстатавала Гродзенская губернская камісія харчавання, што «в картофеле и огородных овощах большой недостаток, ибо многие места занесены были водою, и по сей причине урожай оных в сравнении с прошлогодним едва может быть в третьей части»[186]. Такое становішча здаралася часта. Трэба адзначыць, што характар надвор'я неаднолькава ўплываў на ўраджай зернавых і агародніны. Так, у наступным, 1845 г. надвор'е таксама не спрыяла росту збожжавых, а вось агародніна, у тым ліку бульба, была добрай[187]. У 1853 г. у Гродзенскай губерні разам з мізэрным ураджаем хлеба мала было і агародніны, асабліва бульбы. У нізкіх месцах яе шмат згніло, а таму і не хапіла на забеспячэнне сем'яў[188].

Асабліва важна для росту агародніны, каб вясной праходзілі дажджы, а летам было цёплае надвор'е. Што тычыц-

ца лета, калі агародніна хутка расце, набірае моц, на яе таксама дрэнны ўплыў аказваюць шкодныя атмасферныя з'явы, такія, як град, праліўныя дажджы, холад, а таксама шкодныя насякомыя і хваробы, якія значна памяншаюць ураджай або зусім знішчаюць яго. Так, газета «Гродненские губернские ведомости» ў ліпені 1905 г. паведамляла, што ў сялян і прыватных уласнікаў паветаў агароды і хлебныя палі моцна пашкодзіў град. Напрыклад, у Бельскім павеце ў маёнтку Антонін акрамя збожжавых былі пабіты градам 4 дзесяціны бабоў і 3 дзесяціны з агароднінай. Страты ад града склалі 5 тысяч рублёў[189].

***Прылады працы і апрацоўка глебы на агародах.*** Пра сельскагаспадарчы інвентар старажытнага перыяду мы маем няшмат дадзеных. Вядома, што па дадзеных археолагаў, у пачатку другога тысячагоддзя, на агародах прымяняліся драўляныя рыдлёўкі і металічныя матыкі[190]. Пад 1590 г. упамінаюцца «сошнікі» як прылады сялянскія пана Копаця, а таксама сярпы, косы, тупіцы, матыка, заступень жалезны[191], пад 1575 г. — бараня́[192], пад 1598 г. — рыдлі, матыкі[193], пад 1555 г. — «копач»[194]. У XVII ст. у дакументах сустракаюцца назвы: «лапаты», «рыдлі», «вілы», «заступы»[195].

Акрамя ручных прылад, аб якіх размова пойдзе ніжэй, у XIX — пачатку XX ст. на агародах выкарыстоўваліся бароны, сохі, плугі, у тым ліку і жалезныя, якія цягнулі коні ці валы. Жалезныя плугі, па словах апытаных сялян, у адных месцах з'явіліся ў 20-ыя гг., у другіх — у пачатку 30-ых гг. XX ст. У памешчыкаў аралі з іх дапамогай яшчэ ў канцы XIX ст.[196].

Побач з літоўскай сахой у панскіх маёнтках былі распаўсюджаны жалезныя прылады працы замежнай вытворчасці: брабанцкі плуг, галштынскія і мекленбургскія жалезныя бароны[197].

Для гаспадарання ў 1852 г. земляробчы інстытут у Горках, напрыклад, набыў жалезны плуг Рансона, які меў розныя адвалы і лемяхі, жалезную барану, а таксама плуг Говарда, зроблены з аднаго кавалка жалеза з крутавыгнутым крылом адвалу. З-за гэтага пры ворыве пласт зямлі пераварочваўся і лёгка ламаўся і трэскаўся. Сярод набытага значыліся амерыканскія плугі і акучнікі, а таксама рыдлёўкі і кіркі[198].

У канцы XIX ст. у продажы можна было набыць жалезныя плугі і бароны («зігзаг»), лёгкія нямецкія, шведскія, англійскія рыдлёўкі, матыгі, ца́пы, жалезныя граблі і вілы. Заможныя сяляне, арандатары і гаспадары маёнткаў набывалі не толькі ручныя прылады працы для працы ў агародзе і полі, але і прыстасаванні і машыны: бульбакапальнік Гардэра, ручныя культыватары, жалезныя плугі (плуг Сакка, плуг Вжэсінскага аднаконны і параконны і інш.).

У XIX ст. у сялян, як і ў больш ранні час, ворыва адбывалася з дапамогай сахі. Сахой без перакладзін на прысядзібных участках акучвалі бульбу. З дапамогай драўлянай бараны («смык»), збітай з некалькіх яловых плах з сучкамі даўжынёй 30—40 см, ачышчалі ворыва ад пустазелля.Такія прылады бытавалі ў пачатку XX ст., а ў асобных месцах — да 20-ых гг., калі на змену ім прыйшлі жалезныя плугі і бароны[199].

Асноўнымі працоўнымі аперацыямі ў агародніцтве, як і ў земляробстве ў цэлым, былі: вываз угнаення, пераворванне, баранаванне, сяўба, догляд за пасевамі агародніны, уборка і захаванне ўраджаю.

У сялянскіх гаспадарках з другой паловы XVIII ст. было абавязковым узворванне і баранаванне сядзібнай зямлі па некалькі разоў[200]. Ворыва на агародах, як і на палях, было асенняе і веснавое. Вясной у зямлю клалі гной і аралі плугам ці ўскопвалі рыдлёўкай на штык ці два. Сяляне лічылі, што больш чым на 2,5—3 вяршкі заворваць нельга[201]. Пасля баранавалі бараной, раўняючы зямлю, разбіваючы камы зямлі і знішчаючы карані шматгадовых траў. Асенняе ворыва было карысным не толькі для глебы, але і для барацьбы з пустазеллем, якое пераправала ў зямлі за зіму.

Для ручной апрацоўкі глебы ў канцы XIX — першай палове XX ст. выкарыстоўваліся лапаты-рыдлі, абабітыя па краях жалезам, капачы, ручныя акучнікі, граблі, матыкі, якія мелі розную канструкцыю, форму і прызначэнне. Большасць з іх вядомы, згодна з нашымі дадзенымі, са старажытнасці пад назвамі: «маты́ка», «маты́га», «капы́л», «са́па», «са́пка», «га́чка», «капані́ца», «ца́пка», «ця́пка» і інш. Матыка ў ранніх формах узнікла, на думку этнографаў, з узнікненнем земляробства[202]. Першыя матыкі, якія выкарыстоўваліся і для раскарчоўкі ляда, рабіліся з камення, косці.

Параўноўваючы беларускія і ўкраінскія ручныя прылады для апрацоўкі глебы, можна адзначыць, што многія формы іх бытавалі ў абедзьвух краінах і розніліся па большай частцы назвамі. Так, масіўная матыка, падобная на сякеру, у беларусаў мела назву «капыл»[203] (у ўкраінцаў — «рога́чка»[204]). Агульнасць у канструкцыі матык двух народаў найбольш выразна праявілася ў палескіх варыянтах матык беларуска-ўкраінскага памежжа, асабліва тых, дзе тапарышча было як у сякеры, мела гранёны абух, прымацаваны пад прамым вуглом, і патаўшчэнне цэнтральнай рабочай часткі. Магчыма, такое падабенства звязана з агульнымі спосабамі вырабу ў далёкім мінулым. Працаваць «капылом» лічылася цяжкай працай, асабліва пры апрацоўцы ляда. Гэта канструкцыя матыкі ў Беларусі дажыла да канца XIX ст.[205].

У XIX ст. традыцыйна матыкі былі трапецападобнай, авальнай, прамавугольнай рабочай часткай і мелі лязо, якое ўверсе заканчвалася вушкам, у якое забіваўся драўляны дзяржак (ручка). Часта лязо і вуха вырабляліся з аднаго кавалка жалеза. У тыпалагічных адносінах матыка XIX ст. была аднатыпнай, дзвюх форм: больш масіўная на доўгай ручцы для апрацоўкі буракоў, кукурузы, бульбы і інш. і маленькая на доўгай ці кароткай ручцы для рыхлення глебы пры прапалцы іншых культур.

Аналіз матэрыялаў этнаграфічных даследаванняў 1950—1960-ых гг., праведзеных беларускімі этнографамі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, дазваляе выявіць ступень бытавання тых або іншых форм ручных прылад у розных рэгіёнах, асаблівасці іх канструкцыі, назваў, выкарыстання ў розных агародных работах. Вядома, што на агародах выкарыстоўваліся матыкі, ца́пы, рыдлёўкі, граблі, вілы.

У розных мясцовасцях Беларусі матыка мела свае назвы, якія, як правіла, не залежалі ад яе канструкцыі. Так, паўсюдна яна называлася матыга, матыка, капаніца, ца́пка або са́пка. На Брэстчыне акрамя гэтага бытавалі назвы «капа́чка», «капу́шка», «га́чка»[206]; у Мінскай — «драпа́чык»[207]; у Віцебскай — «капы́л», «капа́ч»[208].

Падчас экспедыцый 1966—1967 гг. у асобных сялянскіх гаспадарках захоўваліся яшчэ старыя матыкі ўзору 1900-ых гг., перыяду калектывізацыі і даваеннага часу, а таксама больш познія, набытыя праз гандаль ці зробленыя мясцовымі ка-

валямі. Сярод іх у працы на агародзе і полі выкарыстоўваліся рознай формы і канструкцыі «цáпы» (шырокія і вузкія, двайныя і вілачныя, а таксама так званыя «англійскія цапы»).

Такія цапы прадаваліся ўжо ў канцы XIX ст. у крамах, дзе іх куплялі заможныя гаспадары і ўладальнікі маёнткаў; сяляне ж заказвалі іх кавалям часам з паламаных блях рыдлёвак, і яны абыходзіліся ім у 25 капеек[209]. Былі яны лёгкія і зручныя. Фабрычныя, хаця і каштавалі ўдвая даражэй, былі вельмі цяжкімі, працаваць імі было нязручна. Шырокімі цапамі можна было знішчаць пустазелле ў баразне ці ў міжрадкоўі, а для акучвання раслін яны не падыходзілі. Больш лёгкімі і зручнымі лічыліся англійскія цáпы. Але з-за дарагоўлі яны былі недасягальнымі для селяніна. Таму і замаўлялі кавалям, якія рабілі цапы па ўзору англійскіх, нямецкіх, шведскіх.

Матыкі, па ўспамінах рэспандэнтаў, выраблялiся таксама з прадаўгаватых піл (крыху загнутых унутр) і мелі шырыню 10—15 см.[210]. Ад цап матыкі адрозніваліся больш вузкай формай і, у залежнасці ад прызначэння, рабіліся як цяжкімі, так і лёгкімі. Яны прызначаліся для рыхлення зямлі на шчыльнай глебе, знішчэння пустазелля. З дапамогай матыкі не толькі рыхлілася зямля вакол раслін, але і выкарчоўваліся шматгадовыя травы (пырнік, дзьмухавец і інш.). Каб спалучаць дзве гэтыя функцыі, матыкі, як і зараз, рабіліся нярэдка двухбаковымі: першы, трохвугольны, прамы ці авальны, служыў для рыхлення, другі, двух- ці трохзубы, — для знішчэння каранёў раслін. Этнаграфічныя матэрыялы сведчаць аб бытаванні ў Беларусі вялікай разнастайнасці матык, якія мелі прамавугольную, з зубамі ці без іх, квадратную, авальную, трохвугольную, трапецападобную формы. Больш познія па паходжанню маленькія матыкі (капачкі, капаніцы, сапкі, гачкі, цяпкі, трохрожкі і г. д.) часта мелі 2—4 зубцы (прамыя ці загнутыя). Такая матыка не столькі падразала карані, колькі служыла для рыхлення і збівання невялікіх і кароткакаранёвых раслін. Па ўспамінах старажылаў, з'явіліся яны ў Беларусі пасля першай сусветнай вайны[211]. Трэба адзначыць, што ў асобных вёсках яшчэ ў канцы XIX ст. сустракаліся драўляныя матыкі, рабочая частка якіх была абабіта бляхай ці тонкім жалезам[212].

Узнікненне і распаўсюджанне розных форм матык звязана як з прыродна-кліматычнымі ўмовамі краю, так і з запазычаннямі ў суседніх народаў, а дыктавалася зручнасцю ў іх выкарыстанні. Матыкай працавалі наступным чынам: білі лязом на адлегласці 4—6 см ад расліны ў напрамку да сябе і абгортвалі яе. Так абгортвалі («абцяпвалі», «матыкалі») бульбу, буракі, кукурузу і іншыя расліны, збіраючы пры гэтым найбольш буйное пустазелле, каб лягчэй далей было апрацоўваць зямлю. Час ад часу іх вастрылі з дапамогай спецыяльных прылад. Калі трэба было падрыхліць («падбіць») зямлю пад раслінамі, дзе трава была маленькай, матыкай варушылі зямлю на невялікай адлегласці вакол расліны. Акрамя таго, матыка выкарыстоўвалася і для абазначэння радкоў і бaрознаў, у якія кідалі потым насенне. Для гэтага вуглом матыкі праводзілі на падрыхтаванай градзе вузкія баразёнкі глыбінёй 3—6 см, а пасля севу насення морквы, буракоў ці якой-небудзь іншай культуры такім жа чынам з абодвух бакоў баразёнкі абгортвалі зямлёй.

Не менш старажытнай прыладай, чым матыка паўкруглай ці чатырохвугольнай формы, была лапата-рыдля, зробленая з цвёрдых парод дрэва з акоўкай па нізе жалезам[213]. Яна была падобнай на ўкраінскі заступ, у якім таксама рабочая частка была акавана жалезам ці так званым «насадам»[214]. У другой палове XIX ст. лапаты-рыдлі, лапаты-шлюхты[215], «жалезнякі», «заступы-рыдлі» бытавалі ў асобных месцах на Віцебшчыне, Брэстчыне і Гомельшчыне[216] і праіснавалі да 1939 г.[217]. З дапамогай рыдлёўкі сяляне націскалі нагой на выступ у рабочай частцы, потым пераварочвалі зямлю і выкопвалі агародніну (бульбу, буракі і інш.). Ёй ускопвалі таксама агародную зямлю для пасеву ў градкі ці загоны буракоў, бульбы, капусты і г. д. Рыдлёўкай абгортвалі бульбу пры акучванні. Ужывалася яна і для капання ям, падбору гною і іншых работ. Карысталіся і стальнымі (англійскія, нямецкія і інш.) рыдлёўкамі, якія куплялі за 50—70 капеек і да жалезнай часткі прымацоўвалі драўляную ручку (прыкладна 70—90 см) з дапамогай заклёпкі ці цвіка. У беларускіх сялян, па дадзеных даследавання, яны з'явіліся ў пачатку 30-ых гг.[218]. Англійскія з ручкай і прамавугольным лязом каштавалі ад 2 руб. 25 кап. да 2 руб. 75 кап.[219]. У канцы XIX ст. для апрацоўкі зямлі выкарыстоўвалі

невялікія лапаты «капачы», або «капалкі»[220], з востраканечным лязом. З дапамогай іх часта выкопвалі бульбу, буракі, бручку, моркву і іншую гародніну.

Для апрацоўкі міжрадкоўя выкарыстоўваліся вузкія (з 2—3 зубамі) граблі. Шырокімі граблямі зручна было разбіваць невялічкія камы зямлі на ўскопаных месцах (градках), прыкрываць зямлёй насенне, выбіраць бульбу. У Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці граблі да сённяшняга дня выкарыстоўваюць пры ўборцы бульбы, выграбаючы з іх дапамогай яе з ралля. У Лепельскім раёне ў 1960-ыя гг. асобныя гаспадары капалі бульбу з дапамогай кароткіх металічных грабель («грабельцы») ці драўляных з чатырма зубамі[221].

Трэба сказаць і аб выкарыстанні віл у агародных работах. Віламі зручна было скідваць бульбоўнік, гарахвянік, гурочнік, быллё, націну буракоў і г. д. У асобных месцах імі карысталіся для выкопвання гародніны з мэтай засцерагчы яе ад парэзаў (як гэта часта здаралася, напрыклад, пры ўборцы рыдлёўкай). Перш чым выбіраць часнок, сялянкі падкопвалі яго віламі за некалькі дзён да ўборкі, каб падсохла націна. Прыкладна два дзесяцігоддзі таму ў продажы з'явіліся вельмі зручныя для ўскопвання агарода чатырохзубыя вілы, у якіх зубцы плоскія. Яны вельмі падобныя на амерыканскія вілы канца XIX ст., якія ўжываліся ў маёнтках[222]. Працавалі імі як лапатай, але яны, у адрозненне ад апошняй, не рэжуць карэнняў шматгадовых траў, якія знаходзяцца глыбока ў зямлі (пырнік, дзьмухавец і інш.), а падкопваюць іх з коранем. Пустазелля амаль не застаецца ў зямлі. Сёняшнія агароднікі адзначаюць, што імі працаваць значна лягчэй, чым рыдлёўкай, бо зямля не вымаецца пластам, а прасыпаецца праз зубцы, астаўляючы на іх пустазелле. Для выкопвання клубняў у XIX — пачатку XX ст. выкарыстоўваліся амерыканскія пяці-, шасцізубыя вілы, якія на канцы мелі тупыя патаўшчэнні і не рэзалі клубні. Аднак працаваць імі можна было толькі на лёгкай глебе. Па сённяшні дзень такія вілы выкарыстоўваюцца для пагрузкі і разгрузкі бульбы і іншых культур.

У Пінскім, Ляхавіцкім раёнах Брэсцкай вобласці этнографамі зафіксавана ручная прылада працы з дрэва для разрыхлення шчыльнай зямлі на прысядзібных участках[223], якая

называлася «клюка», «ключка». Ёй зручна было таксама праводзіць барозны для пасеву розных агародных культур на градах.

Аналізуючы ручныя прылады для апрацоўкі агародаў у розных месцах Беларусі, трэба адзначыць, што форма асобных з іх мала ўдасканальвалася ў параўнанні з ворыўнымі прыладамі. А таму матыкі, рыдлёўкі, напрыклад, застаюцца амаль такімі, якімі былі ў XIX ст. Тым не меней з'явілася шмат новых ручных прылад працы, такіх, як акучнік (для апрацоўкі міжрадкоў'я), аблегчаныя варыянты матык, рыдлёвак, маленькія ручныя плужкі і культыватары, маркёры для канавак для пасеву і інш. Імі і сёння карыстаюцца сяляне і гараджане-дачнікі.

У агародных работах у XIX ст. выкарыстоўвалі і лейкі. Лейкі для зручнасці аснашчалі ручкай, а на доўгім носіку рабілі спецыяльную пласцінку з дзірачкамі. Дзякуючы ёй, вада лілася дробным дождыкам, не прыгінаючы расліны, і ахоплівалася большая плошча, чым пры паліве каўшом ці вядром. Цікава, што форма іх у XX ст. была вельмі падобнай на тую, што была ў XIX ст.

Адной з працаёмкіх работ на агародзе была праполка («полка») розных культур. Агароды, добра апрацаваныя з года ў год, палоць было лягчэй. Калі яны былі моцна засмечаны пустазеллем, сяляне пры асенняй апрацоўцы глебы астаўлялі адкрытымі пласты, каб зямля прамарозілася і трава знішчылася. Аднак такая мера была недастаткова дзейснай. А таму сялянкі на працягу лета мусілі палоць грады, «капанічыць» буракі, бульбу, моркву і інш. культуры, не дазваляючы ім зарастаць травой. Вядома, што ў гэтай карпатлівай і дакучлівай працы трэба было вытрымліваць тэрміны праполкі, калі трава знаходзіцца ў стане семядольных ці невялікіх усходаў і яшчэ не «заглушыла» пасеваў. Пустазелле хутка падсыхала і гніла, калі праполка праводзілася ў сонечнае надвор'е.

Сялянкам прыходзілася палоць зноў і зноў, калі ішлі частыя дажджы і хутка расло пустазелле. На засмечанасць агарода пустазеллем уплывала традыцыя скідваць прапалатую траву з зямлёй у баразну ці на мяжу. Гэтыя кучкі травы хутка прарасталі, і пустазелле зноў рассейвалася па агародзе. Каб гэта не здаралася, сёння многія сяляне і дачнікі зно-

сяць выпалатую траву ў кампостныя ямы. Здаралася, што сяляне пасля ўборкі ўраджаю агародніны ў жніўні-верасні не ўбіралі ўзросшае пустазелле з-за недахопу часу і дапускалі яго разрастанне і абсемяненне. У такім выпадку штогод трэба было змагацца з пустазеллем з падвоенай сілай. Каб дасягнуць чысціні агарода ад засмечвання, вясной гаспадыні карпатліва выбіралі шматгадовыя травы з дапамогай грабляў. Ручныя культыватары, якія часцей прымяняліся на загонах (без градак) у пасадках бульбы, буракоў, морквы, капусты і інш., былі дасягальнымі толькі для памешчыцкіх агародаў і буйных сялянскіх гаспадарак. Культыватары значна палягчалі працу на агародзе, яны добра рыхлілі зямлю і знішчалі пустазелле. Калі іх выкарыстоўвалі 2—3 разы за лета, то гэтага было дастаткова, каб агародныя расліны набіралі моц і далейшы слабы рост пустазелля ім не перашкаджаў расці і развівацца.

Пры пасеве вялікіх плошчаў буракоў сяляне традыцыйна выкарыстоўвалі спецыяльныя маркёры («цягачка», «зна́чнік»), як правіла, з чатырма зубамі, прымацаванымі да невялікай чатырохграннай палкі, якія дазвалялі сеяць іх роўнымі радамі на аднолькавай паміж імі адлегласці. Амаль у кожнай гаспадарцы для ўборкі капусты, напрыклад, меліся спецыяльныя нажы, з дапамогай якіх яе «ссякалі» адным ударам па храпцы каля качана.

***Склад агародных культур і традыцыі іх вырошчвання.*** Дакладна невядома, калі на землях Беларусі з’явіліся тыя або іншыя агародныя культуры. Некаторыя даследчыкі лічаць, што культура агародніны сярод славян стала распаўсюджвацца адначасова з прыняццем хрысціянства. Гэтую ролю выконвалі грэчаскія прапаведнікі, манахі, якія прапаведвалі пасты, уводзілі вырошчванне капусты, хрэну, цыбулі, часнаку, гароху, буракоў, агуркоў, гарбузоў, рэдзькі[224] і інш. Многія назвы гэтых культур грэчаскія ці рымскія: буракі (грэч. «sevkle»), капуста (рым. «caput» (галава) і г. д. Аб распаўсюджанні асобных агародных культур у гэты час сведчыць той факт, што беларускія археолагі знайшлі ў Мінску буйны агародны боб, а ў Полацку — зерне агуркоў[225]. Успаміны пра гэтыя культуры ёсць ва ўстаўной грамаце смаленскага князя Расціслава Мсціславіча ў 1150 г., у Ізборніку 1073 г.[226].

У X—XIII стст., па дадзеных археалагічных даследаванняў, склад агародных культур быў невялікі: капуста, рэпа, цыбуля, буракі, агуркі[227], а таксама гарох, віка, сачавіца, боб.

У XVI—XVIII стст., як сведчаць старажытныя акты, былі вядомы: капуста, буракі, рэпа, рэдзька, боб, гарох, мак, морква, часнок, цыбуля, пастарнак, кроп, пятрушка, агуркі, гарбузы, хрэн, кмін. У гэтым спісе адсутнічаюць бульба, таматы і іншыя, якія з'явяцца пазней.

Сведкі аб тым, якія культуры былі пашыраны на землях Беларусі ў XVI—XVIII стст., дае нам аналіз старажытных актаў. Дакументы, якія характарызуюць пасевы ў агародах сялян-агароднікаў в. Магільнай Мінскага павета ў 1592 г., сведчаць, што на першым з трох агародаў было засеяна «цыбули грядъ тринадцать, капусты грядъ тридцать шесть, огурковъ грядъ пять, пастернаку грядъ пять. Другий огород увесь засъянный ръпою, третий огород засеяли макомъ, коноплями и горохомъ...»[228].

Цікава, што ў старажытнасці слова «овощ» абазначала не агародніну, а садавіну: «вступивши у в огород мой своволне і аблони садовые, которые в томъ огороде были и овощу вже з себе довали, секерою порубал...»[229]. Агародныя культуры ўпамінаюцца пад назвай «зелие».

Згодна з інвентаром 1580 г., у маёнтку Здзятла, які належаў князю Канстанціну Астрожскаму, перад дваром былі «окострожоны» тры агароды, на якіх было засеяна «цыбули посевной фунтов полчетверта» на 25 градках. Акрамя таго, тут жа размяшчаліся 15 град цыбулі на насенне («высадков»), 4 грады буракоў, 2 — капусты, 3 — рэпы і 3 — морквы. Сеялі і пастарнак, мак, гарох, боб, часнок, гарбузы, буракі, рэдзьку («грыжанка»). Акрамя пасеваў на градках вядомы быў пасеў «загонамі». У прыведзеным дакуменце значацца 3 загоны пастарнаку, столькі ж — морквы, 4 — буракоў і маку «посеено не мало»[230].

«Загонамі», ці «гонамі», у беларусаў, рускіх і іншых народаў называлі ўчастак зямлі, велічыня якога вызначалася даўжынёй, а даўжыня ў сваю чаргу абумоўлівалася фізічнымі магчымасцямі рабочай жывёлы. Таму загоны не былі пастаяннымі велічынямі. Звычайна гэта была баразна ў 20—30 сажняў, якую праходзіў араты з сахой, потым рабіў пера-

пынак і паварочваў, каб араць баразну з другога боку. Так атрымоўваўся гон. Некалькі гонаў утваралі паласу ўзаранай зямлі[231]. І.А. Сербаў пісаў, што гоны на лёгкім грунце дасягалі 200 сажняў, а на цяжкім іх даўжыня скарачалася ўдвая[232].

У агародах шмат сеялі буракоў, якія займалі важнае месца ў рацыёне жыхароў феадальнага часу. Буракі мелі некалькі назваў: «бураки», «цвікля», «свекла», «борщ», «ботвинье», «батвинье», «ботьвинне»: «...борщу и чосноку за осм три»[233]; «у в огороде...цыбули град дванадцать, ботвинья, морков, пастарнак, гороху белого град чотыри»[234]; «...капусты гряд тридцать ботвиня ставни две: одна капуста, а другая батвинья»[235]; «...высадков свекольных насажено град четыре»[236]. Пераважна пад назвай «бацвінне» разумелася выключна батва буракоў: «...бураков з ботвиньем кадей великих три»[237].

Побач з буракамі вялікую спажыўную каштоўнасць у забеспячэнні агароднінай вялікіх у той час сем'яў мела капуста. Яе садзілі таксама шмат. Паводле дакументаў: «...у в огороде засеяно речей домовых стравных — капусты град десеть, цыбули град дванадцать»[238]; «...капусты копа три гроши»[239].

У вялікай колькасці ў ВКЛ сеялі хрэн, які не толькі спажывалі самі, але і прадавалі. Вядома, што хрэн з мёдам у сялян лічыўся прысмакай. Яго дабаўлялі ў стравы і елі асобна, выкарыстоўвалі ў лячэбных мэтах. Аб распаўсюджанні хрэну сведчаць назвы «хрэнавішча», «хрэнавіска», якія абазначалі поле, засеянае хрэнам[240].

Не толькі сяляне займаліся працай у агародах памешчыкаў. За сяўбой у маёнтку часта наглядалі самі гаспадары, а зрэдку і самі прымалі ў ёй удзел: «уво второк...малжонка его...с челядю своею...сеяла...бобы и пастернак»[241].

У вялікай пашане сярод агародніны былі цыбуля і часнок. Шырока выкарыстоўвалі ў харчаванні мак, а таму сеялі яго нямала. У агародзе фальварка Курапешскі цыбуля займала 6 з паловай градак, па 2 загоны сеялі буракі і пастарнак і па 3 загоны — мак[242].

У фальварках, як сведчаць актавыя дакументы, агародніну сеялі не толькі для спажывання, але і на продаж. Цікавасць уяўляе агарод буйнога землеўладальніка Берасцейска-

га староства ў XVI ст. (1577 г.), у якім было засеяна: цыбулі загонаў 20 («з рунтов чотыри» насення) і столькі ж капусты, 15 загонаў пастарнаку, 60 — морквы, 5 загонаў пятрушкі і бочка канапель. Асабліва ўражвае плошча пасеваў маку і рэпы, якімі было засеяна па 2 моргі[243].

У маёнтках у гэты час ужо практыкавалі вырошчванне расады для пасеваў у спецыяльных парніках. Аб гэтым сведчыць запіс у інвентары: «росады насеено росадниковъ два...»[244].

Меў месца і крадзеж агародніны. Так, у 1541 г. здарыўся выпадак, які стаў потым тэмай судзебнага разбірацельства, калі татарын Альбедзін у суседа ўкраў: «увошол въ наш огородъ и огурки рвалъ»[245]. Дзеці, заўважыўшы гэтае злачынства, паскардзіліся маці, і яна пабіла грабежніка. У 1592 г. у суседа другі гвалтоўна забраў агародніну: «пастернакъ, петрушку, морковъ покопалъ, побралъ...»[246]. У агароды забіраліся часта вясковыя дзеці: «дети его зъ его дому репу мою зъ огорода рвали»[247].

Вялікія страты агародам усіх саслоўяў наносілі войны. У час Айчыннай вайны 1812 г., напрыклад, паводле дакументаў, нярэдка было «въ огородъ все засъянное истреблено»; у выніку «опустошения огорода понес убытка на 20 рублей серебром»[248].

Сяляне, як правіла, на сваіх агародах садзілі «высадкі», насенне з якіх ішло на пасеў. Насенне агародніны прызначалася і на продаж. Часта яно было няякасным і давала дрэнныя ўсходы ці не ўзыходзіла зусім. Так, у 1578 г. магілёўскі мешчанін Конан Баўчура судзіўся з Труханам Акіняй за няўплату ім 50 грошаў за прададзенае яму насенне цыбулі. А апошні матываваў няўплату тым, што яно не ўзышло[249]. У другога мешчаніна было ўкрадзена сорак фунтаў цыбульнага насення, кожны фунт якога ацэньваўся ў той час па 8 грошаў[250].

Яшчэ з канца XVIII ст. у магнацкіх маёнтках з'явіліся цяпліцы, у якіх зімой паспяхова вырошчвалі ананасы, фігі, дыні, абрыкосы, шчаўе, шпінат, пятрушку, салат. Асобныя рэалізавалі частку сваёй прадукцыі на ўнутраным рынку, але большасць спажывалі самі. Вырошчвалі ў цяпліцах і расаду гародніны.



4. Зак. 2839.

Вырашчаную гародніну трэба было захаваць на зіму. З гэтай праблемай сутыкаліся агароднікі ва ўсе часы. Як сведчаць старажытныя акты, многія з агародных культур насельнікі квасілі ў бочкі (капусту, буракі, моркву, пастарнак, боб і інш.), другія вязалі ў вянкі-пляцёнкі (цыбулю, часнок): «в том свирне маку бочка...бобу солянка»[251]; «варыва в кадъх великихъ дубовых: капусты кислое чотыри кади...бураковъ зъ ботвиньем кадей великих три рѣпы бочок дванадцать»[252]; «...капуста шиткованная»[253]. Трэба адзначыць, што да XX ст. пераважала квашанне гародніны.

Усе запасы звычайна змяшчаліся ў «падклетках», свірнах, паграбах[254]. У іх захоўваліся таксама гарох, каноплі, ільняное семя, цыбуля. Так, у 1577 г. з падклета было ўкрадзена: гароху белага «меры Берестейское бочок пять», гароху шэрага — 3 бочкі, маку белага — 2, семя канаплянага — 5, ільнянога — 2, цыбулі вянкоў 150[255]. Як вынікае з інвентара маёнтка Русоты Гродзенскага павета (1556 г.), які належаў Юрыю Валовічу, у падклеце было: некалькі бочак квашанай капусты, бочка пастарнаку, бочка буракоў, 3 кадкі капусты з націнай (верхнімі зялёнымі лістамі. — *Л. Р.*) — для чэлядзі, 2 вянкі часнаку. Да таго ж у склепе стаялі назапашаныя 4 «ушатки» гуркоў, 7 бочак рэпы, 3 бочкі морквы[256].

Як бачна з дакументаў, даволі многа сеялі канапель у агародах. З канопляў ціснулі вельмі карыснае канаплянае масла, запасы якога на зіму ў панскіх маёнтках складалі ад 2 да 5 і болей бочак[257]. Канаплянае семя шырока ўжывалі ў ежу сяляне яшчэ ў пачатку XX ст.

У сялянскіх агародах XIX ст. па-ранейшаму значнае месца адводзілася такім агародным культурам, як буракі, капуста, морква, рэпа, цыбуля, часнок і інш.[258]. У агародах вялікія плошчы займалі сачавіца, фасоля, гарох[259]. Яны забяспечвалі харчаванне сялянскай сям'і на год, калі быў добры ўраджай. У ведамасці аб пастаўцы хлеба, гародніны і пладоў за 1849 г. па Гродзенскай губерні адзначалася, што «огородничество и садоводство не составляют промысла: крестьяне занимаются оными только для домашнего обихода»[260]. Продаж лішкаў агародніны казённымі сялянамі ажыццяўляўся ў бліжэйшых мястэчках і гарадах[261]. Аднак прадаць іх можна было толькі па мізэрнай цане таму, што кожны жыхар меў свой агарод і прадукцыю з яго.

Па дадзеных Гродзенскага губернскага статыстычнага камітэта за 1864—1897 гг., у якасці агародных культур значыліся: рэпа, буракі, морква, капуста, агуркі, сланечнік, гарчыца, мак, стручковы гарох, боб, сачавіца, аптэкарская гародніна[262]. У маёнтках пашыраліся пасевы бручкі, фасолі, сельдэрэю, шпінату, парэю, якія культываваць, на думку П. Казлоўскага, пачалі з 60—90-ых гг. XVIII ст.[263]. Аналіз актавых дакументаў паказвае, што бручка і фасоля былі вядомы беларусам яшчэ ў XVI ст.

П. Шпілеўскі пісаў, што ў агародах Міншчыны сеялі хмель, гарчыцу, каляндру, дыні і гарбузы, мяту, рэдзьку, цыбулю і часнок, салату, пятрушку, мак, спаржу, тытунь[264].

Аб складзе агародных культур можна меркаваць па сельскагаспадарчай выставе 1853 г., якая была наладжана ў Горыгорыцкім земляробчым інстытуце. У ёй прымалі ўдзел агароднікі Магілёўскай і сумежнай Смаленскай губерняў. Выстаўляліся на ёй акрамя традыцыйных культур гарбузы (па 2 пуды весам), кавуны, іспалінская кукуруза, амерыканскі, турэцкі і гавайскі тытунь, кітайскі рэвень і інш.[265].

Аналізуючы унікальную кнігу «Літоўская гаспадыня», выдадзеную ўпершыню ў 1848 г., дзе акумуляваны гаспадарча-кулінарны вопыт жыхароў Міншчыны, прыходзім да высновы, што ў першай палове XIX ст. беларусы ўжо ведалі шмат агародных культур, якія раней не сеяліся.

У асноўным агародніну ў гэты час сяляне вырошчвалі толькі для патрэб асабістай сям'і, а таму пад агароды адводзілася толькі частка сядзібы. Частка сялян асобныя агародныя культуры ўвогуле не вырошчвала, таму што лічыла гэта невыгаднай справай, а купляла іх па неабходнасці ў гарадах, мястэчках. Некаторыя ўвогуле аддавалі перавагу пасеву збожжавых, ільну і канапель на сядзібе.

Сведчанні аб пасевах розных культур у асобных даследчыкаў не супадаюць. Так, М.В. Рытаў пісаў, што ў Беларусі большую частку агарода займаюць не агародныя расліны, а каноплі і ячмень, якія, лічаць сяляне, больш карысна вырошчваць, чым агародніну. Найбольш пашыраны сярод агародніны, на яго погляд, былі капуста, агуркі, цыбуля, буракі. Зрэдку сеялі гарбузы, рэдзьку, рэпу, моркву, боб[266]. Бобу сеялася так мала, што ён лічыўся прысмакай дзяцей на працягу лета. Рытаў адзначаў, што ў часткі сялян не ха-

пала гародніны нават для сябе, у тым ліку агуркоў, гарбузоў, якія растуць толькі каля плятня, па якім уюцца[267]. Пасля яны даспяваюць на крышах. Няшмат, на яго погляд, сеялі сяляне ў XIX ст. рэдзькі і морквы і амаль не ведалі фасолі[268]. Хутчэй за ўсё, склад агародных культур у розных месцах меў свае асаблівасці і адрозненні.

Адметнай асаблівасцю сялянскіх агародаў былі змешаныя пасевы. Так, на сярэдзіне град садзілі буракі, а па баках — моркву. Па краях таксама сеялі бабы, фасолю, салат ці радыску. Варыянты змешаных пасеваў былі розныя: капуста з буракамі, буракі з агуркамі, цыбуля з морквай і інш. У Чэрыкаўскім павеце, напрыклад, сеялі ўпоперак грады па чарзе капусту і гуркі, а па краях — фасолю і буракі[269]. Трэба зазначыць, што і сёння практыкуюцца змешаныя пасевы. Ёсць у гэтым пасеве рацыянальнае зерне, бо асобныя культуры (фасоля, боб, сланечнік, тапінамбур, кроп і інш.) выконваюць ахоўную функцыю, абараняючы пасадкі ад халодных вятроў, ствараючы ў спякоту цень, а для пакручастых раслін даюць магчымасць віцца па іх сцяблінах. Вельмі яскравае ўяўленне аб агародзе першай паловы XIX ст. дае А. Міцкевіч:

За платамі — сад уперамежку
З агародам: яблыні збягалі рад за радам
З пагорка ў сухадол, і паміж імі — грады
Капусты. Качаны лабастыя пры яры...
Блішчаць залысінай, як думныя баяры,
Нібы гадаюць, што чакае ў скорым часе.
Гарошак у стручках і моркву ў апранасе
Націны кучаравай, боб у белым цвеце
У кіяхі, схаваныя ў вянку суквецця,
І гарбузы з рабымі, слізкімі бакамі,
Што грэюць жываты між градак з буракамі.

Ідуць барозны скрозь, і строгі скрозь парадак,
Радок у рад, як строй, каноплі паміж градак;
Мясцовы кіпарыс ці падабенства туі
Ад розных вусеняў гародніну вартуе,
Бо водарам яны і мошкі ап’яняюць,
І ў спёку мётламі сваімі зацяняюць
Расліны на градзе. Нат вуж і той, як знае,
Гарод, дзе п’яніць пах канопляў, абмінае.

Пляц незаценены займае мак стракаты,
Між той пярэстасці, як поўня сярод зорак,
Сланечнік галянасты з жоўтых веек-створак...
На градах папярочных
Суцэльны зараснік у косах агурочных.
Там ні кустоў, ні дрэў і аніякіх кветак —
Зялёным дыванам укрылі ўвесь палетак
Пляцёнкі-паўзункі, і кожны ў жоўтым цвеце[270]...

Сяляне кепска ведалі тэхналогію вырошчвання розных культур, а таму была неабходнасць у спецыялістах, якіх рыхтаваў Горыгорацкі земляробчы інстытут. У ім праводзіліся розныя эксперыменты, каб высветліць, што ўплывае на рост агародніны, якія ўмовы трэба ствараць для яе развіцця. У сярэдзіне XIX ст. тут агароднінай засявалі каля 3 $^1/_2$ дзесяціны[271]. Так, у 1852 г. буракі, пастэрнак і іншыя культуры з-за залішняй вільгаці выраслі дробнымі і маласакавітымі; боб, гарох патачылі чэрві; мошкі пашкодзілі каляровую капусту, бручку, кальрабі. Качанная капуста, наадварот, вырасла добрай і амаль не была пашкоджана гусенямі, якія зусім знішчылі яе ў агародах гараджан[272]. Спецыялісты вырашылі, што паўплывалі на гусеняў хутчэй за ўсё каноплі, пасаджаныя ў міжрадкоўі капусты. Дарэчы, практыка агародніцтва пацвердзіла ў далейшым станоўчы ўплыў (адпужванне розных шкодных насякомых) гэтай культуры на розныя віды гародніны. Але самы галоўны вывад, да якога прыйшлі настаўнікі і навучэнцы, гэта адсутнасць увогуле выгады пры вырошчванні гародніны, таму што затраты на пасеў і ўборку ўраджаю ў гэты неспрыяльны год не апраўдаліся. Так, выручка ад продажу гародніны (не лічачы той часткі, што з'елі выхаванцы і служачыя) склала ўсяго 120 руб. 93 кап. пры затратах у 180 руб. 2 кап.[273]. Звязана гэта было з малым коштам агародніны. Напрыклад, чвэрць буракоў ацэньвалася ў 1—1 руб. 50 кап.; морквы — 1 руб. 20 кап.; цыбулі — 1,80—2 руб. 50 кап. Сотню качаноў капусты можна было прадаць ад 80 кап. да 1 руб. 20 кап.; столькі ж гуркоў — ад 20 да 40 кап. А за пуд хмелю можна было атрымаць толькі 3 руб. срэбрам[274].

Сярод культур, якія вырошчваліся на агародах у XIX ст., па-ранейшаму важнае месца займала **капуста**, якая, на думку даследчыкаў, была вядома славянам яшчэ з V—VI стст.[275].

У панскіх маёнтках садзілі мноства гатункаў капусты: качанную (чырвоную і белую), белакачанную (раннюю, сярэднюю і познюю), каляровую, рэпную (кальрабі), ліставую. Больш за ўсё садзілі капусты позніх гатункаў, якая паспявала за 150—160 дзён. Вядомымі гатункамі ў гэты час былі: Слава, Галандская, Сабураўка і інш.[276].

У сялян капуста часта вырошчвалася на асобых участках («капусніках»)[277], якія размяшчаліся ў больш нізкіх месцах (каля рэк, непадалёку ад вёскі або ў канцы сядзібы). Асартымент яе тады быў больш вузкі. Насенне капусты і расаду сяляне часцей за ўсё куплялі ў гарадах і мястэчках, і яно, дарэчы, не вылучалася добрай якасцю, як і асабістае насенне, вырашчанае ў агародзе. Асноўным недахопам у вырошчванні капусты было не толькі няякасныя насенне і расада, але і няведанне сялянамі тэхналогіі вырошчвання, калі сеялі яе позна (у канцы мая — пачатку чэрвеня), часта рабілі загушчаныя пасадкі. У выніку качаны вырасталі велічынёй з кулак. Да таго ж сяляне недастаткова палівалі яе, бо нанасіць вады з калодзежа ці возера было вельмі цяжка. Здаралася, купленая ў нядзелю расада чакала некалькі дзён да пасадкі, вяла і таму дрэнна прымалася. Сяляне вырошчвалі гатункі капусты: «агародзінка», «ярмуш», «валошка», «галавачка»[278]. На пасеў сяляне куплялі часцей познія гатункі: Ульмскую, Вялікую Эрфуртскую[279] (якія мелі вялікую шчыльнасць качаноў), Грэчаскую пудовую, радзей — раннюю («скараспелку»), якую маглі скарыстоўваць у ежу летам. Асноўная маса капусты прызначалася для спажывання зімой.

Капуста патрабуе глебу, багатую перагноем, любіць расці на суглінках, тарфяніках, чарназёмах. Пачынае расці капуста пры 4 °С. Калі тэмпература дасягне 20—25 °С, пачынаецца інтэнсіўны яе рост. Аднак капусце патрабуецца шмат вільгаці, і найлепшыя ўраджаі атрымліваліся ў цёплае вільготнае лета. У засушлівае надвор'е капуста патрабуе частых паліваў, бо лісце ад спякоты вяне, а расліна запавольваецца ў росце. Для ўтрымання вільгаці ў глебе агароднікі апрацоўвалі глебу пад капусту на глыбіню не меней 6 вяршкоў (27 см)[280]. Восенню ў глебу ўносілі свежы гной, а вясной — перапрэлы. У залежнасці ад участка (вільготны ці сухі) капусту

сеялі градамі ці барознамі. На сырых месцах рабілі грады шырынёй каля 1 м (бывалі і вузейшыя) і да 27 см вышынёй. У сухіх месцах капусту сеялі барознамі.

Познія гатункі капусты садзілі часта на адлегласці 1 м адзін ад аднаго. А каб з большай карысцю выкарыстаць плошчу, паміж радамі садзілі раннюю бульбу, агуркі, бручку, салату, шпінат, цыбулю.

Расаду капусты вырошчвалі звычайна ў парніках («расадніках»). Распаўсюджаным спосабам пасеву ў парніку быў старажытны («у раскіданне», «у разброс»), калі насенне проста сыпалася ў глебу. Адбывалася гэта ў першай палове сакавіка, а потым, калі падрасце, патрабавалася яшчэ прарэжванне расады. Найбольш зручным лічыўся пасеў у шахматным парадку на адлегласці 7—9 см адной расліны ад другой, які дазваляў капусце добра развівацца без прарывання. Часам расада пікіравалася ў іншае месца з густога («у раскіданне») пасеву. У грады капусту высаджвалі прыкладна 25—30 мая, а то і ў пачатку чэрвеня.

Садзілі капусту, як і іншыя агародныя культуры, па традыцыі звычайна жанчыны, часам ім дапамагалі дзеці. Селянін, па словах доўгажыхароў, глядзеў на агарод як на «бабскую» справу ў гаспадарцы, а таму агародным працам і адводзілася апошняе месца. Гаспадар, па традыцыі, араў агарод, калі яго памер дазваляў, а калі не — капаў рыдлёўкай, вывозіў гной, рабіў агароджу. Часцей за ўсё агароджваўся ён толькі з боку вуліцы. Не выратоўвалася агародніна ад патравы птушкай ці скацінай у нядбайных гаспадароў з-за традыцыйна дзіравага плота, тыну ці прасла, зробленых «на хуткую руку». Таму днём патрабаваўся асобы нагляд за жывёлай і птушкай, які павінны былі ажыццяўляць дзеці на сядзібе і ў агародзе. Жанчына на працягу лета мусіла насіць вёдрамі ваду на агарод для паліву, палоць у вольныя часіны, матычыць, акучваць расліны, збіраць ураджай, перапрацоўваць агародніну, закладваць на зіму і г. д. Такім чынам, агарод і праца ў ім лічыліся нечым накшталт асабістай справы жанчыны. Традыцыя патрабавала яе найпершай працы ў полі і доме, а ў апошнюю чаргу — у агародзе.

Зямлю пад капусту ўвосень добра ўгнойвалі, заворвалі, баранавалі. Вясной зямлю баранавалі за некалькі дзён да пасеву і выбіралі пустазелле. Рыдлёўкай выкопвалі невялі-

кія ямкі глыбінёй да 8 вяршкоў[281] і 4—6 вяршкоў у квадраце, з іх выкідвалася частка верхняга слою і насыпаўся перагной, які перамешваўся з зямлёй.

Аперацыю гэту жанчыны праводзілі раніцай ці ўвечары, стараліся ў пахмурныя дні ці пасля дажджоў. Ямкі палівалі вадой, садзілі каліва капусты, каб не засыпаць яе серцавіну, і старанна прыціскалі зямлю каля сцябліны, зноў палівалі.

Пры пасадцы расады выбіраліся лепшыя, здаровыя сеянцы, якія не мелі пашкоджанняў. Перш чым пасадзіць іх, трэба было калком зрабіць паглыбленне, у якое павінны былі змясціцца карані з ніжняй часткай сцябліны. Звычайна частку (1/3) асноўнага кораня прышчыпвалі. Маладая не пераросляя расада прыжываецца хутчэй, дарослая часта хварэе. Тыповай памылкай было тое, што сялянкі не заўсёды выкарыстоўвалі калкі для ямак і, праткнуўшы зямлю ўказальным пальцам, пхалі ў невялікую дзірку капусту коранем, які не заўсёды распраўляўся поўнасцю. Таму часта расліна гінула ці доўга хварэла. Практыкавалі пасадку расады са «стулам» (з зямлёй), які асцярожна абкапвалі маленькай рыдлёўкай у выглядзе саўка. Такім спосабам выкопвалі з парнікоў расаду і для вялікіх плошчаў пасеву, складвалі ў скрыні, засланыя рагожай, каб зямля не асыпалася ад каранёў.

Капуста сеялася на расаду прыкладна за месяц да высадкі ў агародзе. Большасць сялян расаду сеялі як у адкрытым грунце на звычайных градках, якім адводзілася асобае месца ў агародзе: каля плоту, сцяны хаты, на прыгрэве, так і ў парніках і цяпліцах. У першым выпадку зямля перамешвалася з перагноем і насенне на расаду садзілі ў красавіку, калі зямля прагрэлася. Каб яна не змёрзла ў час замаразкаў, на ноч накрывалі рагожкамі, трап'ём, саломай, сухім перагноем. Асобныя сяляне практыкавалі невялікія агароджы з жардзей (накшталт парніка), якія мелі і пакрышку з матаў саломы. На сям'ю з 9 душ садзілі ад 4 да 5 град капусты і столькі ж буракоў[282].

Капуста, як і іншая гародніна, пашкоджвалася блошкамі, капусным даўганосікам, кветкаедам, мядзведкай, капуснай мухай, тлёй і інш. Сяляне ведалі толькі простыя спосабы барацьбы са шкоднікамі, якія, аднак, не заўсёды

давалі свой плён. Адным з іх з'яўляецца спосаб пасыпання попелам ці тытунёвым пылам лістоў раніцай, калі яны вільготныя ад расы. Другі звязаны са збіраннем вусеняў рукамі ў пару, калі ўжо завязваліся галоўкі качаноў. Гэтую працу нярэдка давяралі дзецям. І сёння гэты спосаб лічыцца самым лепшым і да таго ж самым экалагічным таму, што прымяненне хімічных рэчываў садзейнічае частковаму іх назапашванню ў капусце. На жаль, на вялікіх пасадках капусты сабраць гусеняў немагчыма. Даволі значную ролю ў ахове капусты ад шкоднікаў адыгрывалі птушкі, якіх было шмат і якія старанна збіралі шкоднікаў на працягу лета.

Капусту сяляне ўбіралі з агарода апошняй, калі ўжо ўсё сабрана. Звычайна гэта адбывалася ў кастрычніку ці пачатку лістапада ў ясны сонечны дзень, часта пасля нядоўгіх замаразкаў. Капусту секлі спецыяльным тапаром ці вялікім нажом прама на градцы, астаўляючы ў зямлі доўгія храпкі. Для спажывання капусты зімой у свежым выглядзе, а таксама капусты на насенне яе вырывалі з зямлі разам з каранём, абтрасалі ад зямлі і садзілі ў вільготны пясок у склепе ці падвешвалі папарна звязанымі храпкамі пад столлю на жэрдцы ў халодным памяшканні. Такія спосабы захавання капусты былі вядомы таксама рускім і ўкраінцам[283]. Захоўвалі яе і ў драўляных лабазах, абкладзеных зямлёй, дзе яна лепей вентыліравалася і таму лепей захоўвалася. Пашыраным спосабам у сялян было захаванне капусты ў ямках глыбінёй да 1 аршына.

У панскіх маёнтках у пачатку XIX ст. сеялі ліставую капусту. Насенне капусты высявалі на расаду ў красавіку, калі яна дасягала 6 лістоў, высаджвалі ў зямлю на градах у пахмурнае надвор'е на адлегласці дванаццаці цаляў. Убіралі восенню з агарода перад маразамі або пасля іх. Зрэзаную ліставую капусту захоўвалі ў халодным месцы, утыкаючы каранем ў дзіркі ў зямлі, і бралі, калі трэба. Каб атрымаць капусту, багатую лісцем, неабходна было ў палове лета выскусці сярэдзіну[284].

У панскіх агародах не рэдкасцю былі духмяныя расліны — любіста, калуфер, мята, мір, божае дрэўца (спаржа), фіміян, кмен, чабор (шчабрэц), маяран, рута. Многія мелі па некалькі градак трускалак і суніц[285]. У маёнтках вырошчвалі эстрагон, эндзівій, бядрынец, кервель, агародны чабор,

базілік, буйміну, ракамболь, шпінат, кроп, хрэн, размарын[286]. Іх загатоўвалі ў запас.

Звычайна на насенне пакідалі 15 кустоў **маярану**, астатнія ў самым росквіце зразалі і сушылі на вольным паветры ў цені, развесіўшы на вяроўках ці на печы на палатне. Высушаную траву складвалі ў драўляную ці шкляную пасудзіну, высланую паперай, і закрывалі. Падобным чынам назапашвалі і іншыя культуры.

Збіралі духмяныя расліны (капрыфоль, рэзеда, белая мірабель, апельсінавы цвет, пахучы гарошак, лаванда, мімулус[287] і інш.) ля поўдня, калі няма расы.

На Беларусі здаўна вырошчвалі **цыбулю**. Археалагічныя дадзеныя сведчаць, што яна вядома з X—XIII стст.[288]. Пісьмовыя крыніцы даюць дакладныя сведчанні аб распаўсюджанні яе ў сярэдзіне XVI ст. У XIX ст. у сялянскіх агародах вырошчвалі да 7—8 батанічных відаў, якія адрозніваліся ступенню спеласці, памерам і колерам цыбулін, а таксама формай (шарападобныя, сплюшчаныя, доўгія)[289]. У Беларусі быў пашыраны гатунак жаўтаватай рэпчатай цыбулі, вострай на смак. Садзілі яе рана вясной (у канцы красавіка — пачатку мая), зразаючы вярхушкі цыбулі для атрымання пышнай націны. Не існавала ў гэты час зімовай цыбулі — батуна[290]. Сеялі з рэпкі сярэдняга памеру для атрымання зялёнай масы і рэпкі, а таксама з сяўка («сеянчыка») і чарнушкі (сямян). Цыбуля, якая любіць суглінак з перагноем, добра расла на глебах Беларусі. Сеялі яе пасля агуркоў і капусты, часта на змешаных градах па суседству з морквай, капустай, кропам, агуркамі. Цыбуля добра ўплывае на гэтыя расліны, дзякуючы фетанцыдам, якія яна выдзяляе і якія здольны адпужваць шкоднікаў. Гэтага не маглі не заўважыць сялянкі, якія, як правіла, садзілі яе ў такім парадку. Цыбулю, як і іншыя культуры, «падкармлівалі» настоем каравяка, птушынага памёту, падсыпалі попел.

Для сялян цыбуля была важнай крыніцай вітамінаў і найбольш спажыўнай летам нароўні з агуркамі, кропам і іншымі агароднымі культурамі, з якіх рабіліся салаты. А таму сяляне вельмі даражылі ростам не толькі рэпкі, але і верхняга лісця («пер'я»). Дзяцей вучылі, каб пер'е не рвалі з сэрцавіны, а толькі па баках і пажадана з белай ніжняй часткай, каб цыбуля добра расла.

Паспявала цыбуля ў пачатку жніўня. Пер'е жаўцела, рэпка вылазіла напалову з зямлі. Калі націна (пер'е) доўга заставалася зялёнай, яе прыгіналі да зямлі рукамі. Выбіралі цыбулю ўручную, пацягнуўшы за хвосцікі кулачком; калі рвалася дрэнна — крыху падкопвалі віламі. Выбраную цыбулю сялянкі вытрымлівалі на градзе яшчэ дзень-два. Галоўнае, каб не было дажджу. Яна падсыхала і збіралася ў кашы, потым яе пераносілі ў цёплае добра праветрываемае памяшканне (у сенцы, клець, паветку) для далейшай прасушкі. Наступнымі аперацыямі былі: ачышчэнне ад верхняга шалупіння і адрыў націння да 12—13 см ад рэпкі, сартыроўка, звязванне папарна для спляцення ў вянкі і вязанкі. Прыгожыя пляцёнкі, якія ў дыяметры дасягалі 25—30 см, рабілі на Магілёўшчыне, Віцебшчыне і ў іншых месцах. У цэнтральнай Беларусі больш пашырана было вязанне цыбулі ў «коскі» (плялі ў косы як валасы), якое зусім не патрабавала адрыву батвы, і пляцёнка таму атрымоўвалася значна танчэйшай. Намі заўважана, што сяляне розных рэгіёнаў прытрымліваліся традыцыйных спосабаў пляцення для кожнай мясцовасці.

Недахоп вітамінаў узімку кампенсавалі за кошт вырошчвання зялёнай цыбулі ўзімку. Дзеля гэтага з пакулля (ачосы льну) рабілі галку, да якой ніткамі прывязвалі галоўкі цыбулі адна каля адной, каб яна нізам дакраналася да пакуля, якое намочвалася і вешалася на вяровачцы ля акна. Лепшае пер'е атрымоўвалася з «татарскай цыбулі» і «маркоўніку»[291].

Нароўні з цыбуляй на агародах вырошчваўся і **часнок**. Толькі яго садзілі значна меней. Зімовы часнок сеялі звычайна ў канцы верасня-кастрычніка (да замаразкаў) у добра ўгноеную глебу на адлегласці 10—13 см адзін ад аднаго і пры першых халадах накрывалі галлём, старызнай, свежым гноем, каб ён не вымерз. Часнок патрабуе такога ж дагляду, як і цыбуля: праполкі, падкормкі, рыхлення. Зімовы часнок у чэрвені выкідваў вялікія стрэлкі з каробачкай сямян, якія ў час трэба было выламаць, каб галоўка вырасла буйной. Гэтую працу маці даручала дзецям. Стрэлкі часнаку не выкідваліся, а крышыліся ў салаты ці, змельчаныя, залiваліся вадой і настойваліся 2—3 сутак. Потым гэтым настоем апырсквалі іншыя расліны ад шкоднікаў. Калі трэба было

аднавіць насенне часнаку, то стрэлкі не выламвалі, а завязвалі ў вузел і чакалі поўнага выспявання каробачак.

Убіралі часнок з град у розны час: зімовы — у канцы ліпеня, яравы — у жніўні. У адрозненне ад цыбулі, ён глыбей укараняецца ў зямлі, і ўборка яго робіцца справай нялёгкай. Таму, як правіла, яго падкопвалі віламі. Прасушаны і ачышчаны ад верхняга шалупіння, часнок вязалі ў вязанкі «коскамі», проста невялікімі пучкамі і вешалі на шастах каля пячы, коміна побач з вязанкамі цыбулі. Але часнок пры такім захоўванні хутка перасыхаў. Дасведчаныя гаспадыні захоўвалі яго ў памяшканнях з добрай цыркуляцыяй паветры.

**Агуркі** займалі важнае месца сярод агародных культур XIX ст. Рэдкая гаспадыня не садзіла ў сваім агародзе хаця б 2—3 шнуркі агуркоў. Асабліва добрыя іх ураджаі адзначаліся ў цёплае і вільготнае лета. Добра раслі яны на суглінках з перагноем, які часцей уносіўся восенню, а вясной пад агуркі клалі кампост. Асобныя сяляне акрамя арганічных угнаенняў карысталіся і мінеральнымі тукамі (калійнай соллю, чылійскай салетрай і інш.). У час росту агуркі некалькі разоў пасыпаліся попелам, які садзейнічаў іх росту і плоданашэнню, а таксама абараняў ад шкоднікаў і хвароб.

Садзілі агуркі на добра асветленых месцах, абароненых ад вятроў дрэвамі ці будынкамі. Непрыдатнымі лічыліся як высокія месцы, так і нізкія. Часта садзілі побач з макам[292]. Спосабаў пасеву было некалькі. Сеялі на градках як уздоўж, так і ўпоперак грады, на якой рабілі ямкі да 20 см глыбінёй і 35 шырынёй. Для атрымання больш ранніх агуркоў клалі ў ямкі кампост, перамешаны з зямлёй, ці свежы гной, а на яго насыпалася зямля. Народ лічыў: «Дзе гноем смярдзіць, там і радзіць». Пры апошнім спосабе, якім часцей карысталіся агароднікі, якія вырошчвалі агуркі на продаж, здымалі верхні слой зямлі пэўнай даўжыні і глыбіні, у яму клалі густа гной, а потым засыпалі зямлёй. Атрымоўвалася цёплая града дзякуючы пераправанню гною і выдзяленню ім цяпла.

Але большасць вясковых жанчын не ведалі такой тэхнікі і па традыцыі сеялі агуркі на звычайных градах ці ў баразнах, прарэзаных уздоўж агарода, прарошчаным ці сухім насеннем. Грады гэтыя звычайна былі памерам 105 × 35 см і

разора рабілася матыкай ці цапкай на глыбіню 4 см. У разору на адлегласці 9 см клалася семя па 2—3 штукі, якое засыпалася граблямі з краёў баразны і пакрывалася зямлёю на палец. Лічылі, што адзіночнае каліва будзе непаўнацэнным і можа загінуць, таму сеялі па 2—3 штукі запар. Калі расліны падрасталі, лішнія калівы проста прышчыпвалі ці вырывалі. Першы пасеў агуркоў рабілі каля паловы мая, другія — у канцы мая. Сяляне верылі, што найбольшы ўраджай будзе ў таго, хто пасее іх на свята Пахома: «Пасееш гуркі, калі Пахом, будзеш абіраць іх мяхом».

Агуркі — культура, вельмі адчувальная да паліву, недахоп якога значна зніжае ўраджай. «Без паліва і капуста не расце» — сцвярджала народная прымаўка. Палівалі раніцай ці ўвечары цёплай вадой, якую зараней наношвалі і налівалі ў бочкі, дзе за дзень яна саграваласся. Ведалі, што халодная вада шкодна ўздзейнічае на далікатны агурок, які мог ад яе загінуць. Разам з палівам часта сумяшчалі і падкормку перабрадзіўшым і разбаўленым вадой каравяком, птушыным памётам. На суглінках пасля паліву ўтваралася корка, а таму трэба было матычыць зямлю паміж радкамі, збіваючы пустазелле і абгортваючы сцябліны зямлёй з бакоў. Нельга было часта матычыць у засушлівае надвор'е, што яшчэ болей пазбаўляла расліны ад вільгаці. Дарэчы, пустазелле на градцы ў такое надвор'е засланяла ад спякоты і затрымлівала вільгаць. Народная прымаўка «Не бяда, што расце лебяда» якраз характарызуе гэта.

Збор гуркоў гаспадыня праводзіла раніцай. Звычайна яна, асцярожна падымаючы гурковыя «косы», шукала крэпкія, сярэдніх і вялікіх памераў агуркі і клала ў фартух («у пелену»), трымаючы левай рукой яго пярэдні край у кулацэ. Сяляне, асабліва пажылыя, любілі есці вялікія, доўгія, крыху пажаўцелыя агуркі (звычайна Вязнікаўскія і Паўлаўскія давалі такія плады)[293]. Гэтая звычка існуе да гэтай пары, і вяскоўцы сцвярджаюць, што яны больш смачныя[294]. Кожная гаспадыня прымячала на градцы першы вырасшы агурок («семяннік»), які ахоўвала ад усіх на насенне, папярэдзіўшы, каб не сарваў хто-небудзь з членаў сям'і. Ён выспяваў спачатку на градцы, а пасля поўнай уборкі — на страсе пуні. Калі «семяннікоў» на градзе было многа, гэта адмоўна адбівалася на ўраджаі, бо яны патрабавалі ад расліны шмат спажыўных рэчываў, якіх не хапала іншым пладам.

**Буракі** (стараславянскае «свекл») былі вядомы грэкам і рымлянам. У XIX ст. сеялі шмат гатункаў буракоў (ліставыя, сталовыя, кармавыя, цукровыя), насенне якіх трапляла ў продаж з Германіі, Польшчы, Расіі і інш. Лепей буракі раслі на суглініста-перагнойных глебах, непрыдатнымі былі таксама пясчаныя. У сырых месцах рабілі для пасеву высокія грады і сеялі намочаным насеннем у пачатку мая. Пасеў ажыццяўлялі «ў раскід», а таксама радамі і гнёздамі. У радках расліны садзілі на 4 см адзін ад аднаго.

Сяляне сеялі буракі простага рускага гатунку — Кажухоўскія з дробнымі каранямі, якія пасля абрэзкі націння рубіліся, як капуста, і ўжываліся, як бацвінне. Караняплод чысціўся і квасіўся для баршчу[295].

**Сельдэрэй** (seler — польск.), на думку даследчыка М.В. Рытава[296], быў вядомы славянам у V—VI стст. Быў ён ліставы і каранёвы. Вядома, што ў XIX ст. яго вырошчвалі ў панскіх маёнтках. Многім сялянам ён быў незнаёмы.

Ад палякаў была запазычана **пятрушка** (pietrus'zka, piotruziele — польск.). Вядома ліставая і карнявая пятрушка, якая сеялася пераважна ў гараджан, у маёнтках і не мела шырокага распаўсюджання ў сялян.

**Пастэрнак** («пустерняк», pasternak — польск.) з'яўляецца старажытнай культурай, першыя звесткі аб якой утрымліваюць старажытныя акты XVI ст. Ён падобны на моркву, толькі светлага колеру. Як і пятрушка, не меў распаўсюджання на сялянскіх агародах.

У XIX ст. у Беларусі паспяхова вырошчвалі белую і жоўтую **бручку**, якая вырастала за 4—4 $^1/_2$ месяца (ад пасеву насеннем). У тэхналогіі яе вырошчвання шмат агульнага з капустай. Сеялі яе ў першай палове красавіка разам з капустай у рассадніку, а ў пачатку чэрвеня высявалі ў агародзе на адлегласці 35 см[297].

Бручка сеялася на добра ўгноеных цёплых глебах (на асушаных балотах, у нізкіх вільготных месцах) і часам дасягала 1—2 кг весу, а то і болей. Яе ўбіралі з агарода разам з капустай перад маразамі, вымалі асцярожна з зямлі віламі, каб не пашкодзіць караняплод. Вялікія ўчасткі бручкі разворвалі і выбіралі рукамі. Сцябліну адразалі ад клубня, прасушвалі на вольным паветры і, як бульбу, захоўвалі ў склепах, падполлі ці ў ямцы, перасыпаючы зямлёй. Бручка была

любімай агароднінай дзяцей, хрусткая і салодкая, яна была сапраўднай прысмакай зімой.

У панскіх маёнтках сеялі **эндзівій** — салатны цыкорый. Звычайна яго садзілі ў парніку нягуста, у ліпені. Са з'яўленнем шасці лісткоў падразалі канцы карэньчыкаў і лісцікаў і высаджвалі на граду, на сонца. Эндзівій патрабаваў добрага паліву. Перад маразамі выкопвалі з глебай (для захавання на зіму), садзілі ў склепе, дзе адкрывалі вакно для праветрывання. Каб пазбавіць горычы, збіралі ўсе лісты салаты ўверх і злёгку перавязвалі лыкам. Праз дваццаць дзён яны ў сярэдзіне крыху бялелі і былі мяккімі і прыдатнымі для ежы[298].

Вядомы ў гэты час быў і **тапінамбур** («земляная груша»), які вырошчвалі на градах. Восенню частку яго збіралі і клалі ў склеп для спажывання. Аднак самым прыдатным і карысным было яго спажыванне ранняй вясной, калі яго выкопвалі з зямлі і елі свежым[299]. Для многіх ён быў крыніцай вітамінаў і карысных рэчываў. Многія сяляне ў гэты час не ведалі тапінамбур.

Яшчэ болей пашырыўся тапінамбур у пачатку XX ст., калі яго сталі садзіць на сялянскіх агародах. Сёння вядома, што гэта вельмі карысная расліна, якая ўвесну была сапраўднай крыніцай вітамінаў для селяніна, які, не ведаючы пра гэта, з асалодай спажываў яго ў салаце ці ў свежым выглядзе. Распаўсюджанню тапінамбуру спрыяла яго непераборлівасць: ён добра рос на любой глебе за выключэннем мокрай, дзесяткі гадоў на адным месцы, не патрабуючы асобага дагляду, не баючыся засухі і нават не патрабуючы спецыяльных умоў для захоўвання. Тапінамбур даваў ураджай да 30 пудоў, добра захоўваўся ў глебе і ранняй вясной выкапваўся як для асабістага спажывання, так і на корм жывёле[300]. Елі яго не толькі ў свежым выглядзе, але і вараным, і печаным.

Высокія (да 5 аршын) сцябліны таўшчынёй да дзюйма летам ішлі на корм жывёле, а адзеравянелыя восенню — на паліва[301]. Часта ён замінаў іншым раслінам з-за сваёй вышыні, таму садзіць тапінамбур сталі ў адзін рад па краях агародаў, канаплянікаў, гумен (таксама для таго, каб ён служыў жывой загараддзю). Больш таго, культуру лічылі вельмі даходнай, а «забота па уходу за ней лежала бы на

бабе без участия мужика, что отдавало бы грушу в ея полное распоряжение»[302].

У сярэдзіне XIX ст. пачалі вырошчваць **таматы** (галоўным чынам у маёнтках), з якіх гатавалі розныя стравы. Памідоры нават спрабавалі назапашваць у натуральным выглядзе. З гэтай мэтай чыстыя, выцертыя ад пылу таматы клалі ў паліваны гаршчок і, не націскаючы на іх, залівалі мяккай астужанай салёнай вадой (расол быў такі, каб сырое яйка плавала на паверхні). Пасудзіну накрывалі драўлянай талеркай, якая не давала ім усплыць наверх. Цвіль здымалася, а перад ужываннем таматы вымочвалі і прапалосквалі ў вадзе[303].

У XIX ст. на беларускіх землях, па большай частцы ў паўднёвых раёнах, вырошчвалі **кавуны** і **дыні**. Каб даўжэй захаваць іх свежымі, выбіралі не зусім спелыя кавуны і дыні, укладвалі на попел у бочку і перасыпалі сухім попелам, каб яны не дакраналіся бакоў бочкі, а зверху — яшчэ тоўсты слой попелу. Накрывалі, асмольвалі бочку і захоўвалі ў сухім халодным памяшканні альбо закопвалі ў склепе на глыбіню аднаго локця[304].

Другі спосаб захоўвання кавуноў і дыняў на зіму — засыпка іх глыбока ў жыта ў засеках або падвешанне ў склепе ў сетцы ці палатне[305]. Зялёныя дыні, якія не паспелі да восені, клалі ў гліняную пасудзіну і залівалі крута пасоленай вадой (каб у ёй плавала сырое яйка) на 5—6 дзён, затым выразалі ў іх па аднаму «рабру» і лыжкай даставалі насенне. Потым засыпалі ўнутр гарчыцу, крыху імбіру, часнаку, гваздзікі, простага перцу, мускатнага арэха. Сярэдзіна павінна была быць абсыпана поўнасцю. Потым назад устаўлялі «рабрыну», абвязвалі ніткай, клалі ў гаршчок і залівалі гарачым воцатам, а калі астыне — абвязвалі яго пузыром і захоўвалі[306].

Вялікую ролю ў харчаванні беларусаў адыгрывае **бульба**, якой адведзена значнае месца ў структуры спажывання прадуктаў.

На Беларусі бульбу пачалі вырошчваць, па словах П. Баброўскага, пры каралі польскім і вялікім князі літоўскім Аўгусце III (1736—1763)[307]. М.Улашчык лічыў, што яна з'явілася раней[308]. З самага пачатку бульба неадназначна была

ўспрынята насельніцтвам. Адны называлі яе «праклятым яблыкам», іншыя — другім хлебам.

У канцы XVIII ст. акадэмік І.І. Ляпёхін, які падарожнічаў па Беларусі, адзначаў, што ёсць тут «земляныя яблыкі (бульба), якія тут някепска родзяць і аб якіх вядома, што ў час хлебнага недароду многа служыць могуць»[309].

З 80-ых гг. XVIII ст. у агародах магнацкіх уладанняў у Паставах, Ружане, Быцені, Высокім, Дзярэчыне і іншых садзілі бульбу. Раілі садзіць яе і сялянам для таго, каб «бульба ў неўраджайныя гады спасала ад голаду бедных людзей»[310]. Аб наяўнасці вялікіх пасадак бульбы ў пачатку XIX ст. у Гродзенскай губерні сведчыў В.Севяргін[311]. Бульба, радзімай якой лічыцца Амерыка, трапіла ў Беларусь праз Еўропу.

Бульба была завезена ў Еўропу ў XVI ст.[312]. Спачатку яе лічылі шкоднай для здароўя. Праз стагоддзе з «земляных яблыкаў» рабілі муку, крупу, воцат, крухмал, гарэлку і г. д. Навучыліся еўрапейцы вырабляць з бульбянога шалупіння паперу, а з самой бульбы — клей.

Хуткае распаўсюджанне бульбы на Беларусі было звязана з адносна добрымі ўраджаямі, якія давала яна нават на малаўрадлівых глебах, а таксама з пашырэннем вінакурэння, дзе бульба паступова атрымала немалаважнае значэнне. У 60-ых гг. XIX ст. Гродзенская губерня займала першае месца ў Расійскай Імперыі па колькасці перапрацаванай на спірт бульбы[313], а ўсе беларускія губерні давалі 25 % агульнага збору бульбы ў Імперыі[314].

Бульбу садзілі ў загоны пасля асенняга і веснавога ворыва зямлі і баранавання ў полі ці на сядзібе. Вядома, што ў загоны сеялі ўжо ў XVI ст. і іншыя гародныя культуры (моркву, буракі, мак і інш.). У XIX ст. загонамі называліся палосы пахаты ці градкі. Другім спосабам была пасадка бульбы ў баразну (без веснавога ворыва). У Бешанковіцкім маёнтку Храптовіча сеялі «пад шнур»[315]. Цяпер такі спосаб называецца квадратна-гнездавым. Бульба ў той час мела шмат назваў: «бульба», «булба», «картопля», «картохля», «картофля», «курдóпа», «картошка», «бараболя» (дробная бульба), «земнякі» (польск.), многія з якіх захаваліся да нашага часу. Менавіта бульба, якую з вялікай цяжкасцю і недаверам успрымаў у XVIII ст. беларускі селянін, у XIX ст. стане важнейшай агароднай культурай, таму што сеялася яна спачатку менавіта

ў агародах. Каля сярэдзіны XIX ст. адбылася інтрадукцыя яе на поле. Пашырэнне пасадак звязана з тым, што бульба часта давала большы прыбытак, чым збожжавыя, а таму была «большим пособием в продовольствии»[316]. А народ усведамляў, што «бульба хлебу падмога».

Бульбу ў першай палове XIX ст. садзілі ў невялікай колькасці, галоўным чынам для асабістага спажывання[317]. У вялікіх плошчах пасеву не было патрэбы таму, што сяляне амаль не выкарыстоўвалі яе на корм скаціне, як гэта адбылося пазней. Ды і на продаж агародніны (у тым ліку і бульбы) ішло з сялянскіх гаспадарак вельмі мала, за выключэннем гарадоў і прыгарадаў, дзе сяляне без цяжкасці маглі знайсці збыт прадукцыі. Мала ведалі яны пра аграномію гэтай культуры.

Важнасць пашырэння пасеваў бульбы ў сялянскіх гаспадарках усведамляў царскі ўрад яшчэ ў першай палове XIX ст. У 1835 г. начальнікам губерняў было паслана «наставление», у якім паміж іншым указвалася на важнасць увядзення чацвёртага поля пад бульбу ў казённых сялян за кошт расчысткі лясоў, асушкі балот[318] і г. д. Да гэтага падштурхоўвалі недароды хлеба, а таму сялян, якія разводзілі бульбу не толькі на агародах, але і ў полі, заахвочвалі грашовымі ўзнагародамі і медалямі[319]. Прадпрымаліся захады па атрыманню імі агранамічных ведаў.

У 1841 г. у Санкт-Пецярбургу была выдадзена брашура «Краткое наставление о посеве, уборке и хранении картофеля, составленное по высочайшему повелению в третьем департаменте государственных имуществ». У ёй падрабязна распавядалася, як сеяць бульбу, які і калі ўносіць гной, якое патрэбна насенне, як лепей яе ўбіраць і захоўваць. У якасці ўгнаенняў раілі выкарыстоўваць тое, што было дасягальным для хлебароба: гной, сумесь птушынага памёту ці драўляных апілак з попелам, або попелу з паташом; сумесь гною з рэшткамі адыходаў мылаварняў, гарбарных заводаў, глей з сажалак, мох[320].

Аўтары брашуры прапаноўвалі адбіраць на насенне самыя спелыя і буйныя бульбіны, а калі іх няма, то дробную бульбу трэба было сеяць па дзве разам[321]. Цікава, што калі сцябліны выраслі да 2—3 вяршкоў, то на кусце раілі астаўляць па 1—2 сцябліны, астатнія рэкамендавалася зразаць.

Садзілі бульбу ў барозны на 7 вяршкоў адну ад адной да таго боку, ад якога аралі зямлю, каб наступны пласт закрываў бульбу на 1 $^{1}/_{2}$, але не болей, чым на 2,5 вяршка[322].

У Горыгорыцкім сельскагаспадарчым інстытуце праводзілі эксперыменты па павелічэнню ўраджаю бульбы. Так, у адным эксперыменце (1852 г.) было выяўлена, што выпрабаваная ў расоле бульба (тая, што не ўсплыла) дае лепшы ўраджай[323]. Да таго ж навукоўцы заўважалі, што сяляне, якія атрымлівалі неблагія ўраджаі, заграбалі гной у барозны, а аралі пераважна загонамі. На раўніне гэта было апраўдана, таму што на лёгкіх глебах ворыва «в гребешок» выдувала зямлю ветрам[324].

Большае распаўсюджанне бульба атрымала ў 40-ых гг. XIX ст. Сярод гатункаў бульбы былі вядомы: Шасцітыднёвы, Маржалена, Каралеўскі, Альфа, Спаржавы, Ранні розавы[325]. Бульба прыжылася на Беларусі дзякуючы сваёй непатрабавальнасці да глебы. Яна расце на добра ўгноеных пясчаных суглінках і гліністых супесях, мергельных суглінках. Бульба патрабавальная да вільгаці, але мокрых месцаў не любіць, як не любіць свежага гною, ад якога расце вялікае націнне. Найбольш добрым часам для пасеву лічылі дні перад апошнім майскім замаразкам.

У агародах практыкавалі пасадку бульбы на градках у шахматным парадку (35 × 35 см). Рабілі ямку глыбінёй у 1 вяршок і засыпалі бульбу зверху цапкай ці матыкай. У агародзе бульба расла лепей, чым на полі, з-за абароненасці ад вятроў, большай магчымасці яе дагляду і своечасовай апрацоўкі. Градкі капалі рыдлёўкай, садзілі бульбу, потым баранавалі зямлю граблямі. Акучвалі яе звычайнай матыкай або рыдлёўкай, каб не пашкодзіць каранёў. Садзілі ў агародзе раней, чым у полі (часам на 2 тыдні), што дазваляла мець больш ранні ўраджай бульбы. Добра расла бульба пасля лубіну і бабовых, зніжаўся ўраджай з-за хвароб. У XIX ст. былі вядомы такія хваробы бульбы, як белая гніль, парша і інш.

У канцы XIX ст., па словах М. Рытава, існавалі мясцовыя гатункі бульбы: дробны чырвоны з сіневатай скурай і дробны белы. Раннія гатункі сяляне не культывавалі[326]. П. Шпілеўскі яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. бачыў на агародах Мінскага краю бульбу белую, жоўтую, чырвоную, залацістага колеру розных памераў. Асабліва смачнай ён прызнаваў «стокротку» — маленькую бульбу[327].

Бульбу ў агародах садзілі і пад саху. Пры пасеве бульбы адну баразну сеялі і дзве праганялі пустыя[328]. Каб конь ішоў роўна і не забіраў убок, вадзіў яго хлопчык, трымаючыся за аброць. Работа гэта была нялёгкай: патрабавала паспяваць за канём і ўвесь час сцерагчыся, каб ён не патрапіў на нагу капытом. Дарэчы і зараз, дзе ўспашка зямлі адбываецца канём, водзяць яго па полю звычайна хлопчыкі. Праз 3—4 тыдні, калі на глебе актыўна прабіваліся пустазелле і ледзьледзь бульба, агарод баранавалі. Калі гэта адбывалася ў добрае сонечнае надвор'е, пустазелле хутка падсыхала і гінула. Бульбу акучвалі ў далейшым звычайна два разы, а некаторыя — і болей.

Вядома, што найперш гной клалі на агарод і пад пасевы бульбы. Бульба, якая паступова стала для селяніна другім хлебам, патрабавала найбольшага дагляду, а таму зямля пад яе ўгнойвалася штогод і як мага лепей. Да таго ж пад пасевы выбіралі лепшую зямлю. У маёнтку Русінавічы ў 1879 г., па падліках М.Улашчыка, на дзесяціну вывозілася да 100—180 вазоў гною, адзін воз якога важыў каля 20 пудоў[329]. Спачатку гной скідвалі з вазоў у невялікія кучкі на невялікай адлегласці па ўсяму ўчастку, пасля растрасалі з дапамогай віл па ўсёй плошчы, каб ён больш-менш раўнамерна трапіў пад кожную расліну. Папярэдняй культурай, пасля якой садзілі бульбу, звычайна былі пшаніца ці жыта. На дзесяціну садзілі 90 пудоў бульбы, а збіралі ў 20 разоў болей — 1800[330]. Сярэдні гаспадар меў ураджай прыкладна 2000 пудоў[331]. У народзе лічылі, што трэба трымацца прыдатных тэрмінаў пасадкі бульбы: «Пасееш за пагоду — больш прыходу». І раілі не спазняцца з сяўбой: «Хто картошкі пасадзіць прад Міколай, будзіць з картошкай». Да пасеву многіх культур адносіліся народныя словы: «Хто сее рана, той насенне не губляе».

Для ўгнаення глебы пад бульбу выкарыстоўвалі авечы, конскі, кароўскі, свіны гной, птушыны памёт, жыжу, торф, кампост, попел. Вядома, што прэлы гной, у якім працягвалася гніенне і выдзялялася цяпло, патрабуецца халоднай і сырой глебе, дзе дзейнічаюць бактэрыі аміячнага бражэння, а аміяк паглынаецца паветрам глебы, вадой з зямлёй і лепей засвойваецца каранямі раслін. А для гэтага патрэбна добрая аэрацыя глебы, якая дасягаецца рыхленнем. Сяляне,

назапашваючы вопыт вырошчвання бульбы, стараліся выкарыстоўваць перапрэлы гной, некалькі разоў за лета рыхліць зямлю.

Прыдатнай для ўборкі лічылі бульбу, у якой сцябліна пачала жаўцець, а выкапаная бульба лёгка страсалася з куста: «Націна пасохла — пара капаць картоплю». Яшчэ да поўнай ўборкі бульбы сяляне «падшчупвалі» яе, дастаючы рукамі пры абмацаванні каранёў найбольш буйныя клубні для спажывання ўлетку. Цікава, што такі спосаб нашы продкі ведалі яшчэ ў сярэдзіне XIX ст.[332], а магчыма, і раней. Яго і сёння выкарыстоўваюць агароднікі.

Для ўборкі бульбы выбіралі сухое надвор'е, бо вырытая сахой ці плугам бульба павінна была прасохнуць, перш чым трапіць у склеп, падполле ці капец. У адваротным выпадку яна будзе гніць. Выкопвалі яе з зямлі на агародзе звычайна жанчыны. Вядомая прымаўка сцвярджала: «Гарод любіць гарбатую бабу». Пры ручной уборцы выкарыстоўваліся рыдлёўкі і вілы. Выкінутыя на паверхню кусты жанчыны бралі за бульбоўнік («бульбашнік», «цяўнік», «картафлянік», «бульбавенне», «бульбянік», «нацiна», «бадыллё», «гіччаннік»)[333], моцна страсалі бульбіны, а тыя, што засталіся, адрывалі ад бульбоўніка і збіралі ў кошыкі. Ссыпалі ў кучы на краю агарода бліжэй да хаты, пасля сартыравалі, адбіраючы пашкоджаныя клубні ў асобныя скрыні ці кошыкі і адкідваючы гнілыя. У капу складвалі насенны матэрыял — сярэдняга памеру бульбіны без пашкоджанняў.

Аналізуючы вопыт пасадкі бульбы сярэдзіны XIX ст., заўважаеш, што асноўныя спосабы дайшлі да нас без істотных змен. У гэтым сказваецца прыхільнасць беларусаў да традыцый. У асобных раёнах Палесся бульбу да гэтага часу выкопваюць уручную з дапамогай спецыяльнай «капушкі», якая нагадвае руку з сагнутымі пальцамі або маленькую лапату. Глеба там не патрабуе разгону плугам, і бульба лёгка выкопваецца з дапамогай простага прыстасавання. Універсальнасць і карыснасць прыёму ў тым, што бульба не пашкоджваецца, а таму лепей захоўваецца.

Акрамя асабістых намаганняў сялян ураджайнасць бульбы залежала ад аб'ектыўных фактараў. Нягледзячы на тое што ўрад прымаў захады па распаўсюджанню пасеваў бульбы, якая дазваляла селяніну мець добры харч, рабіць з яе

муку, крухмал, патаку і корм для скаціны, не ўсё складвалася так, як меркавалася. Так, у 1845 г., згодна з паведамленнем Віленскай губернскай камісіі народнага харчавання, у паветах была пасаджана толькі трэцяя частка плануемых пасеваў бульбы з-за таго, што яна часткова памерзла ў ямах, а тая, што падмерзла, дрэнна развівалася[334]. На ўраджай гародніны і бульбы ў Слонімскім павеце, напрыклад, паўплывала сухое надвор'е вясной[335]. Тым не меней у Мінскай губерні ўраджай бульбы быў сярэдні, а ў Бельскім і Пружанскім паветах — добры[336].

У беларусаў, як ужо адзначалася, здаўна вядомы некалькі спосабаў пасадкі бульбы: «у загоны», «у баразну», «у рады», «пад шнур» і інш. Найбольш пашыраным сёння застаецца пасадка яе бароздамі. На працягу двух стагоддзяў выпрацаваны вопыт вырошчвання бульбы, а таксама розныя спосабы ворыва глебы пад бульбу. Першы з іх называецца ворыва «ў склад», калі араты пачынаў першую баразну роўна з цэнтра ўчастка, прызначанага пад бульбу. На наступнай баразне ён адварочваў плугам пласт зямлі насустрач першай баразне, і так працягвалася па кругу, пакуль ворыва дасягне канцоў участка. Другі спосаб — «у роскідзь» («у раскідку»). Ворыва такім спосабам пачыналася з канцоў участка і заканчвалася ў сярэдзіне, дзе атрымлівалася вялікая разора. З мэтай эканомнага выкарыстання зямлі ў ёй часта садзілі гародніну (буракі, фасолю, гарбузы, боб і інш.)[337].

Калі ўчастак упіраўся ў хлеў ці плот, перад імі араты рабіў папярочныя барозны, бо конь не мог дасягнуць канца баразны. Як і ў мінулым, звычайна бульбу паўсюдна садзяць праз адну баразну, астаўляючы адну пустой. Асобныя сеюць адразу па дзве баразны побач, а пустой астаўляюць кожную трэцюю баразну. Спосабаў пасадкі бульбы таксама некалькі. Самыя пашыраныя, калі яе кладуць у баразну збоку, на сярэдзіну ці на дно баразны. З кошыка бяруць бульбіны і кладуць на прыкладна роўнай адлегласці (25—30 см) адна ад адной. Пашыранай памылкай сялян была глыбокая ралля і глыбока пасаджаная бульба, якая доўга не ўзыходзіла.

Традыцыйна сяляне перад пасевам выграбаюць бульбу са скляпоў, падполля і іншых памяшканняў непасрэдна перад пасадкай. Гэта зніжае яе ўрадлівасць, бо бульба патрабуе

прагрэву ў даволі цёплым месцы не меней трох тыдняў. У выніку «яравізацыі» на бульбінах з'яўляюцца маленькія зялёныя парасткі. Трапіўшы ў глебу, такая бульба хутка прарастае і набірае моц. Сёння большасць дачнікаў, якія ведаюць, як правіла, прагрэсіўныя метады вырошчвання бульбы, скарыстоўвае гэты метад яравізацыі.

Трэба адзначыць, што асобныя сяляне яшчэ ў XIX ст. разам з бульбай клалі ў баразну боб. Пры гэтым добрым атрымліваўся ўраджай абодвух культур. Пра сумесныя пасевы бобу і бульбы ў XX ст. паведамлялі інфарматары ў розных месцах Беларусі.

Старажылы з в. Забалацце Чавускага раёна Магілёўскай вобласці паведамілі пра спосаб пасадкі бульбы, які меў мясцовую назву «пад шапку»[338]. Гэты спосаб больш працаёмкі і выкарыстоўваўся ў гаспадарцы, дзе гною было мала. Таму адзін працуючы кідаў бульбіну ў баразну, а другі ішоў следам і рукой зверху на яе клаў гной («шапку»), далей араты плугам засыпаў баразну.

Калі з'яўляліся ўсходы і бачны былі радкі, бульбу акучвалі («абганялі», «падганялі») плугам, а пасля баранавалі ўздоўж радкоў і ўпоперак. Гэта стымулявала дадатковы рост каранёў бульбы і пазбаўляла ад пустазелля, якое ўзнімалася разам з ёй. Другое акучванне праводзілі да цвіцення (калі бульбоўнік дасягне не меней 20—25 см у вышыню). Пасля другога акучвання бульбу абавязкова «падглядалі» (вызвалялі засыпаныя вярхушкі бульбоўніка ад зямлі, каб не згнілі). Гэта тыповая памылка, бо акучванне нават усёй расліны спрыяе росту дадатковых каранёў. Звычайна акучвалі 2 разы, асобныя — 3. Абганялі бульбу ў XIX ст. бясколавым плужком, у які запрагалі каня. За дзень араты мог абагнаць каля дзесяціны[339].

Невялікія пасадкі бульбы на агародзе рабілі звычайна пад рыдлёўку, а акучвалі з дапамогай матыкі. Гэтыя старажытныя прылады працы і зараз выкарыстоўваюцца ў розных агародных работах як у сялян, дачнікаў, так і ў гараджан. Толькі рыдлёўкі, вілы, граблі, матыкі зараз зроблены з жалеза, раней (яшчэ і ў пачатку XX ст.) правобразам іх былі драўляныя з металічнымі насадкамі ці акутыя жалезам знізу[340].

Перад копкай бульбоўнік касілі касой ці жалі сярпом, сушылі яго на плоце, азяродзе ці скармлівалі скаціне, скідвалі ў кампостныя ямы і г. д. Захоўвалі бульбу ў сухіх скляпах, падполлі, ямах, кучах, пакрытых саломай і зямлёй.

Разганялі бульбу плугам, праходзячы па адным радзе, аралі на адзін бок, а, вяртаючыся, другі рад выварочвалі на процілеглы бок. Існавалі спосабы ворыва: праз адну і праз дзве баразны. Пры ўсіх спосабах разгону бульбы частка яе заставалася ў зямлі, а таму бульбянішча скарадзілі, падбіраючы рэшткі бульбы, а пасля яшчэ раз пераганялі. Дзеці і падлеткі, як правіла, збіралі яе, практычна не астаўлялі ніводнай бульбіны, што адпавядала ашчаднаму стаўленню беларусаў да ўсяго, што здабывалася нялёгкай працай.

Уборка бульбы лічылася сур'ёзным заняткам і па большай частцы жаночай справай. Збіралі яе звычайна жанчыны і дзеці. Спецыяльна прыязджалі родныя, прыходзілі дапамагаць суседзі, часам збіралася «талака». Пасля збору мяшкі з бульбай пераносілі бліжэй да дому, ссыпалі бульбу ў кучу, прасушвалі і «парабіралі» (сартыравалі). Збіралі бульбу ў плеценыя кошыкі ў паўформе паўшара з лазы ці яловых каранёў. На Беларусі здаўна лічылі, што трэба выбіраць бульбу ўручную, каб яе не пашкодзіць. Гэта была цяжкая праца, калі, сагнуўшыся, цэлы дзень трэба збіраць, насіць цяжкія кошыкі да мяшка ці кучы. Крыху лепей было працаваць у добрае сонечнае надвор'е.

У непагадзь праца павялічвалася, бо трэба было насіць бульбу пад павець ці ў пуню, дзе яе прасушвалі, перш чым запасаць на зіму. Выбіралі бульбу звычайна голымі рукамі, здзіраючы каля пазногцяў скуру. Зямля забівалася ў пазногці, і доўгі час іх нельга было адмыць.

Трэба дадаць, што ўборку плугам праводзілі не ўсюды, а там, дзе была цвёрдай зямля. У раёнах Палесся, цэнтральнай Беларусі (напрыклад, у Слуцкім р-не) бульбу традыцыйна капаюць спецыяльнымі «капачкамі» ўручную. Такі спосаб лёгка ажыццявіць, дзякуючы мяккай і рассыпістай глебе.

Паўсюдна пасля копкі бульбы ўчастак пераганяюць плугам, барануюць і збіраюць рэшткі бульбы. Калі праца з уборкай бульбы падыходзіла к канцу, па традыцыі гаспадыня рыхтавала пачастунак з гарэлкай і ўсе ўдзельнікі збіраліся на так званыя «дакопкі» («абкопкі», «укопкі», «дабіркі»)[341]. Спявалі песні, частаваліся, радаваліся добраму ўраджаю.



Выпись изъ крѣпостной Минскаго Нотаріальнаго Архива книги по Минскому уѣзду за 1897 года за № 2

Стр. 207-212 № 40

АКТОВАЯ БУМАГА СВЫШЕ 4500 ДО 6000 РУБ. СЕР. ДВАДЦАТЬ РУБЛЕЙ ТРИДЦАТЬ КОПѢЕКЪ

Тысяча восемьсотъ девяносто седьмаго года Апрѣля двадцать пятаго дня, явились къ Ивану Казимировичу Боричевскому, Минскому Нотаріусу, въ контору его въ Минскѣ, первой части, по Соборной площади, въ домѣ Ляховскихъ, лично ему извѣстные и имѣющіе законную правоспособность къ совершенію актовъ: дворянинъ Богуславъ-Эразмовичъ Рошковскій и крестьянинъ Юрій Николаевъ Чуприсъ, жительствующіе: первый въ городѣ Минскѣ, по Захарьевской улицѣ въ домѣ Манцевича и второй въ деревнѣ Галимцы, Ивенецкой волости, Минскаго уѣзда, въ сопровожденіи лично ему извѣстныхъ свидѣтелей, дворянъ: Ивана Антонова Триковскаго и Нарциса Іосифова Патковскаго и мѣщанина Виктора Іосифова Абрамова, жительствующихъ въ Минскѣ: первый по Бѣлоцерковной улицѣ, въ домѣ Морозевича, второй по Старо-Виленской, въ домѣ Яковлева и третій по Торговой въ домѣ Топельсона, съ объявленіемъ, что они совершаютъ купчую крѣпость на слѣдующихъ условіяхъ: дворянинъ Богуславъ Эразмовичъ Рошковскій изъ собственно принадлежащаго ему недвижимаго имѣнія - фольварка Іозефинъ, съ землею за деревнею Бобровниками, Минской губерніи, въ Минскомъ уѣздѣ, доставшагося ему по раздѣльному акту съ прочими сонаслѣдниками дворянина Эразма Вильгельмова Рошковскаго: Мечиславомъ, Іосифомъ-Вильгельмомъ, Александромъ, Эразмомъ-Станиславомъ и Августомъ Рошковскими, Антониною и Владиславомъ-Тибурціанами Цѣхановичами-Левковичами и Адвигою и Бро-

Отмѣчено въ реестрѣ крѣп. дѣлъ № 2 стр. 584 подъ № 93

И. Д. Старшаго Нотаріуса

№ 1759 - 1897 года

1

1. Дагавор куплі-продажу 41 дзесяціны зямлі з мельніцай селянінам М.Ю. Чупрысам у шляхціца Б.Э. Рашкоўскага за 5 тысяч 600 рублёў серабром у 1897 г.

ничавомъ Зубравскими, утвержденному Старшимъ Нотаріусомъ Минскаго Окружнаго Суда двадцать седьмаго Сентября тысяча восемьсотъ девяносто пятаго года, отмѣченному въ реестрѣ крѣпостныхъ дѣлъ №второй, части пятой, страница двадцать седьмая и по вводу во владѣніе, совершенному Судебнымъ Приставомъ того Суда Лонгиновымъ пятаго Ноября того-же года продалъ крестьянину Юрію Николаеву Чупрису участокъ земли называемый, по мѣстному названію, усадьба „Бобровники" пространствомъ сорокъ одна десятина тысяча двѣсти квадратныхъ саженей, съ находящеюся на немъ мельницею оцѣниваемою по десятилѣтней сложности годоваго дохода въ сто рублей, всѣми постройками и лѣсомъ, въ границахъ, какъ значится на выкопировкѣ съ плана, составленнаго въ тысяча восемьсотъ девяносто первомъ году землемѣромъ Николаемъ Пржелясковскимъ, сторонами подписанной и врученной покупщику: землею крестьянъ деревни Бобровники, имѣніемъ Ротинцы Бужинскаго, усадьбою Жуковщизна и Бобровники Уласевича и Пучко, землею крестьянъ деревни Судники и имѣніемъ Прильники Графини Меджоховской. Продажа сія учинена: со всѣми водами, лѣсами, со всѣми по продаваемому участку обязательствами и законными исками какіе нынѣ состоятъ и вперёдъ открыться могутъ и съ переводомъ на покупщика долга Виленскому Земельному Банку, слѣдующаго на продаваемомъ участкѣ, по залогу въ ономъ имѣнія Іозефинъ по свидѣтельству Минскаго Нотаріальнаго Архива отъ девятнадцатаго Декабря тысяча восемьсотъ девяносто пятаго года за № тринадцать тысячъ восемьсотъ одиннадцатымъ, въ суммѣ трехъ тысячъ рублей, въ остальномъ къ первому Іюля тысяча восемьсотъ девяносто седьмаго года количествѣ въ суммѣ двѣ тысячи девятьсотъ семьдесятъ шесть рублей девяносто девять копѣекъ, съ обязательствомъ уплачивать Банку за каждое полугодіе, не позже тридцатаго Іюня и тридцать перваго Декабря каждаго года отъ первоначальной суммы займа трехъ тысячъ рублей по восемьдесятъ два рубля пятьдесятъ копѣекъ и со всѣми прочими Банкомъ обязательствами; расходы по совершенію сей купчей платитъ продавецъ. А взялъ продавецъ Рогиков-

скій съ покупщика Чуприса за продаваемое имущество съ мельницею всего денегъ пять тысячъ шестьсотъ рублей серебромъ включая въ эту сумму и переводимый на него долгъ Виленскому Земельному Банку. А какъ до сей купчей крѣпости имущество это никому не продано, не заложено, въ аренду не сдано и ни въ какія крѣпости не укрѣплено, въ споръ и подъ запрещеніемъ, кромѣ за долгъ сказанному банку, не состоитъ, то если кто въ оное станетъ вступаться продавецъ и наслѣдники его обязаны покупщика и его наслѣдниковъ, очищать, какъ слѣдуетъ, по законамъ Ст. 64 прилож. къ ст. 708 Х т. ч. I изд. 1887 года и 205 т. V уст. о пошл. сторонамъ объявлены. Для совершенія сего акта были представлены вышеозначенная раздѣльная запись въ выписи съ надписью о вводѣ и извѣщеніе канцеляріи Минскаго Губернатора отъ седьмого Марта сего года за № двѣ тысячи двѣсти двадцать девятымъ о разрѣшеніи Чупрису этой покупки и имѣлось въ виду разрѣшеніе Правленія Виленскаго Земельнаго Банка отъ четвертаго Февраля сего-же года за № двѣ тысячи сто восемьдесятъ четвертымъ на эту продажу. Актъ сей, совершенный Минскимъ Нотаріусомъ Боричевскимъ утвержденъ Старшимъ Нотаріусомъ Минскаго Окружнаго Суда шестнадцатаго Мая тысяча восемьсотъ девяносто седьмаго года при чемъ взыскано пошлинъ: актовыхъ три рубля, на запрещеніе три рубля, на публикацію три рубля и за выпись шестьдесятъ копѣекъ и опредѣлено главную выпись выдать на гербовомъ листѣ въ двадцать рублей тридцать копѣекъ Дворянину Болеславу Эразмовичу Рошковскому. Крѣпостныя пошлины, на основ. 3 п. 191 ст. V т. Уст. Пошл. изд. 1893 г. не взысканы. Въ семъ актѣ на двѣсти двѣнадцатой страницѣ надписаннымъ словамъ „на запрещеніе три рубля" и поправленному слову на двѣсти восьмой страницѣ „раздѣльн" ому вѣрить. И. д. Старшаго Нотаріуса Калнозинъ. -

Выпись эта, слово въ слово сходная съ актомъ внесеннымъ въ крѣпостную книгу записана въ реестръ 1897 года подъ № 595 и


дана дворянину Болеславу Эразмову Рачковско-му Мая 31 дня 1897 года. Въ сей выписи поправлен-ному на второй страницѣ «тысяча» - вѣрно.

И.Д. СТАРШАГО НОТАРІУСА [signature]






2. Планіроўка сядзіб з агародам (па матэрыялах этнаграфічных экспедыцый. Малюнкі С.Ц. Гунько):

а) планіроўка сядзібы; в. Кацёлкі Пружанскага р-на Брэсцкай вобл. 1968 г.

б) планіроўка сядзібы; в. Міхасельцы Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. 1968 г.

в) планіроўка сядзібы; в. Арэхава Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл. 1968 г.

г) планіроўка сядзібы; в. Сакі Жабінкаўскага р-на Брэсцкай вобл. 1965 г.

д) планіроўка сядзібы; в. Хрышчановічы Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл. 1968 г.

е) планіроўка сялянскай сядзібы; в. Маладушша Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл. 1965 г.

ё) планіроўка сядзібы; в. Міхасельцы Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. 1967 г.

ж) сялянская сядзіба; в. Брусы Мядзельскага р-на Мінскай вобл. 1967 г.

з) планіроўка сядзібы; в. Хрышчановічы Свіслацкага р-на Гродзенскай вобл. 1968 г.


а


б


в


г


д


е




ё


ж


з


і


к


л


м


н

3. Віды агароджы (па матэрыялах этнаграфічных экспедыцый. Малюнкі С.Ц. Гунько)

а) плот з жэрдак і слупоў; в. Брусы Мядзельскага р-на Мінскай вобл. 1967 г.

б) старажытны плот з броўнай закідны на шулах; в. Малі Астравецкага р-на Гродзенскай вобл. 1967 г.

в) старажытныя вароты (шырыня — 2 м, вышыня — 2,5 м) на шулах з крышай і форткай (выгляд з двара) і плот з дошак; в. Новыя Грамыкі Веткаўскага р-на Гомельскай вобл. 1965 г.

г) «прясла» (вышыня — 1,5 м) з прамежкамі паміж калкамі (2 м), вязанымі; в. Рыскоў Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. 1965 г.

д) «плот» з жэрдак; в. Брусы Мядзельскага р-на Мінскай вобл. 1967 г.

е) «забор» з «крышкай», фортка і вароты; в. Лучын Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.

ё) «забор» закідны на шулах; в. Новыя Грамыкі Веткаўскага р-на Гомельскай вобл.

ж) «замёт», вароты і калітка з «крышкай» з жэсці; в. Ляды Смалявіцкага р-на Мінскай вобл. 1966 г.

з) вароты з «форткай» (шырыня — 2,5 м, вышыня — 3 м) на шулах (2 м) і забор з калкоў; в. Навасёлкі Капаткевіцкага р-на Гомельскай вобл. 1961 г.

і) «забор» з варотамі (шырыня — 2,5 м, вышыня — 1,5 м) і калодзезь; в. Ельча Брагінскага р-на Гомельскай вобл. 1965 г.

к) «пляцень»; в. Новыя Грамыкі Веткаўскага р-на Гомельскай вобл. 1965 г.

л) старажытны «баркан»; в. Малышава Давыд-Гарадоцкага р-на Брэсцкай вобл. 1954 г.

м) вароты з дошак, калітка ў старажытным закідным плоце з броўнаў; в. Дзяніскавічы Крупскага р-на Мінскай вобл. 1967 г.

н) «частакол», плецены лазой, і фортка, «забор» дашчаты; в. Газень Брагінскага р-на Гомельскай вобл. 1965 г.













4. «Пляцень»; в. Вялікі Малішэў Столінскага р-на Брэсцкай вобл. 1966 г.

5. Плот і вароты; в. Дарашэвічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. 1966 г.

6. «Пляцень»; в. Канатоп Нараўлянскага р-на Гомельскай вобл. 1966 г.

7. «Забор» з калкоў і «леска»; в. Дарашэвічы Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. 1966 г.


а
б
в
г
д
е
ё
8
ж
з




8. Разнавіднасці кошыкаў для пераноскі агародніны. Малюнкі С.Ц. Гунько

а) плеценая лазовая «карзіна» для пераноскі агародніны і травы; в. Гарбавічы Чавускага р-на Магілёўскай вобл. 1955 г.

б) «кіш» (кош) з лазы (дыяметр — 60 см, шырыня — 30 см); в. Махро Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. (цяпер — у Іванаўскім р-не). 1963 г.

в) плеценая з лазы «карзіна» (дыяметр — 48 см); в. Закаблукі Мінскага р-на Мінскай вобл. 1960 г.

г) «кошык», плецены з лазы (шырыня — 90 см, вышыня — 20 см); в. Акропна Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. 1963 г.

д) плеценыя з лазы «кошыкі» для агародніны і садавіны; в. Брынёва Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. 1961 г.

е) «кош», плецены з лазы, для бульбы; в. Рыскоў Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. 1965 г.

ё) «кошык», плецены з хваёвых карэнняў (дыяметр — 33 см); в. Аляксеевічы Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. 1963 г.

ж) «кошык», плецены з лазы, для пераноскі бульбы; в. Верні Камянецкага р-на Брэсцкай вобл. 1963 г.

з) «кошык» з ручкамі з лазы (верхні дыяметр — 50 см, ніжні — 30 см, вышыня — 30 см); в. Ёлча Брагінскага р-на Гомельскай вобл. 1965 г.

і) лазовы «кош»; в. Івінск Чашніцкага р-на Віцебскай вобл. 1959 г.

к) «карзіна», плеценая з лазы, для збору і пераноскі бульбы і інш. агародніны. Ручкі з вітай вяроўкі; Проскурні Жлобінскага р-на Гомельскай вобл. 1965 г.

л) «кош» для возкі бульбы, мера 5 ц; в. Чэмерысы Брагінскага р-на Гомельскай вобл. 1961 г.

м) «кош» для збірання і пераноскі бульбы (дыяметр — 60 см, вышыня — 30 см); в. Міхееўка Чачэрскага р-на Гомельскай вобл. 1965 г.

н) «карзінка» з лазы для пераноскі торфу і агародніны (дыяметр — 70 см, вышыня — 30 см); в. Плёсы Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. 1962 г.




9. Сялянка в. Альшаны Столінскага р-на каля грады з тытунём. 1953 г. Фота І. Аксельрода




10. Вілы для капання бульбы (амерыканскія, нямецкія)
(Рытов М.В. Частное огородничество. М., 1927 г. С. 260.)



11. Драўляная плеценая барана; в. Ліпск Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл. 1968 г.

12. Ручныя прылады працы на агародзе (па матэрыялах этнаграфічных экспедыцый. Малюнкі С.Ц. Гунько)

а) крук драўляны для скідання гною; в. Вялікі Бокаў Мазырскага р-на Гомельскай вобл. 1966 г.

б) жалезная «драчка» для праполкі травы; в. Бароўка Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. 1955 г.






в) кірка; в. Дзяготкі Полацкага р-на Віцебскай вобл. 1966 г.
г) «кацубка» жалезная з драўлянай ручкай для выграбання з печы вугалля; в. Акропна Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. 1963 г.
д) «землямер» (даўжыня — 2 м); в. Брынёва Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл. 1961 г.
е) «крук» жалезны (12х13 см) з драўлянай ручкай (2 м); в. Балашы Свірскага р-на Віцебскай вобл. 1954 г.
ё) «крук» (12 х 10 см) для скідання гною з ручкай (1 м); в. Дуброва Асвейскага р-на Віцебскай вобл. 1954 г.
ж) «крук» жалезны (15 х 23 см) з ручкай (1 м); в. Гарбачова Расонскага р-на Віцебскай вобл. 1954 г.
з) «скапіч» жалезны; в. Вялікае Бярэзіно. 1955 г.
і) «капачка» жалезная (13 х 17 см) з драўлянай ручкай (80 см); в. Гарадок Рэчыцкага раёна Гомельскай вобл. 1965 г.
к) «кука» драўляная з ручкай для разбіўкі груды зямлі на агародзе; в. Загор'е Лепельскага р-на Віцебскай вобл. 1966 г.
л) вілы жалезныя; в. Іжа Вілейскага р-на Мінскай вобл. 1971 г.
м) вілы стальныя з драўлянай ручкай; в. Любоўшы Вілейскага р-на Мінскай вобл. 1971 г.




13. Бульбакапалка Гардэра. Пач. XX ст.




14. «Мач». Музей г. Ашмяны, Гродзенская вобл. 1979 г.




15. «Копачка»; в. Каменка Шчучынскага р-на Гродзенскай вобл. 1980 г.




16. «Значнік» для пасеву буракоў; в. Ельня Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. 1979 г.




17. «Цягачка» для пасадкі буракоў; в. Закор'е Браслаўскага р-на Віцебскай вобл. 1979 г.




18. Нож для ссякання качаноў капусты; в. Барава. Музей Іўеўскага р-на Гродзенскай вобл.



19. Запрэжка коней; Столінскі р-н. Фота М. Мельнікава



20. Ураджай цыбулі на прасушцы.
Фота А. Габрусь



21. Памідор вагай 1,2 кг (на ветцы справа); г. Гомель. 2004 г.

22. Традыцыйная пасадка бульбы барознамі. Фота А. Габрусь





23. Вялікі кош для бульбы; в. Верасніца Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Фота М. Віннікавай. 2005 г.



24. Кашы для бульбы і буракоў; в. Верасніца Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Фота М. Віннікавай. 2005 г.




25. Пераборка і перанос бульбы кашамі; в. Верасніца Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. Фота М. Віннікавай. 2005 г.




26. Плуг, сошка, барана; в. Ліпск Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл. 1968 г.



27. Перакопка бульбы. Фота М. Мельнікава. 2007 г.

28. Пераворванне бульбянога загона. Фота М. Мельнікава. 2007 г.






29. Яма з навесам для захоўвання бульбы; в. Ворань Лепельскага р-на Віцебскай вобл. 1966 г.

30. Паграбок; в. Агародня Добрушскага р-на Гомельскай вобл. 1980 г.






31. Ураджай дачніка; г. п. Бараўляны Мінскага р-на. Фота Л. Ракавай. 2007 г.

32. Жанчыны бяруць лён на агародзе; в. Сушчэўская Слабодка Чавускага р-на Магілёўскай вобл. Фота Л. Ракавай. 1970 г.





33. Селянін з сахой; в. Морач Клецкага р-на Мінскай вобл. 1959 г.

34. Сяляне; в. Агароднія-Кузьмініцкая. 1912 г.





35. Сяляне; в. Велюнь Столінскага р-на. 1939 г.


36




37. Гарбузовая плантацыя на вясковым агародзе. Фота А. Габрусь

36. Пляцёнка цыбулі. в. Мыслабож Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл. 1960 г.

38. Агарод з агароджай «прясла»; в. Рудня Міхалкаўская Мазырскага р-на Гомельскай вобл. 1950 г.


38



39. Градкі з морквай і капустай (па Мітлайдэру); г. Гомель. Фота Л. Ракавай. 2004 г.



40. Багаты ўраджай гарбузоў; Столінскі р-н Гомельскай вобл. Фота М. Мельнікава. 2006 г.

41. Парнікі з агуркамі і таматамі, прызначанымі на продаж; г. п. Іўе Гродненскай вобл. Фота Л. Ракавай. 2006 г.






41






42. Печка для абагрэву парніка з агуркамі; в. Альшаны Столінскага р-на Брэсцкай вобл. Фота Л. Ракавай

43. Гаспадыня на агародзе; Драгічынскі р-н Брэсцкай вобл. Фота М. Мельнікава. 2006 г.



Заняткі сялян агародніцтвам яшчэ ў сярэдзіне XIX ст., як заўважалі сучаснікі, не мелі прамысловага значэння, агародніцтвам займаліся выключна для асабістага спажывання. Выключэннем можна лічыць сялян з прыгарадных вёсак, якія вырошчвалі на продаж раннюю і познюю гародніну. Перш за ўсё гэта капуста, гуркі, рэпа, бручка[342]. Гародніну на продаж вырошчвалі і гараджане, але не паўсямесна. У Магілёўскай губерні, напрыклад, продажам агародніны займаліся жыхары Гомеля, Мсціслава, Чэрыкава, Рагачова, а таксама прыгарадаў Магілёва (стараабрадцы, яўрэі, мяшчане). Бралі ў арэнду «годные под огороды земли» ў памешчыкаў і арандатараў. Так, у Рагачоўскім і Чэрыкаўскім паветах, напрыклад, у кожнага памешчыка стараабрадцы арандавалі пад агароды па 2—3 дзесяціны, і павінны былі плаціць за дзесяціну ад 50 да 70 руб. у Рагачоўскім і ад 40 да 50 — у Чэрыкаўскім. На гэтых агародах тыя, хто меў найбольшы попыт, паспяхова вырошчвалі гародніну (агуркі, капусту, бульбу, буракі і фасолю). У Мсціславе, які знаходзіўся на памежжы з Расіяй, «прамысловым» агародніцтвам займаліся прышлыя агароднікі з Калужскай губерні. Яны працавалі тут з вясны да восені, потым вярталіся на радзіму. У Горацкім павеце арандатарамі былі яўрэі, якія за плату ад 75 да 150 руб. за дзесяціну[343] маглі атрымаць зямлю са свежым гноем, на якой добра раслі агуркі і капуста. Магілёўскія мяшчане каля Дняпра на сваіх заліўных агародах вырошчвалі столькі агуркоў, што забяспечвалі не толькі гараджан, але і жыхароў прыгарадных вёсак[344]. Парнікі для вырошчвання ранняй агародніны на продаж у Магілёве, напрыклад, былі толькі ў аднаго гаспадара[345].

У Клецкіх мяшчан татарскага паходжання, на думку П. Шпілеўскага, быў нейкі сакрэт у вырошчванні агародных культур, таму што ў іх выраслі цыбуліны велічынёй з рэпу. На продаж прызначалася ў іх і бульба — чырвоная і надзвычай смачная, рассыпчатая, не вадзяністая. Смачнымі былі морква і буракі — сакавітыя нават увесну. Вырошчвалі ў вялікай колькасці і розную зеляніну. Каб атрымаць добры ўраджай, татаркі з дочкамі праводзілі цэлыя дні ў агародах і на палях, а ўзімку па пятніцах і нядзелях вазілі свой тавар: бульбу, гарох, цыбулю, рэпу, моркву і г. д. — на базар вялізнымі вазамі ці збывалі прыезжым памешчыкам і ад-

надворцам. Што тычыцца насення агародніны, то яны стараліся нікому яго не прадаваць і не пазычаць[346].

У Нясвіжы быў базар з радамі, якія адводзіліся пад продаж агародніны. Татаркі, па словах П. Шпілеўскага, сядзелі паджаўшы ногі на бруку, а перад імі «на разасланай дзярузе ці ў мяшках было навалена мноства цыбулі, часнаку і парэю...»[347].

П. Шпілеўскі пісаў, што койданаўскія татары таксама займаліся выдзелкай скур і агародніцтвам, як і клецкія, толькі яны былі больш заможнымі, таму што жылі бліжэй да Мінска і мелі магчымасць прадаваць сваю прадукцыю ў ім даражэй[348].

Раней у Мінску за Кацярынінскай царквой пачынаўся Татарскі канец (Татарскае прадмесце), дзе засталіся жыць пасля паражэння пад Клецкам у 1506 г. каля 400 татар. Яны вырошчвалі ў вялікай колькасці агародніну ў сваіх агародах і на палях паблізу Ракаўскай дарогі[349]. Займаліся агародніцтвам і іўеўскія татары, якія з поспехам вырошчвалі агуркі і іншыя культуры.

Развіццю агародніцтва ў XIX ст. перашкаджала адсутнасць добрага насення, асабліва ў сялянскіх гаспадарках. Памешчыкі мелі магчымасць выпісаць насенне з Рыгі, Пецярбурга, Масквы і інш. Сяляне традыцыйна куплялі яго вясной на кірмашах, дзе яго прадавалі рознымі мерамі: гарнцамі, шклянкамі, шчэпцямі. Якасць насення ніхто не гарантаваў. Часам вырошчвалі насенне самі ці куплялі ў суседзяў.

Аналіз розных гістарычных крыніц таго часу сведчыць аб пашырэнні склада агародных культур і іх гатункаў, сярод якіх пашыраны былі: капуста качанная, Каломенская і Грэчаская пудовая, чырвоная, ранняя і позняя, каляровая; бульба Галандская і Французская; морква, буракі жоўта-чырвоныя, круглыя, Егіпецкія; жоўтая рэпа; розныя гатункі бручкі і рэдзькі, радыскі; а таксама цыбулі, гуркоў, хрэну, пятрушкі, сельдэрэю, цыкорыю, бабоў, фасолі, гароху, маку[350].

Вырошчваннем агародніны на продаж займаліся перш за ўсё ў памешчыцкіх гаспадарках. Так, у 1776—1780 гг. з давыд-гарадоцкага маёнтка Юзэфа Радзівіла было вывезена і прададзена больш за палову вырашчанай агародніны і ад 38 да 60% усяго насення агародных культур[351].

Да ліку культур, якія карысталіся асаблівым попытам на рынку, адносіліся: мак, цыбуля, часнок, аніс, хмель, каноплі. Амаль усе буйныя і сярэднія землеўладальнікі вырошчвалі хмель, пашыраючы яго пасевы з-за росту вінакурна-піваварнай вытворчасці. На продаж ішоў таксама хмель, атрыманы ў якасці аброка ад сялян. Для яснага разумення структуры пасеваў у агародах таго часу трэба зазначыць, што асабіста агародныя культуры займалі меншую частку, у асноўным тут сеялі каноплі[352].

У канцы XIX ст. прамысловыя агароды былі ў руках яўрэяў і татар. На продаж вырошчвалі і экзатычныя культуры. У Бельскім павеце, напрыклад, у адным з маёнткаў была цяпліца, дзе вырошчвалі ананасы і спаржу. Даход ад продажу іх дасягаў 2 тыс. руб.[353]. М.В. Рытаў адзначаў: «В Белоруссии огородничество стоит выше, чем в Литве, кроме Минской губернии, где оно одинаково с литовскими, с тою разницею, что сортимент овощей добавляется маком (ползун), фасолью, подсолнечником и кукурузою, а в еврейских огородах — чесноком и пастернаком»[354].

Такім чынам, занятак агародніцтвам на продаж у XIX ст. пачаў развівацца. Цікава, што ў гэты час складваліся рэгіянальныя цэнтры па вырошчванню асобных агародных культур. Так, Пінскі і Шклоўскі паветы спецыялізаваліся па вырошчванню гуркоў, Рэчыцкі — фасолі, Слуцкі — цыбулі, часнаку, Давыд-Гарадок — насення агародных культур і г. д. Дарэчы, Пінск, Шклоў і Давыд-Гарадок і зараз застаюцца такімі цэнтрамі.

Так склалася гістарычна, што ганаровае месца на агародах занялі капуста і буракі, якіх сеялася шмат і якія ўваходзілі ў асноўны склад харчовых прадуктаў. У пачатку XX ст. на агародах паспяхова вырошчвалі раннюю бульбу («скораспелку»). Па-ранейшаму сеялі шмат морквы, цыбулі, бручкі, гуркоў, а таксама маку, турнэпсу, часнаку, канапель.

***Захоўванне агародніны.*** Агародніну трэба было не толькі вырасціць, але і захаваць да новага ўраджаю для спажывання членамі сям'і і на насенне. Для захоўвання агародніны найбольш старажытным спосабам з'яўляюцца ямы, якія былі знойдзены археолагамі ў Хатомелі Столінскага раёна, у Жыткавіцкім раёне Гомельскай вобласці і пад Заслаўем Мінскай вобласці. Яны мелі круглую ці авальную форму,

былі неглыбокімі[355]. Такія сховішчы вядомы і іншым народам: рускім, сербам, венграм і інш.

У XIX ст. для агародніны капалі невялікія ямы, не глыбей за два локці[356] (лішняя вага зверху шкодзіць гародніне), знізу на тры цалі высцілалі саломай. Гародніну ў яму клалі радамі, перасыпалі сухім пяском таўшчынёй у адну цалю. На апошні слой пяску зноў слалі салому і насыпалі пагорак з зямлі. Яго ўтрамбоўвалі дошкай, вакол пракопвалі равок для сцёку вады, з надыходам зімы яму накрывалі гноем. Ямы для захавання бульбы былі больш распаўсюджаны ў паўночных і цэнтральных раёнах[357]. Ямы для захоўвання бульбы зімой рабілі на ўзвышшы. Краі ямы абпальвалі саломай (для знішчэння сырасці), а ад мышэй абмазвалі глінай. Сыпалі бульбу, накрывалі саломай і прысыпалі зямлёй, шчыльна ўтрамбоўваючы паверхню. Часам над ямай ставілі зруб са страхой. Другим спосабам захоўвання агародніны былі кучы.

У ямы і кучы часта забіраліся шкоднікі: пацукі, мышы. З мэтай абярэгу ад іх агародніны ў яму зверху апошняга слою пяску клалі сухі багун[358]. Зараз у ямы кладуць лісце чорнага кораня, сухі папаратнік і іншыя расліны, якія адпужваюць грызуноў. Спосаб захавання ў кучах мала адрозніваўся ад папярэдняга. Для бульбы рабілі неглыбокую круглую яму з калом пасярэдзіне, дно якой высцілалі саломай. Сыпалі ў яму бульбу ў выглядзе невялічкага кургана, які зверху накрывалі саломай, мякінай ці непатрэбным сенам. На кол вешалі распасцёрты сноп саломы камлём кверху («крыша») і засыпалі разам з «крышай» зямлёй, шчыльна прыбіваючы рыдлёўкай[359]. Гэты спосаб дазваляў бульбе мець добрую вентыляцыю, якая перашкаджала яе гніенню.

Трэба сказаць, што агародніна, якая захоўвалася ў ямах, была свежай, сакавітай і смачнай увесну. У скляпах («паграбах») яна не толькі хутчэй псавалася, але і набывала спецыфічны непрыемны пах.

У паўднёвых раёнах, часткова ў цэнтральных і ўсходніх, дзе наглядаецца высокі ўзровень грунтовых вод, апрача іншых сховішчаў рабілі ямы-капцы («скапцы») ці бурты для захоўвання бульбы, буракоў. Яны былі неглыбокімі (глыбіня на штык рыдлёўкі). Пасярэдзіне ставілі 3 калы, абкручаныя саломай (для вентыляцыі), і засыпалі бульбу. Зверху куча

накрывалася саломай і засыпалася зямлёй да 15—20 см, а пасля першых маразоў — да 35 см.[360]. Вакол капца ці бурта абавязкова выкопвалі канаўку для сцёку вады.

Капец, як правіла, размяшчаўся на сухім узвышаным месцы. У XIX ст. рабілі круг дыяметрам 6 локцяў і выкідвалі з яго зямлю на паўлокця. У цэнтры ўмацоўваліся 3 вузкія дошкі, якія ўтваралі адтуліну («комін») для праходу паветры і выхаду сырасці. Яго ўзімку затыкалі саломай, а калі было цёпла — адчынялі. Бульбу насыпалі вакол дошак вышынёй не больш 2 локцяў, закладвалі саломай, а потым засыпалі глебай, вынятай з ямы. Калі капец выкопваўся на роўным месцы, вакол яго рабілі равок для сцёку вады. Зверху капец накрывалі гноем з саломай, але пасля таго, як зямля замерзне з восені (каб падтрымліваць у яме пастаянную тэмпературу). У адваротным выпадку глеба вясной падтане і пашкодзіць бульбу[361]. У XX ст., згодна з апытаннем рэспандэнтаў, ямкі да захавання бульбы і іншай агародніны рабілі глыбінёй да 0,5 м («тады не падыходзіла і не залівала вада»)[362]. Большасць сялян захоўвала бульбу ў капцах, асабліва насенную, бо «бульба з паграбу, — як адзначалі апытаныя, — на насенне непрыдатна, яна дзервянее»[363]. Захоўвалі яе і ў кладоўках («сцепках», «высцёпках», «істопках», «ражах», «варыўнях»), дзе сяляне размяшчалі таксама капусту і іншую гародніну. Зімой туды насілі «жар» (гарачае вуголле), каб у вялікія маразы засцерагчы ад прамярзання[364].

Сяляне захоўвалі гародніну і ў так званых «лёхах» (ямных паграбах, якія размяшчаліся на двары). Яны былі неглыбокія (да 1 м). Сцены такой ямы-пограба адны гаспадары абкладвалі драўлянымі плашкамі, зверху клалі бярвенні, салому, засыпалі зямлёй і рабілі двухскатную страху. Другія — цэментавалі сцены, пол[365]. За гароднінай гаспадыня спускалася ў лёх па цагляных прыступках.

Вядома, што мураваныя і цагляныя скляпы з сістэмай вентыляцыі ў сялян з'явіліся толькі ў 20-ыя гг. XX ст., а ў заможнай часткі сялянства яны былі яшчэ ў канцы XIX ст. Скляпы былі больш прасторныя і паглыбляліся ў зямлю да 2 м, мелі мураваныя прыступкі пры ўваходзе. Часта над скляпом узводзілі паграбню (зруб у 3—5 вянкоў), куды ставілі бочкі, кадкі, клалі гаспадарчае начынне і г. д.[366].

Звычайна скляпы і падвалы ўтрымлівалі шмат вільгаці. Каб зрабіць іх больш сухімі, а значыць, і прыдатнымі для захоўвання гародніны, у пачатку XX ст. выкарыстоўвалі нягашаную вапну, якая мае ўласцівасць паглынаць вільгаць. З гэтай мэтай у склепе размяшчалі бочкі з нягашанай вапнай, а таксама раскладвалі яе кавалкі па вуглах памяшкання і за невялічкімі перагародкамі паміж сцяной, спецыяльна прыстасаванымі для гэтага. Бульбу рассыпалі па падлозе. Бочкі стаялі, прыкрытыя рагожай, да тае пары, пакуль вапна, убіраючы вільгаць, гасілася, а потым яе ізноў замянялі нягашанай[367]. Але вапну не выкідвалі, бо, як вядома, яна незамяніма для вапнавання глебы. Дабаўлялі яе і ў кампостныя ямы для паскарэння працэсу разлажэння раслінных і іншага роду астаткаў. Добра ўбірала вільгаць і вуголле, якое клалі з гэтай мэтай па вуглах склепа[368].

Буракі, моркву, рэпу захоўвалі ў рвах, выкапаных на сухім і пясчаным узвышшы, глыбінёй у локаць і патрэбнай даўжыні. Прасушаныя, без лісця буракі, морква ці рэпа кладліся радамі і перасыпаліся сухім пяском, а потым засыпаліся зверху на паўлокця, каб быў пагорак. Такія рвы рабілі па некалькі адзін каля аднаго, паміж імі пракопвалі раўкі для сцёку вады. Калі зямля прамярзала на шэсць цаляў, зверху бурты накрывалі перапрэлым гноем слоем у дваццаць цаляў. Як пацяплее, гной адкідвалі[369].

Капусту захоўвалі ў капцах прыкладна тым жа спосабам. Клалі галоўкамі ўніз, ачышчаючы ад бакавых лістоў, каб качаны не датыкаліся адзін аднаго, і засыпалі пяском, каб утвараўся пагорак. Накрывалі гноем пасля таго, як глеба прамерзне. Роў рылі звычайна за некалькі гадзін да ўкладкі капусты, каб ён мог праветрыцца і высахнуць[370].

У пачатку XIX ст. для захавання свежай капусты на зіму сяляне выбіралі самыя тугія качаны («кочны»). Іх не зразалі, а вырывалі з глебы з каранямі. Не кожнае надвор'е падыходзіла для ўборкі капусты гэтым спосабам, а толькі сонечнае, калі качаны хутка абсыхалі ад ранняй расы ці адыходзілі ад марозу, бо ў іншым стане ўносіць іх у памяшканне нельга. Раннія замаразкі ў той час былі частай з'явай. Абсохлыя качаны падвешвалі ў склепе да ўбітых у сцяну цвікоў ці звязвалі храпкамі папарна і перавешвалі праз працягнутыя жэрдкі, каб яны не датыкаліся адзін аднаго (інакш

пагніюць). Гаспадыня час ад часу праглядала качаны і абскубала падгнілыя лісты. У звычайным сялянскім склепе, калі ён добра праветрываўся, капуста такім чынам добра захоўвалася да Каляд і нават болей, і гаспадыня магла парадаваць стравамі са свежай капусты, якія падаваліся на святочны стол у гэты час. Такі вопыт захавання капусты ў свежым выглядзе традыцыйна захоўваўся і пазней. У першай палове XIX ст. качаны капусты з карэннем, на якіх засталося трохі глебы, садзілі ў склепе ў пясок, абарваўшы пажоўклыя лісты[371]. Для ўжывання зімой у ежу бралі галоўкі, якія, на погляд гаспадыні, хутчэй пашкодзяцца. Такім жа спосабам захоўвалі і каляровую капусту[372].

Існавалі і іншыя спосабы захоўвання. Селянін заўважыў, што ў зямлі капуста застаецца да вясны свежай, быццам толькі што зрэзанай. Таму на ўзвышшы (каб не падышла вада вясной) выкопвалі яму глыбінёй у 1 аршын і ў 2 аршыны шырынёй і даўжынёй. На дно ямы клалі слой рачнога пяску, у які з каранямі ставілі качаны капусты. Зверху качаны накрывалі невялікімі лапкамі з елкі ці ядлоўцу або канаплянай ці льняной кастрой[373]. Непрыдатнай для накрыцця лічылі салому: яна — спакуса для мышэй. Зверху на яму ўпоперак клалі калы ці дошкі, прасветы паміж якімі запаўнялі таксама веткамі, а потым рабілі насып каля аршына вышынёй — і сховішча гатова[374].

Селянін меў патрэбу ўзяць шмат разоў са сховішча капусту ўзімку. Для гэтага з аднаго боку яму закладвалі толькі веццем, кастрой і сухім гноем. Узяўшы качан капусты, яе было няцяжка закрыць, каб астатняя не папсавалася ў зямлі і не замерзла.

Пастарнак добра захоўваўся зімой у глебе, а таму яго пакідалі на зіму на градах, нічым не накрыўшы. З-за маразоў ён станавіўся салодкім і ўбіраўся ў склеп вясной, калі растане глеба[375].

Каб мець ранняй вясной зялёную пятрушку і цыбулю-парэй, у лістападзе зялёныя расліны накрывалі хваёвымі галінкамі, а калі снег пачне раставаць, покрыў здымалі і выкарыстоўвалі лісце ў свежым выглядзе. Часта гэтыя расліны ўносілі ў склеп і разам са «стулам» (комам зямлі вакол кораня) садзілі ў сухі пясок[376].

Цыбулю пасля ўборкі з агарода прасушвалі, а потым у старых сетках ці мяшках вешалі каля печы, а лепш — у курной хаце, дзе яна задымлялася і абкурвалася і добра захоўвалася[377]. Вешалі яе і на жэрдкі ў вянках.

Упершыню ў «Літоўскай гаспадыні» апісваецца нетрадыцыйны спосаб захоўвання цыбулі, якім было закопванне яе ў ямы тымі агароднікамі, у каго яе было шмат. Для гэтага прасушаную цыбулю ўкручвалі ў бярозавую кару і перасцілалі рады саломай. Яму пасля першых маразоў накрывалі для цеплыні гноем, а зверху засыпалі зямлёй[378].

***Вераванні і абрады, звязаныя з агародніцтвам.*** Беларусы па сваёй прыродзе мелі шчырую прыхільнасць да сваёй радзімы, да зямлі, да бацькаўшчыны, да векавых народных традыцый, якія лічылі самымі правільнымі. Яны з поўным даверам адносіліся да намаганняў і вопыту сваіх продкаў, лічылі, што ўсё тыя рабілі правільна і што новы вопыт прыводзіць да тых жа вынікаў, што і ранейшыя. Земляроб верыў, што прыёмы і формы апрацоўкі глебы, тэхналогія вырошчвання розных культур, якія пераходзяць са стагоддзя ў стагоддзе, заснаваны на разумных пачатках і прывіліся таму, што былі правільнымі. Народ гаварыў: «Нашы дзяды не зналі бяды». А таму трымаліся правіла: «старыны не рухаці». І з пакалення ў пакаленне працягвалі працаваць тымі ж прыладамі працы, традыцыйнымі прыёмамі, зберагаючы працоўны вопыт папярэднікаў.

Гэты жыццёвы вопыт гаспадарання многіх пакаленняў мае вялікае значэнне і сёння з пункту гледжання назапашвання і зберажэння карысных, жыццёва важных вынікаў пазнання акаляючага свету. Гэтыя мудрыя парады перадаліся нашчадкам у выглядзе прыказак, прымавак, народных прыкмет, вераванняў і г. д. Народ заўважаў, што праца на зямлі патрабуе прыкладання рук, сілы, якую, аднак, трэба траціць ашчадна: «Без дагляду зямля круглая сірата», «Сей смела, калі ў саду бела», «Кладзі гной густа — не будзе ў свірне пуста», «Калі добра ўзарэш, то і ўраджай збярэш».

Селянін добра ўсведамляў неабходнасць не прапусціць спрыяльныя тэрміны сяўбы, праполкі, уборкі ўраджаю, закладкі яго на зіму. Прыказкі, прымаўкі, народныя выслоўі вучаць, як весці гаспадарку, якую тэхніку земляробства выкарыстоўваць: «Спас — усяму час», «Дзе рукі і ахвота,

там вялікая работа», «Не марнуй часу дарэмна, вясна пройдзе — не вернеш», «Глыбей узарэш — болей забярэш», «На Бога спадзявайся, але і сам старайся» і г. д.

Сістэма маёмасных забарон, якая існавала ў беларусаў у мінулым, першапачаткова была нормай маёмасных адносін, цесна звязанай з культам продкаў, ахоплівала ўсе сферы жыццядзейнасці, у тым ліку і гаспадарчую дзейнасць беларусаў, адным з напрамкаў якой было агародніцтва. З агародніцтвам звязаны шэраг народных вераванняў і забабонаў, магічных прыёмаў, рацыянальных эмпірычных ведаў беларусаў.

Многія маёмасныя забароны былі заснаваны на сімпатычнай магіі. Пазычанне агню ў забаронены час, напрыклад, на думку беларуса, выклікала псаванне ўраджаю агнём ці маланкай, спякотай ці працяглымі дажджамі. Селянін, які збіраўся вывезці гной на поле, сеяць грады ці складваць сена ў пуню, нізашто не пазычаў у гэты дзень суседу ці сваяку агню ці якую-небудзь рэч. Больш таго, людзей, якія ішлі за пазыкай да суседа ў любое свята, увогуле лічылі чараўнікамі і ведзьмамі. На думку беларуса, разам з рэчамі, той, хто пазычыў, страчвае не толькі асабістае шчасце, але і абярэгі, духа-прыхільніка, які ахоўвае ўсю сям'ю ад злых сіл.

Гэтыя забароны былі абмежаваны вызначанымі тэрмінамі. Так, пазыкі не дазваляліся ў святы, звязаныя з культам продкаў («Дзяды», «Радаўніца» і інш.), у рэлігійныя і іншыя святы, у час пачатку гаспадарчых спраў (засеў, дзень ворыва, першы дзень збору ўраджаю і г. д.), у пачатку тыдня, у першай квадры, у дзень нараджэння і інш. Е. Раманаў адзначаў, што ў магілеўскіх беларусаў «строго наблюдается, чтоб в день посева ничего никому не давать из дому в одолжение, а больше всего — огня и спичек»[379].

Па сведчанню М.Я. Нікіфароўскага, віцебскія беларусы ў першую квадру (у маладзік) не давалі ніякіх рэчаў, збожжа і агародніны нават сваякам, каб не трапіць у патаемную залежнасць на месяц да таго, каму аддадзена што-небудзь[380]. Тут цвёрда трымаліся звычая не пазычаць нічога, пакуль не скончана заворванне азімых[381].

У гэтых вераваннях ёсць яшчэ адзін важны момант: вера ў магічнае кола, прарыў якога цягне за сабой страту поспе-

ху ў розных справах. Цікава, што рэшткі гэтых вераванняў жывуць і сёння. Некалі лічылі, што разам з аддадзенымі рэчамі з сям'і ўходзіць шчасце і прыбытак. Асабліва цесна звязана было гэтае ўяўленне з пераходам земляробчага шчасця ад аднаго чалавека да другога. Таму забаранялася сеяць аднačасова двум хлебаробам на сумежных палосках поля. У аднаго, лічыў беларус, будзе добры ўраджай, а ў другога — ніякага[382]. Жыццё земляроба, аднак, вымушала яго працаваць адначасова з іншымі, каб не згубіць пагожы дзень. У такім выпадку звычай раіў усім аратым весці работу адначасова з пачатку да канца ворыва, каб перавагі не было ў ніводнага[383]. Не відаць было, на думку народа, добрага ўраджаю таму аратаму, які спазніўся і, ідучы на працу, сустрэў суседа, які ўжо скончыў працу[384].

Шмат павер'яў было звязана з вывазам на палеткі гною. Як адзначалася, у гэты дзень нельга было даваць з дому: ні агню, ні рэчаў, ні вады. Гной у сялянскай гаспадарцы лічыўся вялікай каштоўнасцю, ад якой у многім залежаў ураджай, таму, калі ўпершыню везлі яго на палетак, стараліся не страціць ніводнай часцінкі па дарозе, каб на яго не напалі ведзьмы і не выцягнулі яго жыццёвую моц[385]. Беларусы верылі, што, калі яны пазычаць каму-небудзь агонь або ваду, вывезены гной згарыць ці вымакне пад дажджом і ад яго не будзе ніякай карысці[386]. Тое ж адносіцца і да попелу. Асабліва прыдатным, на народны погляд, лічыўся попел, які сяляне не выграбалі з печы ад Каляд да Хрышчэння, гэты попел потым засцерагаў агародніну ад чарвякоў і мошак. Віцебскія беларусы сеялі яго разам з яравым зернем з мэтай засцерагчы ад птушак[387].

Па народных уяўленнях, аддаючы якую-небудзь агародніну, трэба абавязкова ўзяць хоць некалькі капеек, каб яна добра радзіла. Гэтая імітацыя продажу агародніны ці нейкіх прадуктаў існуе і сёння. Найчасцей, аддаючы суседзям расаду ці якую-небудзь агародніну, гаспадар атрымлівае сімвалічную плату[388].

У беларусаў існавалі розныя маёмасныя забароны на прадукты агародніцтва і садоўніцтва. Калі садавіну, па традыцыі, было прынята дарыць пасля яе асвячэння 6 жніўня, то іншыя сельскагаспадарчыя здабыткі ахвяраваць не спяшалі-

ся. Выключэннем былі ахвяры і пазыкі розных сельскагаспадарчых прадуктаў цяжарнай жанчыне. Для абодвух бакоў гэта пазыка лічылася добрай прыкметай. Звычай нават рэкамендаваў цяжарнай жанчыне пазычаць штосьці («прасіць на маладое»), у выніку чаго яна магла папасць «на лёгкую руку» і лепей разрадзіцца[389]. З другога боку, нельга было гаспадару адмовіць просьбе цяжарнай жанчыны ў чым-небудзь, у адваротным выпадку, па павер'і, «мышы пагрызуць адзенне». Больш таго, калі цяжарная жанчына сарвала агародніну ці садавіну на яго сядзібе, селянін зазвычай наўмысна стараўся не заўважаць гэта[390].

Дарэмна было нядбайнай гаспадыні звяртацца да аднавяскоўцаў за пазыкай насення ў час сяўбы. Згодна з вераваннямі, пазычаць у гэты час нічога нельга, таму што звядзецца хлеб, лён, гарох і г. д. У той жа час, калі агародніна добра расце на градах, то можна і пазычыць суседцы капудругую гуркоў ці чаго-небудзь іншага. Тады, на думку беларуса, астатнія будуць расці яшчэ лепей[391]. А вось выбіраць, які даць агурок, цыбуліну і г. д., гаспадыні звычай не раіў: інакш яны перастануць зусім расці[392]. А таму ахвяравалі першы, які трапіць на вока.

З мэтай павялічыць ураджайнасць ці набыць новы ўраджайны гатунак агародніны асобныя сяляне стараліся ўкрасці на семя спелую агародніну ў суседа. Вядома, што такія дзеянні не заахвочваліся, а асуджаліся грамадскай думкай. А калі гаспадар застане злодзея на месцы, мог адбыцца і самасуд. Выключэннем лічыўся крадзеж гароху. Народная прымаўка сведчыць: «Гарох сееца на прыхадзяшчага і на прыбягашчага, і на тыя дзеці, што праз плот глядзеці». Дратаваць гарох не лічылася ганьбай, і яго сеялі спецыяльна пры дарогах: «Хто ідзе, той сарве». Сяляне нават лічылі, што калі дзеці хадзілі «шчыпаць» струкі, то ўмалот яго будзе больш[393].

Для атрымання добрага ўраджаю гароху сяляне прымяркоўвалі яго пасеў да таго дня тыдня, у які восенню ішоў першы снег, або да пятніцы перад Вялікаднем, якая ў народзе лічылася ахоўніцай гэтай культуры. У народзе існавала павер'е: «Калі сеюць гарох, то ў гэты дзень яго нельга варыць і есці таму, што нападуць чэрві і гарох будзе ліхі»[394].

У Чэрыкаўскім павеце пры пасеве гароху да заканчэння справы нікому нельга было хадзіць па мяжы і рабіць у гэты час фізічных адпраўленняў. У адваротным выпадку гарох вырасце з тонкімі струкамі і будзе нячыстым: яго паточаць чэрві[395].

Ю. Крачкоўскі прыводзіць некалькі магічных прыёмаў, якімі карысталіся сяляне з мэтай паўплываць на рост і ўраджайнасць агародніны. Так, у Краснаполлі Магілёўскай губерні пры пасадцы капусты жанчыны апраналіся ў парваную сарочку і як мага лепей зачэсвалі валасы. Тады капуста, на іх думку, будзе мець больш лісця (накшталт парванай сарочкі), а качаны будуць цвёрдыя і гладкія, як галава работніцы[396]. У Слонімскім павеце гаспадыня, ідучы на агарод садзіць капусту, клала на градку вялікі бохан хлеба, прыгаворваючы: «Дай Бог, штоб і капуста парасла такая ж вялікая, як гэта булка хлеба!»[397]

Шмат было прыкмет, звязаных з пасевам агародных культур. У асобных месцах моркву сеялі толькі абутым, каб яна мела адзін хвост, а не некалькі (бо на назе некалькі пальцаў)[398]. Пры пасадцы гародніны многія сялянкі апраналіся ў чыстае адзенне.

Агуркі, згодна з традыцыяй, сеялі заўсёды раніцай, прымяркоўваючы пасеў да дня, калі неба пакрыта скучанымі аблокамі: агуркі тады будуць радзіцца ў вялікай колькасці і будуць ляжаць кучамі[399]. У асобных месцах з той жа мэтай яшчэ ў пачатку XX ст. гаспадар, згодна з павер'ем, павінен быў зняць штаны і бегаць вакол градкі[400]. Шмат было прыкмет, звязаных з пасевам цыбулі. Так, у Гродзенскай губерні (Слонімскі павет), калі гаспадыня хоча, каб цыбуля была з характэрным гаркаватым смакам, яе садзілі ў посныя дні тыдня (сераду ці пятніцу), калі не — то ў любы дзень з астатніх[401]. Асабліва спрыяльным для пасадкі расады лічыўся дзень Благавешчання. Да ўзыходу сонейка гаспадыні садзілі расаду. У гэты дзень клалі ў дым галоўкі цыбулі. На думку селяніна, яна ў такім выпадку будзе расці лепей і з сярэдзіны яе не будуць выходзіць «стаўбы», якія псуюць цыбулю. Перад высадкай цыбулі ў зямлю вярхушкі зразалі і макалі іх у расол буракоў[402].

Сяляне трымаліся пэўных прыкмет пры пасеве гародніны, яе зборы, закладцы ў запас, а таксама выкарыстоўвалі

нагляданні за надвор'ем і прыкметы, якія, на іх думку, спрыялі добраму ці дрэннаму надвор'ю.

Добрае надвор'е назаўтра прадвяшчаў ясны захад сонца. Лічылі, што ў час, калі пастух гоніць скаціну і першай ідзе карова белай масці, добрае надвор'е забяспечана. Калі вароны лётаюць зграямі і садзяцца на ўзгорках, то будзе моцны працяглы дождж. «Калі варона на калу, то мужык на палу!» — сцвярджае народная прымаўка, што азначае адсутнасць добрага надвор'я[403]. Цёплы дзень на Благавешчанне, па народнай прыкмеце, указвае на засушлівы год, дажджлівы — на добры ўраджай жыта, а ўмераны — на ўмераны ўраджай. Будзе неўраджайны год, лічыў селянін, калі кукушка кукуе на голы лес[404].

З дапамогай абрадавых і магічных дзеянняў сяляне спрабавалі ўплываць на «змяненне» неспрыяльных прыродных умоў на спрыяльныя. У Маладзечне, напрыклад, з мэтай спыніць засуху за адзін дзень трэба было начысціць ільну, спрасці яго і саткаць кавалак палатна пэўнай велічыні[405].

Здаўна ў беларусаў існавала шмат павер'яў і прыкмет, звязаных з агародніцтвам. Так, у сялян Гродзенскай губерні існавала павер'е, што ў дзень, калі ў вёсцы хто-небудзь памрэ або каго-небудзь хаваюць, нельга сеяць і нават вывозіць гной на поле ці агарод. Бо, як тлумачыў селянін, пасеў замрэ ў зямлі ў дзень смерці аднавяскоўца і не вырасце, а тое, што пасеяна ў дзень хаўтур, быццам бы забіраецца нябожчыкам з сабою[406]. Такім чынам, праца ў агародзе ў гэты момант лічылася марнай тратай часу.

Трэба сказаць, што гэтыя ўяўленні сялянства часцяком дрэнна адбіваліся на ўраджаі па прычыне страты найлепшых дзён для пасяўной, калі яны супадалі з выпадкамі смерці на вёсцы. Пясчаныя і супясчаныя глебы, якія пераважалі тут, хутка перасыхалі, а познія пасевы выдуваліся ветрам на паверхню зямлі і засыхалі[407]. У «Гродзенскіх губернскіх ведамасцях» пісалі, як адзін селянін купіў на базары расаду капусты з намерам пасадзіць яе ў той жа дзень. Але здарылася нечаканае: у вёсцы нехта памёр. Селянін не меў магчымасці пасадзіць капусту на працягу пяці дзён: пакуль пахавалі нябожчыка прайшло тры дні, адразу за імі было рэлігійнае свята, калі таксама нельга было сеяць. У выніку капуста, пасаджаная позна, дала дрэнны ўраджай і яе не хапі-

ла на зіму. Аднак селянін сваю няўдачу адносіў на конт павер'я і тлумачыў: «Не, тут вышла абмылка: мрэцъ, бачыш, быў ужо тадыча, як мы гной вазілі, а мы аб етам і не ведалі — от капуста і пашла марна»[408]. Інакш кажучы, на думку селяніна, неўраджай адбыўся з-за парушэння павер'я аб тым, што нельга вывозіць гной на агарод, калі хто-небудзь памрэ ў вёсцы.

Моцна трымалася вера ў тое, што можна паўплываць на надвор'е з дапамогай малітваў, гаданняў, магічных прыёмаў. Я. Баршчэўскі пісаў, што гадалі на куццю, якой трымаліся як шляхта, так і сяляне, гадалі аб будучым ураджаі, падсоўваючы руку пад абрус, выбіралі даўжэйшую сухую сцябліну. Пасля вячэры, гледзячы на яснае зорнае неба, выказвалі надзеі на добрую вясну і на багаты збор садавіны і агародніны ўвосень[409].

Страх на людзей наводзіла «рабінавая ноч». Яна адбывалася ў тую пару, калі на палетках і ў агародах даспяваў ураджай, і пагражала знішчыць усе надзеі хлебаробаў. Таму сяляне ўзносілі да неба свае вочы і ўся сям'я шаптала малітвы, каб усё абышлося. Катоў і сабак у гэты час выганялі з хаты, бо верылі, што злы дух, які ўцякае ад перуноў, хаваецца ў гэтых жывёлах. На жар кідалі асвячонае зелле са словамі малітваў[410]. Звычайна пасля жудаснага выцця вятроў і навальнічных грымотаў, калі вецер праганяў рэшткі хмар, як пісаў Ян Баршчэўскі, наступала заранка і відаць былі пазрываныя з хат і гаспадарчых пабудоў стрэхі, збітыя з дрэў яблыкі і дулі, занесеныя пяском грады з цыбуляй, морквай, буракамі і іншай агароднінай[411].

Ян Баршчэўскі таксама пісаў: «У нашым краі доўгая і нясталая зіма, часам мокрая, часам марозная і завейная, у лагчынах вада, а на пагорках паўночны вецер нішчыць пшаніцу і жыта, аднак жа дбайнасць і праца можа перамагчы ўсё»[412].

З мэтай атрымаць дождж на свае агароды і палі дзяўчаты ў Віленскай губерні ўносілі ў хату свае сярпы, бабулі кідалі ў калодзезь мак, хлопчыкі рвалі траву з прыгаворам:

Ідзі, ідзі, дожджыку,
Зварым табе боршчыку,
Паставім пад лаўкаю,
Накрыем булаўкаю![413]

Уяўленні беларусаў аб здольнасці дзяцей «прыносіць шчасце», уплываць на сілы прыроды (заклічкі дажджу і інш.) з мэтай атрымання добрага ўраджаю бытавалі паўсямесна яшчэ ў пачатку XX ст. і трымаліся на веры аб чысціні дзіцячай душы і ўласцівасці дзяцінства — растучай і прыбываючай сілы — аказваць такі ж узмацняючы ўплыў на сілы прыроды.

Каб выклікаць дождж, у беларускіх татараў быў звычай прыносіць у ахвяру чорнага барана ля рэчкі, а калі сухое надвор'е — белага на ўзгорку. Калі ўраджаю пагражала засуха і змучаныя расліны неадкладна патрабавалі дажджу, куплялі ў складчыну, у якой часта ўдзельнічалі і аднавяскоўцы-беларусы, чорнага барана. Калі хто-небудзь выказваў здзіўленне іх удзелу ў мусульманскім абрадзе, яны сцвярджалі: «Бог адзіны». Адбываўся гэты рытуал наступным чынам: натоўп татараў, ведучы барана за рогі, рухаўся да берага ракі ці ручая. Спачатку, стоячы радамі, спявалі малітву пад кіраўніцтвам мулы. Затым адзін з насельнікаў рэзаў барана і клаў ахвяру галавой на поўдзень. Пасля ўсе разам елі звараную ў катле бараніну. У мястэчку Мір, напрыклад, мяса ахвярнага барана неслі дадому. Скуру і косці пасля прынясення ахвяры выкідвалі ў ваду. Самае цікавае, што заканчвалася ахвярапрынашэнне жартамі, удзельнікі абраду абліваліся вадой з кубкаў, а хлопцы з вясёлымі крыкамі кідалі дзяўчат і мулу ў рэчку. Ахвярапрынашэнне з белым баранам праходзіла інакш: жывёлу рэзалі на ўзгорку і спальвалі яе цалкам[414].

Уяўляюць цікавасць звязаная з агародам і агароднымі культурамі варажба дзяўчат і хлопцаў аб будучым лёсе, вяселлі, розныя чары, прысушкі і адсушкі, тлумачэнні сноў. Так, у беларусаў вядома варажба дзяўчат на калках плота, калі яны хацелі даведацца аб тым, хто будзе іх будучы муж: халасты ці ўдавец. З гэтай мэтай яны выбягалі да плота ці на агароды, дзе выбіралі ад вугла месца ў плоце (ці адвольнае) і лічылі калкі ў ім, прыгаворваючы: «То кол, то калец, то кавалер, то ўдавец» альбо: «То тын, то тынец, то кавалер, то ўдавец». Гэтак жа рабілі і хлопцы: «То кол, то каліна, то ўдава, то дзяўчына». Слова, вымаўленае на апошнім калку, давала падставу для высноў[415]. Падобная варажба сустракалася паўсямесна, адрозніваючыся невялікімі варыяцыямі прыгавору, выбару месца ў плоце і колькасцю варажэй. Праз плот «працягвалі» хворае дзіця ў сарочцы. Хвароба, па

ўяўленні селяніна, застанецца ў дзіцячай сарочцы, а дзіця паправіцца[416].

Варажылі ў час надыходу агароднай сяўбы: ці хутка дзяўчына выйдзе замуж і ці добры ў яе будзе муж. Дзяўчаты адной або некалькіх вёсак заворвалі асобную граду, сеялі на ёй краскі аднаго гатунку, пераважна руту, і наглядалі. Хутчэй пойдзе замуж, па павер'і, тая, чые краскі першымі расцвітуць. Дзяўчаты, якія садзілі розныя краскі ў сваім малым агародчыку перад вокнамі хаты, таксама ўважліва сачылі за іх ростам і цвіценнем: добры рост абяцаў хуткае замужжа за добрага чалавека, дрэнны — за ліхога[417]. Варажылі і на агародных культурах, напрыклад на капусце. Так, дзяўчына, якая мела на прыкмеце некалькі патэнцыяльных жаніхоў, садзіла ў агародзе на асобнай градцы расаду карэньчыкам ўверх і пакідала яе без паліўкі. Пры гэтым яна загадвала на кожнага жаніха паасобку. Калі якая-небудзь расліна прыжывалася ў такіх умовах, то лічылася, што жаніхом будзе адпаведны жаніх, на чыё шчасце яна пасаджана. У асобных месцах некалькі дзяўчат на Тройцу садзілі расаду капусты, у якой папярэдне адрывалі корань. Добрае жыццё, па народным уяўленні, павінна было дастацца дзяўчыне, расада якой усё ж вырасла[418].

У многіх магічных дзеяннях, якімі займаліся асобныя людзі, прысутнічаў гарох, дзе вызначальнай з'яўлялася лічба 9: 9 струкоў гароху, 9 зярнят у струку і г. д. Верылі, што дзякуючы струку гароху, у якім 9 зярнят, ліхадзеі маглі здабыць сабе шапку-невідзімку. З дапамогай 9 струкоў гароху, у якіх па 9 зярнят, пакладзеных на дарозе перад шлюбным поездам, можна, згодна з павер'ем, пашкодзіць шлюбу. Такую ж ролю можа адыграць і адзін струк гароху з няпарнай колькасцю зярнят, паложаны пад сядзенне. Разлучыць каханых, па народным павер'і, можна і з дапамогай сабранага паміж Калядамі і Вадохрышчам высушанага свінога памёту, шчэпаць якога трэба было кінуць наводлег ад шчаслівай пары[419].

У асяроддзі беларускага сялянства бытавала шмат прыкмет і павер'яў, звязаных з агародніцтвам, якія ўвабралі жыццёвы вопыт, веды, этыку, служылі дарадчыкам у жыцці, перасцерагалі ад няправільных дзеянняў і нават кіравалі паводзінамі. Прыкметы часта мелі пад сабой рацыянальную

аснову і былі заснаваны на шматгадовых назіраннях за надвор'ем, ростам раслін, вялікім жыццёвым вопыце па вырошчванні тых або іншых культур, які перадаваўся з пакалення ў пакаленне, дазвалялі селяніну рацыянальна выкарыстоўваць яго. Напрыклад, сяляне лічылі, што «калі ў тыя дні, калі садзяць капусту і бручку, ідзе дождж ці стаіць туман, то і агародніна добра ўродзіцца»[420]. Сапраўды, пры высаджванні капусты ці бручкі вільгаць, паліў — неад'емная ўмова.

Павер'і ж па большай частцы былі заснаваны на выдумцы, фантазіі беларуса. Жаданне чалавека растлумачыць тыя або іншыя з'явы спараджала многія забабоны і павер'і, якія мелі алегарычны, сімвалічны сэнс і не абяцалі утылітарнай карысці. Этнолагаў яны цікавяць як з'ява народнай культуры. Згодна з народным павер'ем, нельга было сеяць агародніну кульгавай жанчыне, нельга перакладваць насенне з рукі ў руку, сеючы яго[421]. Цяжка зразумець сэнс народнага павер'я, што ўраджаю ўсіх агародных культур спрыяе павешаны на агародным плоце конскі чэрап[422].

Кожны год гаспадыні марылі пра добры ўраджай агуркоў, бульбы, буракоў і іншых культур, ведалі шмат прыкмет, якія звязаны з ураджаем пэўнай культуры. Агурочны год яны звязвалі з доўгімі чырвонымі шышкамі на елках. Калі на Грамніцы капае с капежа (страхі. — *Л. Р.*), то будзе ўраджай на агуркі[423]. Сеяць іх лепш за ўсё было ў дзень «агароднага святога» Пахома (28 мая) або на Юр'я (6 мая), апошнія агуркі можна было садзіць перад Міколай на Івана (21 мая)[424]. Народныя прыкметы не раілі сеяць у сераду і ў пятніцу, у посныя дні, у час, калі свеціць месяц, таму, што яны, па прыкмеце, не зародзяць ці пойдуць у пустацвет[425].

У асобных месцах гаспадыні сеялі агуркі вечарам (каб не было пустацвету). У другіх лічылі: калі ў дзень пасеву не было сонейка, то агуркі вырастуць дуплаватымі. У пачатку цвіцення агуркоў карысталіся магічным прыёмам, каб на іх была добрая завязь: кідалі ў пограб старыя лапці ці штонебудзь плеценае ці вязанае[426]. Збіралі пустацвет, варылі яго з мёдам і крапілі расліны. Гэта мела рацыянальны сэнс таму, што на іх ахвотна садзіліся пчолы, якія лепей апылялі кветкі.

Этнографам Л.І. Мінько запісаны (Буда-Кашалёўскі р-н Гомельскай вобл.) абрады: пры пасадцы агуркоў на градку

клалі «таўкач» з прыгаворам: «Штоб такія гуркі ляжалі». Клалі ў лапаць насенне агуркоў і цягнулі яго ў агарод, «каб так агуркі косы распускалі»[427].

Сяляне адзначалі, што, калі ўраджай на збожжа — будзе неўраджай на бульбу, і наадварот (Слуцкі р-н)[428]. Бульбу, згодна з прыкметамі, не садзілі за два тыдні перад Юр'ем і два тыдні пасля яго. Адны гаспадары садзілі бульбу ў той дзень, калі на небе «галавастыя хмары» (вялікай вырасце), другія — калі па небе ходзяць баранчыкі і ярка свеціць сонца (будзе яе шмат)[429]. Частка сялян лічыла, што лепей бульбу сеяць на сход маладзіка (ніколі не будзе дробнай)[430]. Добрым днём для копкі лічылася субота[431].

Селянін мог вярнуцца назад дадому ідучы на агарод, калі ўбачыць на сваім шляху чалавека, які сядзіць (і бульба будзе сядзець, а не расці), калі дарогу пяройдзе свіння (будзе наздраватай бульба). А каб лепей яна расла, можна было запрасіць для пасадкі першай бульбіны цяжарную жанчыну ці для пасадкі першай баразны — мужчыну[432].

У асобных раёнах прытрымліваліся пэўных тэрмінаў пасадкі бульбы, напрыклад, не раней пятага ці сёмага дня маладзіка (Хойніцкі р-н Гомельскай вобл.)[433]. З мэтай паўплываць на ўраджай сеялі бульбу з прыгаворамі. Так, у Буда-Кашалёўскім раёне гаварылі: «Госпадзі, дай на ўсіх долю. Колькі на небе аблачкоў ляжыць, каб мая бульбачка так пад кустом ляжала»[434]. Што тычыцца буракоў і морквы, то пасеяць іх трэба было не пазней таго часу, калі зацвіце чаромха.

Шмат прыкмет і павер'яў звязана з капустай, якая была адной з галоўных агародных культур. Капусту, згодна з прыкметамі, трэба было сеяць у Чысты чацвер ці ў перадвялікодную суботу. Прымяркоўвалі яе пасадку да поўні (галоўкі будуць вялікімі), да дня, калі ідзе невялікі дождж (добра зародзіць)[435]. З мэтай паўплываць на ўраджай прытрымліваліся народных павер'яў, выконваючы якія сялянкі імкнуліся павялічыць свой ураджай ці пазбегнуць знішчэння яго рознымі насякомымі. Каб захаваць агародніну ад кратоў, сяляне праводзілі цераз свае агароды жарабца, у выніку чаго краты нібыта здыхаюць ці сыходзяць у балота (Лепельскі пав.)[436]. Пры пасеве агуркоў раскідвалі па градках вузлы ад

шнуркоў (каб лепей завязваліся), затыкалі ў граду клінок (каб краты не тачылі зямлю) і г. д.[437] Капусту любілі не толькі людзі, але і насякомыя (жучкі, гусені і інш.), а таму, каб яе засцерагчы, існавала шмат магічных прыёмаў: палівалі вадой, у якой мылі авечак перад стрыжкаю, або вадой з першага снегу (не будуць есці чэрві)[438], сеялі сярод капусты каноплі (пах падрослай расліны адпуджваў капусных матылёў), раздушвалі чарвяка[439] зубамі або выносілі ў зубах за плот, прапаноўвалі капуснага чарвяка, абгорнутага лістом, разгрызці старэйшаму з дзяцей[440] і г.д.

Рыхтуючы расаду капусты, згодна з павер'ем, трэба асцерагацца, каб туды не трапілі казіныя і авечыя «бубкі» ці птушыны памёт: расада згарыць ад жыру і будзе «ніціцца»[441].

Каб завязваліся капусныя галоўкі, садзячы вясной расаду ў асобных раёнах, прыціскалі першы лісток каменьчыкам; ставілі на зямлю дагары дном гаршчок і клалі ў яго камень, прыгаворваючы: «Хай будзе капуста крэпкая, як камень, і вялікая, як гаршчок»[442]. Падобных прыкмет з каменем было нямала: яго абгортвалі анучай, клалі ў слоік з вадой. І ўсе прыкметы былі заснаваны на сімпатычнай магіі: цвёрды камень можа паўплываць на цвёрдасць галовак капусты: «Каб качанне было такое крэпкае, як гэты камень»[443]. Сялянкі да ўзыходу сонца распраналіся дагала і вакол кожнага качана рабілі вялікае кола, жадаючы развіцця вялікіх качаноў. Сяляне заўважалі, што крапіва станоўча ўплывае на капусту, калі расце побач (адпугвае насякомых), а таму нярэдка садзілі яе побач з капустай. З гэтай жа мэтай утыкалі каля пасадак пруток вярбы, абмочанай у дзёгаць, клалі закручаны намочанай у газе, дзёгцю ці тарпатыну анучкай камень[444] і г. д. Калі гэтыя захады маглі мець практычнае значэнне, то такія, як сцябанне гальнём па качанах направа і налева, не азіраючыся (верылі, што чэрві сыдуць на канец ляхі (градка. — *Л. Р.*), разгрызанне качаноў[445] і іншыя былі простымі забабонамі. Так, мак-відук («самасейка») сыпалі ў студню ў час спякоты (каб пайшоў дождж). Ім абсыпалі магілку таго нябожчыка, які часта сніўся, — каб ён не ўстаў. Сеялі мак моўчкі, а ў выпадку крайняй неабходнасці адказвалі кіўком галавы, але не больш трох разоў (інакш ён будзе з пустымі галоўкамі)[446].

Пры пасадцы раслін, якія маглі пайсці ў ствол (рэпа, рэдзька, цыбуля і інш.), па народнай прыкмеце, нельга было брацца за кол ці агароджу. Лепей, згодна з народнай прыкметай, сеяць рэдзьку ідучы, заходзіць у агарод не праз фортку, а пералазам, не забыцца пры гэтым схапіцца за голую лытку (каб і рэдзька была такой жа тоўстай). Калі яшчэ і пагладзіць яе, то, на думку сялян, рэдзька будзе не толькі тоўстай, але і гладкай. А вось заглядвацца на мужчын, садзячы рэдзьку, катэгарычна забаранялася (будзе горкай і пойдзе ў ствол)[447]. Забаранялася дзецям дзьмуць праз пёркі цыбулі, інакш яна будзе ствалавацца[448]. Тлумачылі дзецям і пра тое, што нельга спячы цыбуліну да тае пары, пакуль усю не выберуць з агарода, бо яна пасохне[449].

У дзень сяўбы есці гарох забаранялася ўсім, нават дзецям (будзе чарвівы). А калі ля пасеваў гуляе гурт дзяцей, гэта лічылася добрай прыкметай: гарох добра ўродзіць. Каб ён вырас стручасты, салодкі, нечарвівы, пасля разварваўся ў супе, шэры гарох сеялі толькі пасля белага[450]. І ён будзе ўмалотны, калі пры гэтым дзеці будуць ірваць струкі. Есці гарох, сарваны ў агародзе ці на полі, можна было колькі хочаш, нельга было несці струкі дадому (яны маглі быць загавораны).

Як бачна, вераванні і звязаныя з імі маёмасныя забароны на пазыкі, продаж і ахвяраванне прадуктаў агародніцтва мелі шырокае распаўсюджанне ў Беларусі і, як і ў іншых маёмасных забаронах, былі моцна звязаны з магічнымі ўяўленнямі. Яны абмяжоўваліся тэрмінамі, калі, на думку беларусаў, найбольш дзейнічалі магічныя сілы, якія маглі паўплываць на дабрабыт, шчасце, і абярэгі: у святочныя дні, у пачатку розных спраў і г. д. Большасць з іх мела і рацыянальны змест, але яны цікавыя для нас як частка духоўнай культуры народа, у якой знайшлі адбітак нацыянальныя асаблівасці.

## Глава 2
# РАЗВІЦЦЁ АГАРОДНІЦТВА Ў XX ст.

У пачатку XX ст. развіццё капіталізму і стварэнне рынкаў сбыту патрабавала перагляду структуры пасеваў агароднiны, праяўлення ініцыятывы і вядзення гаспадаркі ў адпаведнасці з умовамі рынку. Вядома, што прыватная ўласнасць у Беларусі фарміраваліся неаднолькава. Абшчыннае землекарыстанне амаль адсутнічала ў Гродзенскай і Віленскай губернях і пераважала ў Магілёўскай. Адметнай асаблівасцю Беларусі было больш шырокае дваранскае землекарыстанне, чым, напрыклад, у Расіі, — 44,8 % супраць 14,7 %[451]. У маёнтках былі створаны ўмовы для прымянення новых тэхналогій, механізацыі: выкарыстоўвалася тэхніка замежнай вытворчасці, удасканаленыя прылады працы. Гэта дазволіла на стыку двух стагоддзяў удвая павялічыць не толькі пасевы бульбы, але і яе ўраджайнасць.

Узрасла патрэба ў агародніках-спецыялістах, якіх сталі рыхтаваць у шасці сельскагаспадарчых школах і земляробчым інстытуце ў Горках.

***Агранамічная рэформа. Паказальныя агароды.*** Вядома, што сялянскія гаспадаркі пакутавалі ад малазямелля, цераспалосіцы, крайняга драблення надзелаў, недахопу і дарагавізны насення і жывёлы вясной, а таксама ад таннасці агароднiны і жывёлы восенню. Адзін з аграномаў пісаў: «крестьянские огороды сейчас в самом жалком состоянии. Нужны меры по его улучшению»[452].

Клопаты аб агародах у XIX — пачатку XX ст. цалкам ляжалі на плячах жанчын. І тут дзейнічала старая этнічная традыцыя. Як адзначаў кобрынскі інструктар па агародніцтву, «мужчины же, по сложившемуся обычаю, вовсе не касаются огородов, считая его «бабьим делом». Вся забота мужчин только во вспахивании тех нескольких метров квадратных сажень, примыкающих к строениям или окруженных ими, и в удобрении навозом»[453]. Усё астатняе робіць жанчына, якой і так хапае працы па гаспадарцы. Гэта, на думку

аўтара, не можа быць прадукцыйным, і неабходны комплекс мер па паляпшэнні гэтай важнай галіны, накіраваных на перавод яе ў лік таварнай[454]. Усё гэта патрабавала правядзення землеўпарадкавальнай рэформы.

У пачатку XX ст. урад робіць захады для паляпшэння сялянскай гаспадаркі, у тым ліку і развіцця агародніцтва. У кожнай губерні для правядзення абследавання сялянскіх гаспадарак і прыняцця мер па іх паляпшэнню было прызначана па 2—3 аграномы з памочнікамі (інструктарамі) і агранамічнымі старастамі.

Вялікую надзею аўтары праекта ўскладалі на хутарскія гаспадаркі, якія былі створаны паўсюдна, згодна са сталыпінскай аграрнай рэформай, і асабліва на арганізацыю ў іх паказальных агародаў. Да 1 студзеня 1909 г. толькі ў Гродзенскай губерні было створана 2095 хутароў[455]. Пачалася прапаганда выгоднасці хутарскога гаспадарання.

«Вестник Могилевского земства» пісаў аб выгодах хутарскога вядзення гаспадаркі. Са слоў селяніна Быхаўскага павета, які атрымаў у карыстанне 2,5 дзесяціны зямлі, вынікае, што хутаранін пазбягае патравы, якая часта бывае ў вёсцы. На хутары існавала большая свабода ў выбары месца для агарода, саду. Так, на сваім хутары пятую частку зямлі селянін адвёў пад сад і агарод і 0,5 дзесяціны — пад бульбу. Пакуль дрэвы былі маленькія, паміж яблынямі ён пасадзіў агарод: белую і каляровую капусту, «пародзістую» цыбулю, моркву, буракі, хмель. А восенню, па словах гаспадара, «весь огород — на базар»[456]. Хутчэй за ўсё ідылія сялянскага жыцця тут перабольшана і выкарыстана як рэклама хутарскога землекарыстання. На наш погляд, хутаранін пазбаўляўся такой важнай рэчы, як дапамога абшчыны, якой карыстаўся ён на вёсцы.

У гэты час у вёсцы ствараліся сельскагаспадарчыя таварыствы з 20—30 гаспадароў (але не менш як 12). Кожны ўносіў пай у памеры 10—12 руб. аднаразова ці ў растэрміноўку. Гэта давала магчымасць сялянам танней купляць насенне, скаціну, тукі, а таксама прадаваць прадукты харчавання[457].

Аграномы са сваімі памочнікамі павінны былі абследаваць кожную вёску і даць поўную карціну прыродна-бытавых і эканамічных умоў жыцця гаспадаркі. Пры гэтым уліч-

валіся такія параметры, як глеба, клімат, колькасць насельніцтва, род заняткаў, рынкі, шляхі зносін і г. д. У полі зроку аграномаў былі тэхніка земляробства, забяспечанасць жывёлай, інвентаром, памер хутара, склад сям'і селяніна[458] і інш. У гэтым праекце быў спецыяльны раздзел «Сад і агарод», развіццю якіх пачала ўдзяляцца павышаная ўвага.

Звычайна на агранамічным сходзе губерні аграномы дакладвалі аб выніках сваёй працы за год ці паўгоддзе. Перш чым расказаць аб мерапрыемствах, якія яны праводзілі, трэба адзначыць, што аграномы бачылі вялікую перашкоду на шляху ажыццяўлення іх планаў: коснасць і інерцыю сялян, якія супраціўляліся ўвядзенню новай агранаміі і агратэхнікі на сваіх агародах. Гэта прыхільнасць селяніна да старадаўніх традыцый, выражаная ў формуле: «так рабілі нашы дзяды» або «нашы дзяды не зналі бяды, а ўнукі набраліся мукі»[459], заснавана на велізарнай павазе да вопыту папярэднікаў, даверы гэтаму вопыту і нежаданні што-небудзь мяняць. Дарэчы, тое ж самае можна сказаць і пра прыхільнасць беларусаў да іншых традыцый («старыны не рухаці») у розных галінах культуры і быту. Нежаданне перамен: «як бацькі нашы жылі, так і мы жыць будзем; ранейшыя людзі разумней былі, а ўсё-такі нічога не выдумалі» — формула тагачаснага жыцця. Як успамінаў адзін з аграномаў Магілёўскай губерні, сяляне з недаверам глядзелі на барына, які прапанаваў адказацца ад звычайнага трохполля і даваў бясплатнае ранасенне на першы пасеў. Мясцовыя кулакі таксама без радасці сустракалі агранома, іх пужаў прагрэс у вядзенні гаспадаркі сялянамі.

Першае, што выклікала неабходнасць рэформы ў агародніцтве, гэта недастатковасць ведаў у гэтай галіне. Спрабавалі нават арганізаваць спецыяльныя курсы па аграноміі для хутаран па 2—3 гадзіны ў тыдзень, дзе чыталіся лекцыі, праводзіліся бяседы, якія ілюстраваліся так званымі «туманнымі» карцінамі з дапамогай дыяпраектара пра лепшы вопыт гаспадарання. У вёсцы Сідаравічы Быхаўскага павета Магілёўскай губерні, напрыклад, на двухтыднёвых сельскагаспадарчых курсах займалася 52 чалавекі, якія на працягу чатырох гадзін у дзень праслухоўвалі курс па прыродазнаўстве, асабістым і абшчынным землеўладанні, жывё-

лагадоўлі, садаводству, агародніцтву і інш.[460]. Праводзіліся практычныя заняткі з паказам прыёмаў вядзення гаспадаркі з мэтай засваення новых, больш дасканалых прыёмаў гаспадарання, у тым ліку і перапрацоўцы агародніны ( сушка, кансерваванне). На бяседы сяляне хадзілі неахвотна. Хутары былі раскіданы, і на заняткі прыходзіла ў лепшым выпадку 10—15 чалавек, зрэдку — 50. У вёсцы Дуброўнікі Ваўкавыскага павета адзін раз сабраліся 5 чалавек, другі — 6. А сяляне вёскі Трунцы ўвогуле варожа паглядалі на новаўвядзенні[461]. Пасля заняткаў практыкавалі продаж насення і прылад працы — пружынных барон, акучнікаў. Тут жа можна было выпісаць плуг ці сеялку[462].

У многіх месцах сяляне супраціўляліся новай сістэме землекарыстання. Аграномы заяўлялі: «хуторяне...самая тяжелая и дикая масса. Новшеств никаких и знать не хотят. Еще много лет понадобится самой упорной работы, чтобы достичь каких-либо результатов»[463].

Аднак і ва ўсходніх губернях, дзе захоўвалася абшчыннае землекарыстанне, станоўчых вынікаў праца аграномаў не дала. Нягледзячы на вялікія выдаткі (за тры гады на ўтрыманне аграномаў затрачана было толькі ў Гомельскім павеце каля 30 тыс. руб. і яшчэ 8554 руб. на арганізацыю курсаў, гутарак і г. д.). Аграномы скардзіліся, што «приходится бороться с косностью населения и тем громадным препятствием для прогресса в крестьянском хозяйстве, которое представляет общинное пользование землею почти у всех крестьян уезда»[464].

Вельмі цікавыя звесткі пра вопыт так званых паказальных агародаў утрымліваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве ў г. Гродна. Вядома, што ў Гродзенскай губерні было больш хутароў, чым у іншых губернях. Для вырошчвання агародніны лепшымі былі тут кліматычныя ўмовы і глеба, большая частка якой складалася з суглiністых, супясчаных і пясчаных глеб, «цёплых» па сваіх фізічных уласцівасцях. Наяўнасць чыгункі і шашы ствapала добрыя магчымасці для збыту прадукцыі. Усе павятовыя камісіі па землеўпарадкаванню выпісвалі часопісы па агародніцтву, садаводству і пчалярству[465]. Акрамя гэтага для паказальных агародаў выпісвалася насенне з Галандыі, Польшчы, ад рускіх і ўкраінскіх

вытворцаў, а таксама тукі (суперфасфат, салетра, калійныя солі)[466].

У Віленскай губерні былі закладзены паказальныя агароды ў пяці павятовых землеўпарадкавальных камісіях у 1910 і 1911 гг.[467] Былі створаны яны і ў розных паветах Гродзенскай губерні. Так, у Ваўкавыскім павеце іх было 5, у Слонімскім — 3[468]. Работа па паляпшэнню садаводства і агародніцтва праводзілася і ў іншых губернях. У Гомельскім павеце Магілёўскай губерні, напрыклад, яна актывізавалася ў жніўні 1913 г., калі быў запрошаны інструктар. Методыка была такой жа, як і ў іншых месцах: распаўсюджванне новых ведаў, арганізацыя паказальных агародаў, абследаванне сялянскіх агародаў і выкарыстанне на іх добрага насення. Земскім сходам на гэтыя патрэбы было выдаткавана толькі ў Гомельскім павеце ў 1913 г. 750 руб., у 1914 і 1915 гг. — 1620 і 1165 руб. адпаведна[469].

Першыя вынікі, як адзначалі аграномы, паказалі перспектыўнасць такога землеўпарадкавання. Па дадзеных 1912 г., у Брэсцкім павеце на паказальных хутарах пры ўнясенні попелу і фосфарных тукаў ураджай павялічыўся амаль удвая. Напрыклад, бульбы з такіх агародаў сабралі па 820 пудоў, а без угнаення і тукаў — толькі па 450 пудоў[470]. Вес качана капусты ў хутараніна таксама быў у 1,5—2 разы болей, чым у сялян вёсак[471].

Станоўчы вопыт вядзення гаспадаркі быў атрыманы ў земскім маёнтку «Рэчкі» Гомельскага павета, які ў 1910 г. быў падараваны мясцовым памешчыкам Васілём Бачковым губернскаму камітэту па справах земскай гаспадаркі дзеля адкрыцця ў ім сельскагаспадарчага вучылішча[472].

Нягледзячы на засмечанасць зямлі, тут быў атрыманы неблагі ўраджай караняплодаў з дзесяціны: 600 пудоў зялёнагаловай белай морквы, 2418 пудоў — белай іспалінскай. Было сабрана таксама 2 тыс. пудоў бульбы, насенне якой выпісалі з Маскоўскага сельскагаспадарчага інстытута. Істотна паўплывала на ўраджайнасць, як сведчаць сучаснікі, добрае насенне і выкарыстанне ўгнаення. Акрамя таго ў маёнтку быў зроблены гадавальнік, дзе вырошчвалі сваё насенне і вывучалі, якія гатункі лепей вырошчваць у дадзеных прыродна-кліматычных умовах[473].

Сяляне куплялі насенне агародных культур звычайна ў крамах і лаўках местачковых яўрэяў, і яно, па сведчанні аграномаў, было няякасным і не давала добрых ураджаяў. Таму яны прапанавалі закупаць яго з-за мяжы і прадаваць не праз мясцовых настаўнікаў, як гэта практыкавалася ў Расіі, а праз склады землеўпарадкавання, прычым — ва ўпакоўках з адпаведнай інструкцыяй: калі сеяць, як даглядаць пасевы. Прапаноўвалі бясплатнае насенне і тукі для паказальных агародаў і продаж па ільготнай цане астатнім сялянам[474]. Гэта было насенне агародніны першай неабходнасці: капуста, агуркі, морква, цыбуля, буракі, рэдзька і інш. Гаспадары паказальных агародаў, якія атрымлівалі лепшае насенне бясплатна, павінны былі вярнуць з новага ўраджаю выданую ім колькасць насення ці абмяняцца ім з суседзямі[475].

У ведамасці аб выдачы насення і штучных тукаў за 1914 г. значыцца, што хутаранам Ляхавіцкага павета выдадзена было іх на суму 6 руб. 53 кап. Пералічана тут насенне розных сартоў агародніны: гарох, рэпа Пятроўская, бручка, капуста Слава, Гендэр; агуркі Манастырскія, Алісееўскія, цыбуля Мадэрн; салат, морква Нанцкая, пятрушка, фасоль, таматы, а таксама нарвежская салетра, нягашаная вапна[476].

Праз насенныя пункты за 1914 г. па Гродзенскім павеце было прададзена насення на суму 106 руб. 18 кап. Кошт яго быў розны. Так, фунт насення капусты, напрыклад, каштаваў 1 руб. 38 кап.[477].

На паказальных агародах прымянялі наступны севазварот: першы год поле на свежым угнаенні засаджвалі капустай, на другі — саджалі караняплоды (гуркі, цыбулю, буракі, моркву і г. д.), на трэці — бабовыя ці караняплоды, а потым зноў вярталіся да капусты і г. д.[478]. Інструктары вучылі сялян догляду за раслінамі, барацьбе са шкоднікамі. З гэтай мэтай прымяняліся апырсквальнікі «Таўрыда» і «Жульен». Для барацьбы са шкоднікамі набывалі інсектыцыды і фунгіцыды[479].

З ведамасці аб выдачы насення на паказальныя агароды Слонімскага і Ваўкавыскага паветаў у 1914 г. вынікае, што значная яго частка была выпісана з-за мяжы: Германіі, Галандыі, Польшчы. Гэта, аднак, не гарантавала яго якасць:

гэтае насенне часта было дрэнным, позна трапляла на месцы[480]. Звычайна насення хапала па некалькі фунтаў на павет. Так, на ваўкавыскія і слонімскія паказальныя агароды было выдзелена: 4 фунты насення капусты Браўншвейгскай, 1 фунт Эрфурцкай; 3 фунты гуркоў Мурамскіх, 3 — Манастырскіх, 2 — Нежынскіх, 2 — Аксельскіх; морквы Нанцкай — 3 фунты, Браўншвейгскай — 2; рэдзькі белай летняй — 3, зімняй — 2; радыскі Шарлаховага — 2; рэпы Майскай — 3, Пятроўскай — 2; пятрушкі каранёвай Галандскай — 2; цыбулі Цытавускай — 1/2 пуда; гарбузоў Іспалінскіх — 2; мака белага — 1 фунт; буракоў Егіпецкіх — 1/2 уда[481]. У гэтым спісе не хапае таматаў, гароху, фасолі, рэпы, бручкі і інш. Гэтыя, па сведчанні дакумента, «новыя» культуры сеялі ў іншых паветах Гродзенскай губерні. Так, у Беластоцкім павеце сеялі таматы двух сартоў: Аліса Рузвельт і Кароль ранніх, фасоля Англійская жоўтая, ранняя, а таксама белая Рэмантантная і Трыумф зямны, гарох Тэлефоны Картэра, кукуруза Жамчужына Шпіной, рэпа Пятроўская і ранняя, шчаўе Бяльвільскае[482] і інш.

Цікава, што некаторыя з пералічаных гатункаў насення гародніны захаваліся да сённяшняга дня, аб чым сведчыць іх назва. Гэта адносіцца да капусты Браўншвейгскай і Слава, морквы Нанцкай, агуркоў ранніх Мурамскіх, буракоў Егіпецкіх, рэдзькі Пятроўскай і інш. Акрамя адзначаных агародных культур у агародах сеялі каноплі, лён, тытунь, хмель у невялікай колькасці для задавальнення асабістых патрэб[483].

Акрамя насення на паказальныя агароды было выдадзена па 30 фунтаў калійнай солі і па 30 фунтаў чылійскай салетры. У якасці тукаў выкарыстоўваліся яшчэ томасшлак, каініт, суперфасфат, попел, нягашаная вапна. На кожным паказальным агародзе быў зроблены парнік для расады ў выглядзе зруба, у які спачатку клаўся конскі гной (для сагравання), а пасля — пласт зямлі, і накрывалася гэта канструкцыя аконнай рамай і саламяным «матам»[484]. Дарэчы, гэты спосаб вырошчвання расады агародніны захаваўся ў асобных сялян да сённяшняга дня.

Аграрная рэформа дапамагала сялянам даведацца аб новых агратэхнічных прыёмах, новых культурах, новых прыладах працы. Вопыт паказальных хутароў вызначыў і выгад-

насць змены культур у параўнанні з трохполлем. Сяляне пачалі практыкаваць севазварот (чарагаванне раслін) у сваіх гаспадарках. Не ўсе з іх маглі набыць новыя прылады працы, таму існавалі пракатныя станцыі, дзе за 5 кап. у суткі селянін мог карыстацца плугам ці акучнікам, за 10 кап. — пружыннай бараной[485] і г. д.

Як ужо адзначалася, не заўсёды прывезенае з-за мяжы насенне было якасным. Таму аграномамі ставілася задача стварэння свайго насенняводства. Вядома, і раней сяляне збіралі сваё насенне капусты, агуркоў, але яго не хапала, ды і якасць была дрэннай (яно выраджалася), таму і куплялі на рынках ці ў мясцовых лаўках, дзе прадавалася пераважна насенне варшаўскіх насенняводаў — Гозера, Васілеўскага і інш. У вялікіх гарадах, куды не кожны селянін патрапіць, можна было набыць лепшае насенне Эрфурта[486].

Заможныя гаспадары маглі сабе дазволіць выпісаць агароднае насенне з Варшаўскай і Віленскай фірм Велера, з Масквы — Умлера, з Кіева — Меера. Прадавалі насенне і камерцыйныя аддзелы сельскагаспадарчых таварыстваў. Так, у г. Магілёве такі аддзел размяшчаўся на Шклоўскім базары і прапаноўваў не толькі агароднае насенне, але і апырсквальнікі розных сістэм, разнастайныя сродкі барацьбы са шкоднікамі, штучныя тукі (томасшлак рускі і замежны, суперфасфат, чылійскую салетру, калійную соль, каініт і інш.)[487]. Яўрэі-агароднікі з гарадоў і мястэчак Гродзенскай губерні атрымлівалі насенне з-за мяжы праз аб’яднанне «Еко»[488]. Не дзіва, што і ўраджай у заможных гаспадароў быў вышэйшы, чым у сялян.

Падсумоўваючы сказанае, трэба адзначыць, што не ўсё добра складвалася ў зямельнай рэформе. Не толькі сяляне сабатавалі яе правядзенне. З дакументаў бачна, што асобныя захады, якія рабіліся ўладай, былі толькі на паперы. Так, Дэпартаментам земляробства ў 1912 г. асабістым гаспадаркам Гродзенскай губерні было выдаткавана 75 тыс. руб., з іх на садаводства і агародніцтва толькі 1595 руб.[489]. Прычым амаль усе грошы былі выдаткаваны на арганізацыю садоў. Інструктар па садаводству і агародніцтву В. Андрыевіч з Кобрынскага павета ў 1912 г. паведамляў, што з-за адсутнасці крэдыту ўся праца звялася да набыцця сялянамі лепшага

насення. За кошт гаспадароў было закладзена некалькі ўзорна-паказальных градак у вёсках Крыстышына, Гніеўчыцы, Заруддзе, Дружылавічы. Існуючае агародніцтва трэцяга агранамічнага ўчастка, як зазначаў ён, так дрэнна пастаўлена, што не мае ніякага значэння ў жыцці сялянства, хаця менавіта ў агародах яны бачаць адзіны сродак паляпшэння свайго сціплага харчавання[490].

Калі паглядзець ведамасць агранамічных мерапрыемстваў Гродзенскай губерні, можна ўбачыць, што сродкі на развіццё агародніцтва асобных паветаў увогуле не выдзяляліся. Так, у балансавай ведамасці Пружанскай павятовай землеўпарадкавальнай камісіі па агранамічных мерапрыемствах за 1912 г. насупраць артыкула «агародніцтва» стаіць прочырк. Такое ж становішча склалася ў Беластоцкім, Слонімскім, Сакольскім і інш. паветах[491]. Гледзячы на паказальныя гаспадаркі, сяляне мясцовых вёсак быццам бы ўхвалялі іх вопыт, але падкрэслівалі, што за свой кошт гэтага зрабіць не могуць[492].

На ўраджайнасць паказальных агародаў, як і іншых, уплывалі метэаралагічныя ўмовы. Так, у 1913 г. сырое, халоднае надвор'е не спрыяла росту раслін. Да таго ж многія хутарскія агароды былі заліты вадой, і ўраджай быў дрэнны. З сямі паказальных агародаў толькі ў 2 выпадках вынік быў задавальняючы[493]. Упершыню сялянам быў прапанаваны продаж насення па нарыхтоўчых цэнах, і ўсяго было прададзена 1 пуд 33 фунты. Былі тут розныя гатункі агуркоў, морквы, бручкі, цыбулі, гарбузоў, бабоў, гароху і г. д.[494].

У 1914 г. стыхійнае бедства спасцігла Магілёўскую губерню, дзе засушлівае надвор'е стаяла з 20-ых лічбаў мая да сярэдзіны ліпеня. Былі пашкоджаны ўсе расліны, у тым ліку і агародныя. У цэнтральных паветах пасохла бацвінне бульбы, морквы, буракоў і інш. У паўднёвых паветах вялікую шкоду нарабіў град. У в. Каралькі Аршанскага павета граду за 15 хвілін выпала столькі, што ён ляжаў на палях каля сутак. Тое ж адбылося і ў в. Сялюты Клімавіцкага павета, дзе град быў з галубінае яйка і павыбіваў шыбы ў вокнах, не кажучы ўжо пра расліны[495].

Сярод гатункаў бульбы ў гэты час былі вядомы: Імператар, Амерыканка, Сілезія, Вольтман, Рускі[496]. Сяляне, якія мелі ў сваім карыстанні дастатковую колькасць зямлі, ка-

раняплоды для жывёлы не вырошчвалі, толькі падкармлівалі крыху бульбай, калі быў яе лішак[497].

***Угнаенні.*** Спачатку крыніцай калію на сялянскім агародзе быў попел. Пячны попел да сённяшняга дня застаецца важным тукам. У пачатку XX ст. недахоп калію кампенсавалі за кошт нямецкіх калійных тукаў: каініта (з утрыманнем калію 13—14 %), калійнай солі (30—40 %). Акрамя калію яны ўтрымлівалі і хлорысты натрый (паваранае соль), і сернакіслую магнезію[498]. Завозілі і рускія калійныя тукі, якія лічыліся карыснымі для балотнай глебы і кіслых лугоў, попел з адыходаў ад паўднёвых заводаў па перапрацоўцы буракоў, які не толькі ўтрымліваў многа калію, фосфару, вапны, але і шкоднае рэчыва — серу (0,2 %)[499]. Недахоп гною кампенсаваў і аміяк, які ў пачатку XX ст. прыйшоў на змену чылійскай салетры.

Як адзначалася, выкарыстанне штучных тукаў было звязана з недахопам жывёлы ў гаспадарках. Таму сяляне вымушаны былі ўжываць на сваіх агародах мінеральныя тукі. Цікавы вопыт выкарыстання іх у пасевах капусты быў назапашаны ў Магілёўскай губерні ў 1906—1913 гг. Тут пачалі ўносіць розныя мінеральныя ўгнаенні, за выключэннем чылійскай салетры, на эксперыментальных агародах, за два тыдні да пасеву капусты і праз два тыдні пасля яго. Салетру ўносілі за тыдзень да пасеву. На думку эксперыментатараў, пуд салетры павялічваў ураджай на 32,3 пуда, пуд суперфасфату — на 27,5, а попелу — на 4,1 пуда[500]. Вопыты паказалі, што найбольш карыснымі аказаліся малыя дозы мінеральных угнаенняў: на ўчастках, дзе іх было ўнесена многа, ураджайнасць зніжалася[501].

Ужывалі ў гэты час і вадкае ўгнаенне. У яму ці бочку да паловы клалі тлусты гной і далівалі даверху вадой, праз некаторы час пamешвалі. Угнаенне лічылася гатовым праз два тыдні, калі яно паспяхова перабродзіць, і ім паліваліся агародныя культуры. Перапрэлы гной найстойвалі ўсяго 3 дні і перад палівам разбаўлялі папалам з вадой[502]. Палівалі ў сырое надвор'е, пасля дажджу, тады ён добра ўсмоктваўся ў глебу і расліны з найбольшай карысцю яго спажывалі.

Вядомым танным і высакаякасным азоцістым угнаеннем лічыўся кампост. Кампостную яму рабілі, як нам вядома,

здаўна. У першай палове XIX ст. яе называлі «гнаярняй», ці гнаявой ямай[503]. Такія ямы практыкавалі ў панскіх маёнтках. Дно гнаярні выбрукоўвалі, сцены абкладвалі каменнем, каб жыжка не ўсмоктвалася ў зямлю. На кожным рагу ямы ўкапвалі 4 слупы і майстравалі на лета паветку, потым яе здымалі, калі сонца ўжо не пякло, а дажджы і снег папаўнялі гной часцінкамі салетры. У гнаярню скідвалі ўсялякае смецце, гной, кавалкі дзірвану, глей з сажалкі, трэсачкі, лісце, шышкі, хваёвыя галінкі, мох, ільняную і канапляную кастру, старую салому, пустазелле. Усё гэта перасцілалі слаямі гною. У яму ішлі памыйкі, вантробы жывёл і птушак. Каб выцягнуць гной з такой глыбокай ямы вясной, рабілі спецыяльнае прыстасаванне, накшталт жураўля ў студні, з папярэчных рухомых бэлек, да гэтага прыстасавання мацавалася скрыня. Людзі, якія стаялі ў яме, накладвалі скрыню кампосту рыдлёўкамі і сахорамі (вілы. — *Л.Р.*), а тыя, што зверху, — падымалі яе, націскаючы на супрацьлеглы канец бэлькі. Тут жа кампост са скрыні ссоўваўся на калёсы і вывозіўся на палеткі[504].

У 1914 г. кампост рабілі наступным чынам: на 4—5 вяршкоў таўшчыні, каля 2—3 аршынаў шырыні і любой даўжыні клалі торф, на яго — слой паташу (да 1 вяршка) або попелу, 2—4 вазы гною (для бактэрый), потым палівалі гнаявой жыжай. Наступны слой паўтараў першы, і так клалі да тае пары, пакуль куча стане $1\,^3/_4$ аршына ў вышыню[505]. Кучы надавалі форму хаты (верх звужалі). Такія кампостныя ямы рабілі на балоце. Выкарыстоўвалі кампост, калі ён добра перапрэе, стане рассыпістым, не раней чым праз паўтара года. Попел драўняны не выкідвалі, а складвалі дзе-небудзь пад навесам і накрывалі, а вясной вывозілі ў поле і на агарод. У пачатку зімы па першым санным шляху вывозілі на агароды торф. Торф, перапрэлы і змешаны з гашанай вапнай, быў вельмі добрым угнаеннем[506].

Сяляне заўважалі, што больш высокія ўраджаі, чым гной на саламянай падсцілцы, дае тарфяны гной, у якім утрымліваліся фосфарныя і калійныя рэчывы, азот. Тарфяны гной паляпшаў фізічны стан глебы, добра ўтрымліваў вільгаць і ствараў, такім чынам, лепшыя ўмовы для росту раслін, павышаючы ўраджайнасць на 40 %[507]. Адносна танным было гэта ўгнаенне з-за вялікай колькасці балот.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі адбыўся падзел зямлі паміж сялянамі, тым, каму трапіла «няўдобіца» (дрэнная зямля), памер зямлі павялічвалі ўдвая[508]. М. Улашчык лічыў, што для таго, каб вялікая сялянская сям'я жыла заможна, ёй трэба было каля 20 дзесяцін зямлі[509].

Адразу пасля рэвалюцыі павятовыя земствы з гаспадаркамі перайшлі зямельным камітэтам. Цяпер яны сталі распараджацца зямлёй, у тым ліку прыватнаўласніцкай. Узначаліў справу камісарыят земляробства. Паводле пастановы Магілёўскага губернскага камітэта ад 30 студзеня 1918 г., памешчыкам, калі яны мелі намер апрацоўваць зямлю, пакідалі ў часовае карыстанне «усадебную землю с садом и огородом размером 10 десятин», а таксама аранжарэі і парнікі. Далей паведамлялася, што «размер сада и огорода не должен превышать более 2 десятин»[510]. У тых выпадках, калі памер сям'і памешчыка быў вышэй сярэдняга (больш як 7 чалавек), плошча землекарыстання павялічвалася на 1 дзесяціну на кожнага едака. Памешчыкам пакідалі жылыя і сельскагаспадарчыя памяшканні ў колькасці, патрэбнай для абслугоўвання, а таксама 2 коней, 3 каровы, 2 цялят, 2 дарослых свіней і 3 падсвінкаў, 5 авечак[511].

Здавалася, што памешчыкі захавалі частку маёмасці і зямлі. Аднак з таго, што астаўлялі ім, значная частка раскрадалася. Так, пастановай Магілёўскага зямельнага камітэта прапаноўвалася сялянам, якія абрабавалі маёнтак (укралі рабочы інвентар), заплаціць 1/4 частку яго кошту валасному зямельнаму камітэту[512]. 20 лютага 1918 г., паводле пастановы № 422 Магілёўскай земскай управы, сялянам дазвалялася ўзяць з маёнткаў дробныя машыны і прылады працы для вядзення сваёй гаспадаркі[513].

Экспрапрыяцыя зямлі працягвалася. Камісарыят земляробства пастанавіў абкласці падаткам па 50 руб. за кожную дзесяціну, калі ў гаспадара их было звыш 25. Не адчужаўся толькі маёнтак, лішкі зямлі (калі было звыш 50 дзесяцін) перадаваліся ў зямельны фонд, з якога надзяляліся зямлёй у першую чаргу беззямельныя і малазямельныя[514]. Зямельныя камітэты не распараджаліся гарадскімі землямі і тымі, што былі пад дачнымі паселішчамі і санаторыямі, а таксама

прыгараднымі землямі пад садамі і агародамі, якія належалі фабрычна-заводскім прадпрыемствам.

Зямельныя камітэты мелі благі намер, каб ніводзін кавалак памешчыцкай зямлі не застаўся неапрацаваным, каб яна была не толькі захавана, але і палепшана, «дабы увеличить количество народных богатств»[515].

У 1920 г. з мэтай аказання дапамогі сялянскім гаспадаркам былі створаны сельскагаспадарчыя і вытворчыя майстэрні губземаддзела: слясарныя, кавальскія, сталярныя, такарныя і іншыя для рамонту сельгасмашын, інвентару і вырабу нескладаных сельгаспрылад. У валасцях у майстэрнях працавала ад 5 да 6 чалавек, у цэнтры павета — да 20[516]. Вядома, што ў першую чаргу майстэрні абслугоўвалі пракатныя пункты сельгасмашын, а таксама камунальныя, арцельныя і гаспадаркі чырвонаармейцаў[517].

Агранамічная дапамога губземаддзела ўключала ў сябе распрацоўку норм апрацоўкі глебы. Так, араць рэкамендавалася глыбінёй на 3—4 вяршкі, па ўсёй плошчы аднолькава, абавязкова вуглы і павароты. У дзень адзін рабочы, па норме, павінен быў уручную выкапаць 25 куб. саж. зямлі на штык рыдлёўкі альбо нарыць і пакласці на калёсы 25 вазоў гною, разгрузіць 50, раскідаць па полю 25 пудоў гною; пасадзіць 150 кв. сажняў буракоў і іншай гародніны ці 100 кв. сажняў расады[518].

Для апрацоўкі глебы выкарыстоўваліся розныя прылады: адна-, двух- і трохлемешныя плугі, сохі, аднаконная барана Валькура, двухконная барана «Зіг-Заг», дыскаваная барана «Рондаль» цяжкая (разлічаная на трох-, чатырохзменных коней) і лёгкая (на двухзменных коней), эксціпатар пяцілапчаты, а таксама культыватары[519].

Насеннем забяспечваліся перш за ўсё калектыўныя гаспадаркі. А тое, што заставалася, як сказана ў Інструкцыі № 23262 ад 25 лістапада 1920 г. па распаўсюджанню агароднага насення Цэнтральнага ўпраўлення аддзела забеспячэння, прадавалі рабочым і служачым, а таксама прыватным агароднікам. Дапамога насеннем ажыццяўлялася на практыцы праз заводскія камітэты і камуны за наяўны разлік. А цэны, як кажуць, «кусаліся». Так, за пуд насення капусты трэба было выкласці 300 тыс. руб., за моркву сталовую —

50 тыс., мясцовую — 25, буракі сталовыя салатных гатункаў — 50, рэдзьку зімнюю — 80, пятрушку — 25, бручку — 40, агуркі — 60, насенне цыбулі — 60, бабы — 16, гарох агародны — 14, фасоль — 15, рэпу — 80 тыс. і г. д.[520].

Гэта быў цяжкі час. За гады Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў рэзка скарацілася плошча пасеваў, знізілася прадукцыйнасць працы, не хапала насення і сельгасмашын. Сельская гаспадарка была ў руках дробных сялян. Народны камісарыят земляробства ў 1920 г. выдаў «Положение о Всероссийском съезде деятелей агрономической помощи»[521], якое, у сувязі з харчразвёрсткай, патрабавала новай арганізацыі сельскай гаспадаркі і ўстанаўлівала магчымыя формы такой арганізацыі ў паляводстве, сядзібнай гаспадарцы, агародніцтве і г. д.

Была выдадзена брашура па развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці, аказанні дапамогі сялянскім гаспадаркам. Цікава, што правядзенне мерапрыемстваў меркавалася па адзінаму дзяржаўнаму плану для ўсіх катэгорый гаспадарак. Перш за ўсё ў планах было імкненне знішчыць цераспалосіцу, аддаленасць зямель, правесці рассяленне на пасёлкі, выселкі, развіваць шматполле[522]. Адным з першых крокаў у гэтым напрамку была арганізацыя агародаў паблізу гарадоў і прамысловых цэнтраў для забеспячэння насельніцтва харчаваннем.

Агародніцтва з пункту гледжання народнага камісарыята земляробства лічылася перспектыўнай галіной сельскай гаспадаркі. Агародныя культуры «давали максимум питательных веществ с единицы площади», а гэта ва ўмовах недахопу хлеба, мяса, лою ў пасляваенны час магло задаволіць у пэўнай ступені недахоп харчавання. Больш таго, расшырэнне плошчы і павышэнне ўраджайнасці агародных культур, раздача зямель пад агароды паблізу гарадоў маглі спрыяць «поўнаму задавальненню патрэб насельніцтва ў агародніне ў памеры гадавой нормы»[523].

Прадугледжвалася забеспячэнне агароднікаў тэхнікай і прыладамі працы. Аднак з сельгасінвентаром у паветах стваралася крытычнае становішча: з цэнтра яго не прысылалі, майстэрні ж па рамонту не паспявалі задаволіць усе патрэбы, ды і не ўсе з іх працавалі здавальняюча. У цыркуляры

(1921 г.) Быхаўскаму павятоваму земаддзелу адзначалася, што трэба напружыцца, каб адрамантаваць усю тэхніку і «немедленно принять меры для устранения той расхлябанности и того безумия, которые имеют место до сих пор»[524].

Для ўгнаення зямель, прызначаных пад агароды, збіралі гарадскія адкіды, выкарыстоўвалі нават каналізацыйныя адкіды, попел, тарфяны паташ і г. д. Але адной з самых няпростых задач была задача навучыць насельніцтва арганізацыі агародніцтва, тэхналогіі і прыёмам апрацоўкі глебы, а таксама карыстацца новымі прыладамі працы і г. д. З гэтай мэтай былі арганізаваны курсы, гутаркі; да паслуг насельніцтва працавалі розныя майстэрні і пракатныя станцыі сельгасмашын.

У 1919 г. многія агароды, асабліва ў памешчыцкіх маёнтках, зарасталі пустазеллем: не хапала насення, сельгасмашын, працоўных рук. Загадчык Магілёўскага губземаддзела Валенберг у студзені 1919 г. звяртаўся ў Маскву ў Наркамзем з просьбай аб дапамозе набыцця агароднага і палявога насення. Інакш, як гаварылася ў тэлеграме, «агароды і палі застануцца незасеянымі»[525].

Закон аб нацыяналізацыі зямлі, прыняты савецкай уладай, праводзілі ў жыццё губернскія зямельныя ўпраўленні. Высяляліся са сваіх маёнткаў памешчыкі, а іх землі размяркоўваліся па едаках, за выключэннем тых, на якіх ствараліся працоўныя камуны. Паводле цыркуляра Віцебскага губземаддзела (красавік 1919 г.), устанаўліваўся парадак арганізацыі садовых і агародных гаспадарак. Усе агароды і сады «нетрудового пользования» пераходзілі ў распараджэнне земаддзелаў, якія размяркоўвалі іх не толькі сялянам, але і аб'яднанням прамысловага пралетарыяту. Напрыклад, Віцебскі цагляны завод атрымаў пад агароды 5 дзесяцін зямлі былога фальварка Пятроўскага, камітэт губкааперсаюза — 1 дзесяціну і г. д. Пры прыватных дамах у гараджан меліся невялікія агароды, многія атрымалі яшчэ дадаткова агародную зямлю за межамі горада.

Каб сабраць добры ўраджай агародніны, трэба было добра ўгноіць агарод. У народзе казалі: «Зямля — талерка: што пакладзеш, то і возьмеш». Не хапала гною і мінеральных угнаенняў не толькі ў асабістых гаспадарках. Да таго ж ула-

да прымушала насельніцтва аддаваць частку іх для ўгнаення калектыўных гаспадарак. Так, цыркуляр № 49 ад 5 лютага 1921 г. Віцебскага губземупраўлення прадпісваў устаноўку каля прыватных дамоў яшчыкаў для збору попелу, багатага каліем, з якіх 1 і 5 чысла кожнага месяца ён вымаўся і вывозіўся на арцельныя агароды. На землі арцельных агароднікаў, па ўказанні земаддзела, вывозілі таксама гной і асенізатарскія адыходы. Ніводны гаспадар не мог без рэгістрацыі і выдачы яму адпаведнага ордэра земаддзела вывезці гной ці іншае ўгнаенне на свае агароды, бо ў процілеглым выпадку абозы з гноем і попелам канфіскоўваліся, а вінаватыя падлягалі суду[526].

Грамадскія (арцельныя) агароды, якія знаходзіліся ў аддаленні ад населеных пунктаў, часта падвяргаліся спусташэнню. Так, 26 жніўня 1919г. Віцебскі губернскі Савет сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў звяртаўся да губваенкома аб пастаноўцы каравула каля агародаў селекцыйна-вопытнай станцыі губземаддзела, якія падвяргаліся разгрому з боку праходзячых і праязджаючых эшалонаў войскаў. У звароце гаварылася, што выбіраецца бульба, агуркі і іншая агародніна не толькі з прыватных агародаў, але і з вопытных участкаў, што вядзе да вялікіх страт[527].

Трэба сказаць, што і ў 20-ыя гг. XX ст. агародніцтва паранейшаму не адыгрывала прыкметнай ролі ў агульным строі сельскай гаспадаркі з-за свайго асабліва спажывецкага характару і слабага развіцця прамысловага агародніцтва, якое развівалася пераважна ў падгародных вёсках і мястэчках.

Развіццё агародніцтва тармазілі адсутнасць агратэхнічных ведаў у асноўнай часткі насельніцтва, незабяспечанасць сялянскіх гаспадарак новымі сельскагаспадарчымі прыладамі працы і машынамі, дабраякасным насеннем і інш. Да таго ж сяляне прызвычаіліся абапірацца на вопыт бацькоў і дзедаў. Не спрыяла яго развіццю і тое, што на агародах працавалі пераважна жанчыны. Многія з адзначаных праблем звярталі на сябе ўвагу кіраўніцтва губземаддзелаў, рабіліся захады па іх пераадоленні. У межах вялікіх гарадоў, напрыклад, забараняліся культуры збожжавых і бульба на агародах і прапаноўвалася палавіну плошчы засаджваць капустай, палавіну — іншай агароднінай[528]. Для таго каб плошчы скары-

стоўваліся як мага з большай карысцю, пастановай Віцебскага губземаддзела ад 29.1.1921 г., напрыклад, прадугледжвалася арганізацыя арцеляў агароднікаў, якім папярэдне давалася заданне, калі яны з 1 дзесяціны агароднай зямлі павінны былі здаць ад 1000 да 1300 пудоў агародніны па цэнах губземаддзелаў. Пакідалі толькі па норме столькі, колькі трэба для патрэб гаспадаркі. Арцелям адпускалася насенне агародніны, фураж для жывёлы (авёс) і паёк для яе членаў[529]. Паёк на працуючага члена агароднай арцелі складаў 30 фунтаў мукі, на непрацуючага — 18 фунтаў, а астатняе размяркоўвалася аднолькава: рыбы 4 фунты, солі — 2 фунты. Акрамя гэтага на кожную дзесяціну агароднай зямлі вытворцам выдавалі 15 аршын тканіны, 5 каробак запалак, 3 фунты газы, 2 фунты тытуню, 2 фунты — дзёгцю, 5 фунтаў — вяроўкі[530].

На агародніцтва і бахчаводства быў накладзены падатак у 275 пудоў з дзесяціны ў перакладзе на капусту. Прычым 1 пуд капусты мог быць заменены 12 фунтамі цыбулі ці 20 фунтамі морквы, 20 фунтамі буракоў сталовых, 30 фунтамі бульбы, 50 фунтамі агуркоў[531].

Каб селянін меў магчымасць самастойна рацыянальна будаваць сваю гаспадарку, у канцы 20-ых гг. арганізоўваліся курсы для дарослых сялян (35—40 слухачоў) з мэтай атрымання мінімуму сельскагаспадарчых ведаў. На курсах чыталі лекцыі і праводзілі практычныя заняткі раённыя аграномы і выкладчыкі сельскагаспадарчых школ[532].

Успомнілі ў той час і пра вопыт паказальных агародаў пачатку XX ст. У 1925—1926 гг. актыўна прапагандавалі вопыт так званых культурна-паказальных гаспадарак, якія выкарыстоўвалі на практыцы агранамічныя веды па новых тэхналогіях вядзення агародніцтва з прымяненнем трох-, чатырох- і нават дзевяціпольнай сістэмы, падрыхтоўцы глебы з восені, выкарыстанні добрага насення, мінеральных угнаенняў, а таксама трыманні навукова-абгрунтаванага чаргавання культур і г. д. Гэта былі гаспадаркі аднаасобнікаў, якія мелі ад 0,5 да 2 дзесяцін агароднай зямлі. Апрацоўкай зямлі займалася даволі вялікая сям'я. Нярэдка зямлю апрацоўвалі брацкія сем'і. Так, браты Шопель (в. Канцавая Полацкага р-на) апрацоўвалі 51 дзесяціну зямлі, з якіх было 2

дзесяціны агароднай зямлі, сваёй сям'ёй у колькасці 15 чалавек (7 мужчын і 8 жанчын). І акрамя саміх сябе павінны былі карміць яшчэ 10 утрыманцаў[533]. У в. Маслава Пруднікаўскага с/с Валынецкага р-на ў паказальнай гаспадарцы было 8 працаздольных і 2 — утрыманцы. З 21 дзесяціны ворнай зямлі 1 $^{1}/_{2}$ прыходзілася на агарод[534]. Гэтыя гаспадаркі знаходзіліся на хутарах.

Паводле паказальных гаспадарак, з агародных культур перавага тут аддавалася бульбе, капусце, буракам, агуркам. Сеялі таксама бручку, моркву, цыбулю, гарох і іншыя культуры. У дакуменце падкрэслівалася, што ў хутарскіх гаспадарках атрымлівалі больш высокія ўраджаі, чым у сялянскіх. Так, ураджай бульбы ў сярэднім у іх дасягаў 1000—1500 пудоў з дзесяціны і болей (у сялян — 400—600 пудоў). Капусты збіралі 4, 800 пудоў з дзесяціны, бручкі і морквы па 3, 000 пудоў з дзесяціны[535].

Па большай частцы сяляне мелі агароды спажывецкага тыпу, якія забяспечвалі агароднінай сям'ю, а скаціну — кормам. Тым не меней асобныя гаспадары з поспехам вырошчвалі і прадавалі расаду і насенне капусты, бручкі і іншай агародніны (да 5 тыс. штук штогод)[536]. Прадавалі і лішкі бульбы, буракоў, капусты.

Паказальныя гаспадаркі выкарыстоўвалі ў агародніцтве трохполле: (1 — капуста, 2 — караняплоды, 3 — бабовыя[537]). На хутары Іванава Расонскага р-на браты Роберт і Карл Кацэны ў апрацоўцы агароднай зямлі выкарыстоўвалі чатырохполле яшчэ з 1880 г. Першы год расла капуста, другі — бручка і буракі, трэці — морква, чацвёрты — боб[538]. 25 % агароднай зямлі было засеяна капустай, па 25 % — буракамі і бобам, 5 % — бручкай і морквай і 20 % — астатняй агароднінай.

Галоўны сакрэт у атрыманні добрых ураджаяў уладальнікаў культурна-паказальных гаспадарак, як вынікае з дакументаў, — у выкарыстанні пэўных агратэхнічных прыёмаў, унясенні неабходнай колькасці арганічных і мінеральных угнаенняў, прытрымліванні аптымальных тэрмінаў пасеву і збору ўраджаю і інш. Так, гною сялянамі клалася ад 1500 да 2400 пудоў на дзесяціну[539]. Прычым гной уносіўся восенню. Пад капусту і агуркі яго часцей клалі вясной[540].

Асобныя гаспадары зямлю на агародах (разам з гноем) аралі ўвосень, а вясной толькі баранавалі, другія аралі вясной «на поўную глыбіню», а перад пасевам (за 3—4 дні) — «траілі». Уносілі мінеральныя ўгнаенні: томасшлак, калійную соль, чылійскую салетру, суперфасфат. Суперфасфату ўносілі ад 15 да 36 пудоў на дзесяціну, калійнай солі — ад 5 да 12 пудоў, столькі ж — томасшлаку[541]. Прымянялася таксама костная мука і торф.

Немалаважную ролю адыгрывала чаргаванне культур, што дазваляла шматполле. Расліны, якія вярталіся на сваё месца праз некалькі гадоў, менш хварэлі і пашкоджваліся шкоднікамі. Правільны севазварот, які ўлічваў, якая расліна лепей расце пасля папярэдняй, таксама спрыяў ураджайнасці, як і своечасовая «полка» (праполка), паліў, акучванне і інш. Сяляне выкарыстоўвалі і такі спосаб, як вырошчванне буракоў «фляксамі», пры гэтым выбіралася лепшая расада буракоў пры прарэджванні і высаджвалася ў іншых месцах. Дарэчы, з расады буракі часцей раслі больш буйнымі.

Трэба сказаць, што перадавыя агародныя арцелі і асобныя гаспадары за сваю гаспадарчую дзейнасць атрымлівалі ўзнагароды — прэміі (сельскагаспадарчымі прыладамі, машынамі, насеннем, мінеральнымі ўгнаеннямі, племянным пасадачным матэрыялам). Памер прэміі залежаў ад працэнта сельскагаспадарчага падатку гаспадаркі, якой яна прысуджалася.

Гаспадары-аднаасобнікі па выніках 1925—1926 гг. атрымалі прэміі за вырошчванне добрага пасадачнага матэрыяла, найбольш прыстасаванага да мясцовых умоў, перш за ўсё капусты, таматаў, агуркоў на плошчы не меней ¼ дзесяціны. Адбывалася гэта ў Дзень ураджаю, пасля ўрачыстага дакладу ў райцэнтры. Свята суправаджалася выставай, кірмашом сельскагаспадарчай прадукцыі, народнымі гуляннямі і ўручэннем прэмій. Так, на Полацкай выставе 1926 г. прэміі атрымалі: школа сялянскай моладзі, якая вырасціла капусту Слава весам у 39 фунтаў, гаспадар Марозаў за фасолю з 42 стручкамі, боб Вендзарскі з 36 стручкоў на адной бабіне. Прэмію атрымаў уладар гарбуза весам у 2 пуды і 2 ½ фунта і інш.[542]. Школа агародніцтва была прэміравана плугам і акучнікам, сялянін В. Мураўскі — плугам і бараной, І. Фе-

дарэнка — плугам і садовымі нажніцамі, іншыя атрымалі косы, насенне канюшыны і г. д.[543].

Паказальныя гаспадаркі агароднікаў, на якія рабілі стаўку ўлады па распаўсюджванні передавога вопыту вырошчвання агародніны і на якія выдаткоўваліся бюджэтныя сродкі, сапраўды давалі неблагія ўраджаі. Да 1930г. побач з існуючымі планавалася стварыць 500 паказальных агародаў, агульнай плошчай у 62 дзесяціны (лічачы 1 насенны агарод у 3 дзесяціны і паказальны — у 1/8 дзесяціны). На арганізацыю аднаго агарода з бюджэта 1925/1926 гг. выдатковувалася па 10, а 1926/1927 гг. — па 15 руб.[544]. Па дадзеных 1925/1926 гг., ураджай на паказальных агародах Полацкай акругі, напрыклад, складаў: капусты — ад 990 да 2000 пудоў з дзесяціны; буракоў — ад 700 да 1500 пудоў, морквы — ад 600 да 1000 пудоў, бульбы — ад 1250 да 2000 і болей[545].

Па статыстычных дадзеных, у Беларусі агульная плошча агародаў у 1924 г. складала прыкладна 22 000 дзесяцін. Большая частка іх належала сялянам, якія па-ранейшаму слаба ведалі тэхніку агароднай справы і атрымлівалі невысокія ўраджаі.

**Плошча агародаў і ўраджайнасць асобных культур па БССР у 1924 г.**[546]

| Назвы культур | Плошча ў дзесяцінах | Валавы збор ураджаю ў тыс. пудоў | Сярэднія цэны (за пуд) у руб. | Ураджай з дзесяціны (у пудах) |
|---|---|---|---|---|
| Капуста качанная | 5800 | 4935,5 | 0,37 | 850 |
| Буракі | 4200 | 3355,3 | 0,30 | 240 |
| Цыбуля | 1900 | 1072,8 | 1,07 | 604 |
| Іншыя культуры | 10 100 | 11 310,0 | 0,24 | 268 |
| Усяго | 22 000 | 20 673,6 | | |

Наркамзем звяртаў увагу мясцовых земаддзелаў на неабходнасць вырошчвання на сялянскіх агародах хмелю як інтэнсіўнай культуры, патрэбу ў якім мела прамысловасць. У 1925/1926 гг. трэба было 2 тыс. пудоў хмелю, які куплялі ў Ва-

лынскай губерні Украіны, часткова — за мяжой. А цана, як вядома, была вялікай: ад 80 да 240 руб. за пуд, пры сабекошце 40—50 руб. Меркавалася пасадзіць на 75 дзесяцінах хмельнікі, на якіх з адной дзесяціны можна было атрымліваць да 40 пудоў хмелю[547]. Для адбору лепшых гатункаў хмелю ў Горацкай сельскагаспадарчай школе закладваўся паказальны хмельнік на плошчы ў 1 дзесяціну за кошт бюджэту[548].

Клопаты аб неабходнасці развіцця агародніцтва ў канцы 20-ых гг. XX ст. выклікалі неабходнасць даследаванняў агароднай справы ў сялянскіх гаспадарках, якія праводзіліся з мэтай выяўлення ў сялян асноўных агародных культур, часу іх уборкі, ураджайнасці, тэрмінаў ворыва і г. д. Так, па дадзеных апытання вясковага насельніцтва Віцебскай вобласці ў 1926/1927 гг., было выяўлена, што большасць гаспадароў першае ворыва зямлі праводзілі ў маі, другое — ў канцы жніўня. Найбольш распаўсюджанымі агароднымі культурамі былі: бульба, капуста, буракі, агуркі, цыбуля, морква, часнок, бручка[549]. Цікавыя звесткі былі атрыманы пра тэрміны ўборкі на сядзібе асобных агародных культур. Так, бульба ў летні час капалася ўжо з ліпеня. Асноўную ўборку яе сяляне праводзілі з пачатку верасня да канца кастрычніка; цыбулю выбіралі з сярэдзіны жніўня па першую дэкаду верасня; буракі і моркву пачыналі ўбіраць у канцы верасня да 20-ых чыслаў кастрычніка; агуркі для засолкі — з канца ліпеня да пачатку жніўня. Капуста традыцыйна ўбіралася з агарода апошняй — перад замаразкамі ў канцы кастрычніка — пачатку лістапада. Пры гэтым рэспандэнты падкрэслівалі, што ў першую чаргу збіралі агародніну ў полі, а каля дома тады, калі ёсць час. Сярэднім лічыўся ўраджай цыбулі, калі на 16 кв. сажнях вырошчвалі з 15—16 фунтаў насення 2—3 пуды. Сяляне лічылі добрым ураджай агуркоў у 30 пудоў, морквы ў 25 пудоў на 32 кв. сажнях[550].

Падобная праца вялася і ў іншых месцах. Каля Магілёва існаваў вопытна-паказальны агарод пры так званай «Зіноўеўскай школе садаводства», які налічваў звыш 10 дзесяцін. Але бульба, якую там вырошчвалі, радзіла дрэнна з-за няякаснага насеннага матэрыялу[551]. У агародах сеялі таксама гарбузы, турнэпс, рэпу, рэдзьку[552].

Цікава, што ў першыя гады ўлады Саветаў для пасеву агародаў выкарыстоўвалі тое ж насенне, што і ў папярэдні час. Так, з ведамасці аб патрэбнай колькасці агароднага насення на 1919 г. па Клімавіцкаму павету Магілёўскай губерні бачна, што ў павеце сеялі амаль усе тыя ж культуры: буракі сталовыя Егіпецкія і Кажухоўскія, якіх было заказана для пасеву 36 пудоў, Якендорфскія доўгія (12 пудоў); моркву Нанцкую (8 пудоў); агуркі Мурамскія (8 пудоў), Ансельскія (4 пуды); капусту Браўншвейгскую (8 пудоў), Грэчаскую (4 пуды), каляровую Эрфурцкую (1 фунт); рэдзьку зімнюю белую доўгую (2 пуды); летнюю (1 пуд); мак чорны глухі (1 пуд); пятрушку карнявую цукровую (20 фунтаў); цыбулю рэпчатую Рускую (2 фунты), Цытавускую і Мадэрскую (па 2 фунты); таматы «Кароль ранніх» (2 фунты); салат жоўты Азіяцкі (20 фунтаў); цыбулю-парэй зімнюю Брабанцкую (1 фунт); сельдэрэй карнявы яблычны (1 фунт); фасоль нізкую белую (25 пудоў); гарох цукровы (1 пуд 20 фунтаў); гарох просты (1 пуд 20 фунтаў); кукурузу раннюю (1 пуд); бручку кармавую белую (2 пуды), Красасельскую жоўтую (3 пуды); рэпу Пятроўскую (6 фунтаў), познюю фіялетавую (4 фунты); кроп (10 фунтаў). Акрамя таго было заказана і насенне тытуню: Ангушэша (1/4 фунта), Персечана (1 фунт), Басма (1 фунт), махоркі-серабранкі (3 фунты)[553].

Вялікая Айчынная вайна яшчэ не скончылася, а жыццё на вызваленых ад фашыстаў тэрыторыях пачало аднаўляцца. Не хапала харчавання. Таму 30 студзеня 1945 г. Магілёўскі гарадскі Савет дэпутатаў працоўных прыняў пастанову аб выдзяленні магіляўчанам зямель пад асабістыя агароды за кошт свабодных зямель Магілёўскага раёна[554]. Акрамя таго, пастановай прадугледжвалася арганізаваць да сакавіка 1945 г. дапаможную гаспадарку дзіцячых дамоў, дзе значнае месца адводзілася агародніцтву. Трэба дадаць, што ў гэты час вельмі важная роля належала дапаможным гаспадаркам арганізацый, устаноў, якія маглі б забяспечваць харчаваннем сваіх работнікаў. Вырашана было стварыць парніковую гаспадарку, дзе можна было вырошчваць ранні агародныя культуры. Ужо ў пачатку 1945 г. былі закладзены парнікі ў

падсобнай гаспадарцы Магілёўскага харчторга. Аналагічная праца ішла ў другіх абласцях рэспублікі.

Для вывазу ўгнаення і паліва для парнікоў Магілёўскі гарвыканкам выдзеліў 4 кані. Былі выдадзены крэдыты на закупку насення і інвентару. Парніковая гаспадарка Гархарчторга прадугледжвала 1050 рам[555]. Тут вырошчваліся асноўныя раннія культуры: агуркі, таматы, капуста, бульба, клубніцы, каляровая капуста, а таксама буракі, морква, бручка, цыбуля, фасоля і інш. Пры вырошчванні агародніны выкарыстоўвалі машыны, сельскагаспадарчы інвентар, якія абслугоўваліся брыгадай рабочых. Наспела патрэба і ў сховішчах для агародніны на 900 куб. $м^2$ [556]. Планам 1945г. прадугледжвалася закладка ў Магілёўскай вобласці 1,5 тыс. парнікоў, у 1946 г. планавалася давесці іх колькасць да 4 тыс.[557]. Такая ж работа праводзілася і ў іншых гарадах рэспублікі.

У кожнай сваёй пастанове, пачынаючы са студзеня 1945 г., гарвыканкам, напрыклад, выносіў рашэнне аб выдзяленні ўчасткаў пад калектыўныя і індывідуальныя агароды для рабочых і служачых розных прадпрыемстваў г. Магілёва, забеспячэнні іх насеннем, угнаеннем, інвентаром і агранамічнай дапамогай[558].

Так, на Магілёўскай швейнай фабрыцы на 115 рабочых было размеркавана 15 га зямлі пад агароды, на шаўковай фабрыцы — на 179 рабочых 9,4 га, на 22 супрацоўнікі дзіцячага дома № 1 было выдзелена 0,85 га, а дзіцячага дома № 2 — 1 га[559]. Атрымалі свае ўчасткі і працаўнікі іншых прадпрыемстваў і ўстаноў. Участкі гэтыя размяшчаліся па ўскраінах: на тэрыторыі Мышакоўкі, Піўзавода, Лупалава і ў іншых месцах.

Асабліва важнае значэнне для харчавання мела бульба, якой пасля вайны катастрафічна не хапала нават на насенне. Таму ў гэты нялёгкі час, па ўспамінах старажылаў, як насенны матэрыял выкарыстоўвалі вярхушкі бульбы з 2—3 «вочкамі». І трэба сказаць, што гэтая часцінка бульбіны давала неблагі ўраджай. Ганна Паўлаўна Старавойтава з в. Забалацце Чавускага раёна Магілёўскай вобласці расказвала, што адразу пасля вайны з-за недахопу насення бульбы выкарыстоўвалі для пасеву нават шалупінне з «вочкамі»[560].

Дырэкцыя заводаў, фабрык і іншых прадпрыемстваў і ўстаноў заключала дамовы з калгасамі і саўгасамі на вырошчванне расады і продаж агародных культур рабочым і служачым для пасеву на асабістых агародах. У першую чаргу агародамі ў гэты час забяспечваліся сем'і франтавікоў і інвалідаў.

Існавала праблема і абароны калектыўных і індывідуальных агародаў ад марадзёраў і злодзеяў. Ахову іх ажыццяўлялі самі рабочыя і служачыя, пасылаючы свабодных ад працы членаў калектыву, а таксама прыцягвалі да гэтай справы членаў сямей з аплатай іх працы за кошт агароднікаў[561].

Пастановай Савета Міністраў БССР № 345 ад 1 красавіка 1948 г. «Аб мерах па далейшаму развіццю калектыўнага і індывідуальнага агародніцтва» быў прадугледжаны шэраг захадаў, накіраваных на развіццё гэтай важнай галіны гаспадаркі. Сярод іх вызначаліся меры па пашырэнні плошчы пасеваў за кошт свабодных зямель гарадоў, дзяржземфонда і дзяржлесфонда, свабодных зямель прадпрыемстваў, нявыкарыстаных зямель калгасаў, у паласе адчужэння чыгунак, а таксама па павышэнню іх ураджайнасці[562]. Аблвыканкамам было даручана прыняць адпаведныя меры для ўкаранення іх у жыццё.

Трэба было навучыць асноўную масу працуючых новым прыёмам гаспадарання, а для гэтага патрэбны былі веды па агратэхніцы і тэхналогіі вырошчвання агародніны. З гэтай мэтай у клубах і чырвоных кутках прадпрыемстваў былі арганізаваны лекцыі, гутаркі, кансультацыі. Актыўная прапаганда гэтых ведаў вялася па радыё. Аказвалася дапамога агароднікам транспартам, цяглавай сілай, продажам насення ларкамі «Сортсемовощ» і расады з прыгарадных калгасаў і саўгасаў і г. д.

Ацэньваючы гэтыя намаганні, трэба сказаць, што яны былі своечасовымі і карыснымі таму, што давалі магчымасць у кароткія тэрміны забяспечыць насельніцтва харчаваннем. Прыхільна ўспрымаліся гэтыя мерапрыемствы і насельніцтвам, большасць якога складала сялянства, а значная частка працуючых у горадзе таксама была выхадцамі з вёскі. Па ўспамінах старажыхароў, агароды каля дома, а таксама каля баракаў, у якіх жыла пэўная частка рабочых, размя-

шчаўся хлеў для кабанчыка ці казы, радзей — каровы, былі амаль адзінай крыніцай здабывання харчавання для даволі вялікай сям'і[563]. Склад агародных культур быў традыцыйны: цыбуля, капуста, агуркі, бульба, таматы, гарох, боб, кроп, каляндра, морква, буракі, гарбузы і інш. Невялічкі парнічок, які накрываўся рамай і матам з саломы, быў прыстасаваны выключна для расады. Тым не меней, як сведчаць апытанні, на градках у адкрытым грунце добра расла агародніна. Нават капрызныя да ўмоў надвор'я таматы паспявалі да канца лета выспець, бо не падшкоджваліся тады яшчэ такой небяспечнай хваробай, як «мучністая раса» і іншыя хваробы, ад якіх зараз гінуць пасевы. Зрэдку ў агародах вырошчваліся і экзатычныя культуры.

Пра вопыт вырошчвання ў Беларусі бахчавых культур расказаў нам мясцовы жыхар в. Каменка, што ў Чавускім раёне Магілёўскай вобласці, Пётр Новікаў. Яго дзед адзіны ў вёсцы ў даваенны час вырошчваў кавуны і дыні. Вядома, што кароткае лета ў Беларусі не дае магчымасці выспець гэтым культурам. Таму селянін спачатку вясной сеяў іх у невялікія гаршкі, а ў маі высаджваў у ямкі глыбінёй да 20—30 см і накрываў іх на ноч пакляй (адыходамі пянькі). І так доўжылася да тае пары, пакуль заканчваліся майскія замаразкі. Далей яны раслі ў адкрытым грунце. К канцу лета прыгожыя паласатыя кавуны і жоўтыя дыні вагой крыху болей за 1—2 кг, красаваліся на агародзе. Іх здымалі і захоўвалі на гарышчы, там, дзе заўсёды беларусы захоўвалі яблыкі, дулі, прыкрываючы саломай ад сцюжы і маразоў[564].

Кавуны і дыні па большай частцы спажывалі ў свежым выглядзе. Акрамя таго, кавуны салілі ў бочкі такім жа спосабам, як і агуркі. Як высветлілася, гаспадар, які пэўны час жыў у Сібіры (ён мігрыраваў туды з Беларусі ў пачатку 30-ых гг. і праз два гады вярнуўся), дзе вырошчвалі бахчавыя культуры, набыў свой вопыт там і паспрабаваў вырошчваць іх і ў Беларусі.

Праблемы ў вырошчванні агародных культур узнікалі ва ўсе часы. 18 кастрычніка 1953 г. газета «За Радзіму» надрукавала артыкул «Назревшие вопросы развития овощеводства», дзе гаварылася аб нізкіх ураджаях агародніны ў асобных гаспадарках, аб неабходнасці агранамічнай дапамогі насельніцт-

ву і г. д. Праводзіліся рэспубліканскія і ўсесаюзныя семінары і канферэнцыі па праблемах агародніцтва. Так, 19 мая 1969 г. у Маскве беларуская дэлегацыя ўдзельнічала ў семінары пад назвай «Павелічэнне вытворчасці агародніны і павышэнне яе якасці». У гэты час на ВДНХ, на выстаўцы «Манеж», дэманстравалася і агародніна беларускіх вытворцаў.

У 1940 г. пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР былі створаны мясцовыя органы кіравання сельскай гаспадаркай — зямельныя аддзелы выканкамаў раённых Саветаў дэпутатаў працоўных, якія займаліся размеркаваннем зямель і іх выкарыстаннем, стварэннем калгасаў і саўгасаў, раздачай зямель сялянскім гаспадаркам, надзяленнем зямлёй сямей рабочых і служачых і г. д.

Для нашай тэмы вялікую цікавасць уяўляюць дакументы Занальнага дзяржаўнага архіва г. Пінска, якія ўтрымліваюць звесткі аб размеркаванні зямель па ўгоддзям, аб групіроўцы сялянскіх гаспадарак па колькасці зямлі, у тым ліку і зямлі пад агароды, аб крыніцах выдзялення зямель сялянам, рабочым і служачым, структуры пасяўных плошчаў і долі ў іх агародных культур і інш.

За час акупацыі нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі Заходняй Беларусі вялікая частка ворнай зямлі перайшла ў аблогі. Перш за ўсё гэта ворныя землі, у тым ліку і агароды былых маёнткаў, перададзеныя калгасам і саўгасам, якія пасля роспуску апошніх немцамі не апрацоўваліся на працягу трох гадоў і таксама ператварыліся ў аблогу. Не апрацоўваліся і землі сялян, якія пайшлі ў партызанскія атрады, а таксама расстраляных і вывезеных у Германію. Так, у Ганцавіцкім раёне ў 1944 г. у аблогу перайшлі 1347 га ворнай зямлі[565]. У Лагішынскім раёне Пінскай вобласці ў параўнанні з 1941 г. выкарыстоўвалася толькі 3778 га ворнай зямлі, ці 19,9 %[566], у Целяханскім — 24,2 %[567]. Аналагічная тэндэнцыя характэрна і для іншых раёнаў Заходняй Беларусі. На змяншэнне ворыўнай зямлі ўплывалі недахоп цяглавай сілы, угнаенняў, разрабаванне жывога і мёртвага інвентару, знішчэнне мірнага насельніцтва, частковая эвакуацыя яго ў тыл.

Па Пінскай вобласці, напрыклад, у выніку вайны было разбурана 938 сялянскіх гаспадарак і 20 340 га ворыва зас-

таліся пакінутымі ў выніку выезду ў Польшчу асобных сем'яў[568]. У 1946 г. па Пінскай вобласці ворыўная зямля займала 204 750 га, ці 13,4 % ад агульнай плошчы; пад агародамі было 6620 га, ці 3,2 % ворыўнай зямлі[569]. Сярэдняя плошча агарода ў асобных раёнах у 1946 г. складала 0,04—0,05 га[570]. У калгаснікаў Пінскай вобласці прысядзібныя ўчасткі меней 30 сотак (0,3 га) складалі 2,7 %, большасць мела ад 0,3 га да 0,61 га.

Змяненні ў занятках агародніцтвам у другой палове XX ст. звязаны з працэсамі урбанізацыі і міграцыі насельніцтва з вёскі ў горад, пашырэннем вытворчасці агародніны ў калгасах, саўгасах, у парнікова-цяплічных камбінатах, членамі садова-агародных таварystваў, прадпрымальнікамі, з развіццём тэхналогіі вырошчвання агародных культур і пашырэннем ведаў сярод насельніцтва і інш. Нязменным застаецца тое, што вясковыя жыхары па-ранейшаму вырошчваюць агародніну пераважна для асабістых патрэб.

Трэба адзначыць, што ў структуры пасеваў на сялянскіх сядзібах адбыліся змены ў бок пашырэння плошчаў пад агародныя культуры: бульбу, капусту, буракі, гарбузы, а таксама розныя травы (канюшыну, цімафееўку і інш.) і змяншэння пасеваў збожжавых. Гэта звязана са старэннем насельніцтва вёскі, скарачэннем колькасці жывёлы і птушкі ў асабістых гаспадарках, для якіх сяляне вырошчвалі жыта, ячмень і іншыя культуры. Зніклі з сялянскіх агародаў у другой палове XX ст. каноплі, мак, лён, рэпа і з'явіліся, акрамя традыцыйных культур (цыбуля, морква, буракі, гарох, боб, агуркі, гарбузы, капуста, рэдзька і г. д.), розныя гатункі таматаў, перцу, а таксама спаржавай фасолі, кабачкоў, пятрушкі, каляровай капусты, сельдэрэю, салаты і інш. Дзякуючы шырокай сетцы магазінаў па продажы сертыфіцыраванага насення ў апошнія дзесяцігоддзі моцна пашырылася разнастайнасць гатункаў як традыцыйных, так і новых агародных культур. У гандлёвай сетцы можна набыць угнаенні для агародных раслін, а таксама глебу для пасеву насення на расаду.

Асобна трэба сказаць пра таматы. Спроба апытання насельніцтва розных рэгіёнаў Беларусі пра ўзнікненне і традыцыі вырошчвання іх не дала чакаемых вынікаў: у адных

рэгіёнах (пераважна паўднёвым і заходнім) таматы вырошчвалі з пачатку XX ст., у другіх — з сярэдзіны. Вядома, што таматы ўжо ў XIX ст. вырошчвалі на сваіх агародах і ў цяплiцах памешчыкі. Аднак у сялянскім асяродку ў гэты час яны былі экзатычнай культурай і сустракаліся рэдка. Нават у першай палове XX ст. таматы вырошчваліся далёка не ва ўсіх месцах Беларусі і ў невялікай колькасці. Апытаныя жыхары розных месц адзначалі, што некалькі каліваў памідораў садзілі непадалёку ад хаты, і гэтага ім хапала. Мала хто з сялян ведаў пятрушку, тапінамбур, сельдэрэй. Заўважана адна акалічнасць, што традыцыю сеяння новых для сялян культур пераймалі раней асобныя жыхары вёсак, якія суседнічалі з панскімі маёнткамі.

Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што і сёння асноўная маса вясковага насельніцтва трымаецца даўніх традыцый у занятках агародніцтвам. Агародныя культуры паранейшаму сеюцца як загонамі, так і на градках. Апрацоўваюцца агароды з дапамогай тых жа прылад працы (хаця і ўдасканаленых): плуга, бараны, акучніка, рыдлёўкі, матыкі і г. д. Асобныя маюць міні-трактары, эксціпатары, розныя акучнікі і інш. Моладзь, і перш за ўсё спецыялісты сельскай гаспадаркі, якія жывуць у вёсцы, часта выкарыстоўваюць новыя тэхналогіі вырошчвання агародніны, з якімі знаёмяцца са шматлікай літаратуры, а таксама праз сяброў, знаёмых. Гэта вырошчванне агародніны па сістэме Мітлайдэра, па галандскай тэхналогіі, шырокае выкарыстанне мінеральных угнаенняў і сродкаў абароны раслін, шматполле і інш. Новыя тэхналогіі ў занятках агародніцтвам выкарыстоўваюць перш за ўсё так званыя «дачнікі», ці члены садоваагародных таварыстваў, а таксама гараджане. Прычым асобныя з іх на невялікіх агародах дасягаюць вялікіх поспехаў у гэтай справе.

Вядома, што на сям'ю з пяці чалавек пры добрых ураджаях дастаткова мець 300—400 м$^2$ плошчы пад агарод. Не ўсе дачнікі маюць такую плошчу, а таму аддаюць перавагу вырошчванню найбольш важных для членаў сям'і агародных культур і тых, якія найбольш падабаюцца ім. Сучасныя агароднікі-аматары вырошчваюць на сваіх дачных участках пераважна розную зеляніну (салату, пятрушку, кроп, ка-

ляндру і інш.), хуткаспелыя гатункі агародніны (радыску, спаржавую фасолю, таматы, агуркі, кабачкі, перац, пацісоны), а таксама цыбулю, часнок, гарох, моркву, буракі і інш. Для паскоранага паспявання агародніны і аховы ад неспрыяльнага надвор'я і шкоднікаў шырока выкарыстоўваюцца плёначныя цяпліцы, а таксама спанбонд і г.д. Кожны агароднік імкнецца пасадзіць хоць крыху ранняй бульбы, якая з'яўляецца важнай крыніцай вітаміна C. У добрага агародніка можна заўважыць ранняй вясной градку з зімовай цыбуляй: шніт, батун, лізун і іншыя, якія ўтрымліваюць не толькі вітамін C, але і вітаміны групы B, карацін. Сярод першых пасадак у парніках — радыска, цыбуля, кроп. Мала хто не мае на агародзе невялічкай градкі шчаўя, некалькі кустоў хрэну, рэвеню.

Вялікай пашанай традыцыйна карыстаецца капуста. Зараз існуе звыш 100 гатункаў капусты, але самыя распаўсюджаныя з іх — качанная (белакачанная, савойская і чырвонакачанная). У апошняе дзесяцігоддзе пашырыліся розныя гатункі каляровай і ліставой капусты. Карысць капусты была ацэнена здаўна. Вядома, што яе селекцыяй займаўся Піфагор, які лічыў, што яна падтрымлівае бадзёрасць і добры настрой. Навуковыя дадзеныя сведчаць аб утрыманні ў ёй вялікай колькасці мінеральных рэчываў, бялкоў, вугляводаў, розных вітамінаў, арганічных кіслот і г.д.

Вядома, што ў савецкі час пад капустай было занята 30 % усіх пасеваў агародніны, а яе ўраджайнасць дасягала 1000 ц з гектара. Не ўсе гатункі капусты маюць аднолькавае распаўсюджанне ў агароднікаў. Сяляне аддаюць перавагу белакачаннай капусце. Дачнікі акрамя белакачаннай, чырвонакачаннай і кальрабі вырошчваюць розныя гатункі каляровай капусты, асартымент якіх паступова павялічваецца.

Асаблівай павагай беларусаў здаўна карыстаецца белакачанная капуста, якая ў балансе харчавання насельніцтва займае трэцяе месца пасля хлеба і бульбы. Яе універсальнасць у тым, што з-за яе добрай лёжкасці амаль круглы год можна забяспечваць насельніцтва свежай капустай. У Беларусі сёння шырока распаўсюджаны ранняя, сярэдняспелая і позняя капуста наступных гатункаў: скараспелка, Залаты гектар, летняя, Лошыцкая, Грыбаўская, Калгасніца, Слава, Юбі-

8. Зак. 2839.

лейная, Беларуская, Надзея, Ласінаастроўская, Амагер, Падарунак, Маскоўская позняя, Мінская Зімоўка і інш. Гатункі каляровай капусты розняцца па тэрмінам пасявання, па форме, велічыні, масе, шчыльнасці і колеру галоўкі. Найбольш пашыраны гатункі: Мавір, ранняя Грыбаўская, брокалі і інш. Каляровая капуста — гэта нераспушчанае суквецце, яно складаецца з укарочаных мясістых пабегаў, якія заканчваюцца зачаткамі бутона. Усё разам утварае акруглую галоўку ў абрамленні зялёных лістоў.

Вырошчваюць каляровую капусту ў адкрытай глебе. Яна любіць азоцістыя падкормкі, патрабуе дастаткова вільгаці, паветра і не патрабуе мінеральнай солі. Пры ранніх тэрмінах пасадкі яе ўраджай дасягае да 100 ц з гектара. Зыходзячы з вялікай карысці каляровай капусты, яе стараецца пасадзіць амаль кожны дачнік і гараджанін. У Беларусі пашыраюцца пасевы каштоўных гатункаў капусты каляровай, чырвонакачаннай, брусельскай, савойскай, пекінскай, кальрабі, брокалі, якія маюць больш высокія харчовыя і густавыя якасці, утрымліваюць шмат вітамінаў, вугляводаў, бялкоў, мінеральных солей.

Капуста — холадаўстойлівая культура, яе насенне прарастае пры тэмпературы +2—3 °C. Вырошчваюць яе расадай. Для дарослых раслін спрыяльнай з'яўляецца тэмпература +15—18 °C, а ў фазе разеткі да ўтварэння качана яна можа вытрымаць і замаразкі. Капуста патрабуе шмат вільгаці, а таму для добрага развіцця яе трэба паліваць. Ва ўмовах Беларусі недахоп вільгаці бывае ў перыяд фарміравання разеткі і качаноў, таму паліў павышае ўраджайнасць удвая. Вельмі патрабавальная капуста і да святла. У зацемненых месцах яна выцягваецца і не ўтварае качаноў або яны вырастаюць з кулак.

Расце капуста на любой глебе, акрамя лёгкай пясчанай. Лепшай лічацца суглінкі, якія ўтрымліваюць вільгаць, і тарфяныя. Не любіць яна і кіслай глебы, патрабуе паташу. Усе гатункі могуць скрыжоўвацца паміж сабой, таму на насенне агароднікі сеюць яе з прасторавай ізаляцыяй.

Капусту агароднікі вырошчваюць першай ці другой культурай, уносяць угнаенні і мінеральныя тукі. Добра расце яна пасля бабовых, агуркоў, цыбулі, бульбы, буракоў, таматаў

і шматгадовых траў. Пры хуткім вяртанні на адно і тое ж месца (раней чым праз 5 гадоў) расліна моцна пашкоджваецца хваробай і шкоднікамі, якія распаўсюджваюцца праз глебу. Да гэтага трэба дадаць, што капуста патрабуе шмат догляду. Ад часу пасеву і да поўнага росту галовак гаспадыня павінна была займацца рыхленнем і праполкай, палівам (у засушлівыя гады — частым), абіраць з раслін чарвякоў і г. д. У фазе фарміравання разеткі на капусту часта нападала тля. Па традыцыі яе знішчалі з дапамогай попелу, які сыпалі на капусту пасля паліву ці дажджу, а таксама палівалі адварамі раслін (любіста, палын і інш.).

Як і раней, кожны селянін вырошчвае на агародзе гарбузы (мясцовыя назвы: бульба, гарбуз, кабак, кіпейка), якія з батанічнага пункту гледжання з'яўляюцца самай вялікай агароднай культурай. Яны добра захоўваюцца да новага ўраджаю і маюць вельмі карысныя і лячэбныя ўласцівасці, выкарыстоўваюцца пры страўнікава-кішэчных, сардэчных і іншых захворваннях. Карысныя ў гарбузе і мякаць, і семкі. Раней сушаныя семкі гарбуза былі любімай прысмакай для дзяцей у час Каляд. Сушаныя семкі выкарыстоўвалі ў народнай медыцыне як сродак ад глістоў.

У Еўропу гарбуз трапіў у XV ст. Калі яго сталі вырошчваць на землях Беларусі, дакладна невядома[571]. Гарбуз, пакладзены перад жаніхом дзяўчынай, азначаў адмову ад шлюбу, аб чым сведчаць шматлікія дадзеныя этнаграфічных даследаванняў XIX—XX стст. Ён патрабавальны да цяпла і святу, таму ў паўночных раёнах яго сеюць расадай. Цвіце ў чэрвені — ліпені. Пладанашэнне — 1,5—2 месяца. Семя кладуць у глебу пры +14 °—16 °С, часта замаразкі знішчаюць расліны. Лепш расце ён на лёгкіх, багатых чарназёмных глебах, убіраюць перад наступленнем халадоў. Засохлая пладаножка гаворыць аб спеласці гарбуза. Асабліва распаўсюджаны пляцістыя, якія маюць доўгую сцябліну, з вусікамі. Вясковыя жыхары сёння сеюць шмат гарбузоў, якія не патрабуюць асаблівага догляду. Іх размяшчаюць часта ўскрай агарода (па баках, у канцы), дзе плеці свабодна цягнуцца на мяжу. Пасля скошвання травы гарбузы маюць там шмат святла і цяпла, а таму растуць добра. Шырока выкарыстоўваюцца яны сёння для прыгатавання розных страў (найперш кашы

з рознымі крупамі), а таксама на корм скаціне. Сёння сярод агароднікаў-дачнікаў пашыраюцца гатункі гарбузоў, якія выкарыстоўваюцца ў прыгатаванні салатаў: Мускатны, Мазалеўскі, Міндальны, Вітамінны, Карацінны, Агурковы[572] і інш.

Агароднікі вырошчваюць, як правіла, агуркі, кабачкі, пацісоны, якія адносяцца да сямейства гарбузовых. Прычым агуркі — адна з асноўных культур на агародзе. Сеюць іх як у парніках, так і ў адкрытым грунце. Для агуркоў на ўчастку выбіраюць лепшае месца (пасля гароху, капусты, морквы, буракоў). Градкі робяць з усходу на захад шырынёй да 1 м, вышынёй 20—30 см, праход паміж імі 40 см, грабяні паміж імі вышынёй 25—35 см, а прамежак паміж вяршынямі 60—70 см. Лепшыя вынікі даюць паравыя грады і грабяні з выкарыстаннем свежага гною для абагрэву глебы.

Для паравых град робяць канаву глыбінёй 20—25 см і шырынёй 55—60 см. У яе кладуць гарачы гной вышэй краю канавы на 8—10 см. У гноі робяць канаўку, якую засыпаюць дзярновай зямлёй, а зверху засыпаюць зямлёй на 12—15 см. Шырыня паравой грады 70—80 см. Гуркі сеюць бліжэй да цэнтра. Прамежак паміж радамі 20 см (2 рады), паміж раслінамі ў радзе — 10—15 см. Робяць кулісы з абаронных высокасцябловых раслін (боб, гарох, кроп, кукуруза, таматы, каляровая капуста, буракі).

Сёння многія дачнікі вырошчваюць агуркі не толькі ў адкрытым грунце, але і ў цяпліцах. Трэба адзначыць, што ў Беларусі традыцыйна склаліся цэнтры вырошчвання агуркоў на продаж як на сваіх агародах, так і на палявых участках, адведзеных для гэтай мэты. У Магілёўскай вобласці здаўна вырошчваннем агуркоў займаліся ў раёне Шклова; на Палессі — Пінска. Нам удалося прасачыць арэал распаўсюджання гэтага занятку на Палессі, дзе сёння склаўся цэнтр па вырошчванні агуркоў, вызначыць найбольш інтэнсіўныя зоны. Пачынаецца «агурковы шлях» з раёна Мікашэвіч і ідзе праз Тураў, Альшаны, Давыд-Гарадок, Столін, Пінск. Гэта раёны найбольш шырокага развіцця промыслу, якія забяспечваюць свежымі агуркамі не толькі насельніцтва Беларусі, але і сумежных з ёй расійскіх рэгіёнаў. Агуркі з гэтага рэгіёна носяць назву «Пінскія» можа, таму, што вырошч-

ваць іх пачалі спярша ў ваколіцах Пінска. Шляхам апытання агароднікаў Турава, Альшан, Пінска мы даведаліся пра вопыт прамысловага агародніцтва, аб якім варта паведаміць. Першае, што кідаецца ў вочы на агародах «агурковага шляху», гэта па 2—3 зацягнутыя плёнкай цяпліцы на кожным (а то і болей), якія займаюць амаль усю іх плошчу. Звычайна адна цяпліца займае 3 соткі, дзе ў некалькі радоў сеюцца агуркі, паміж імі праходы да 1м. Спачатку робіцца вялікая баразна шырынёй 30—50 см і глыбінёй 30 см, у якую з восені кладзецца гной (лепей свежы), а зверху — слой зямлі[573]. Існуюць парнікі для ранняй выганкі агуркоў з двайным плёначным пакрыццём, яны атапліваюцца цаглянымі печамі, ад якіх ідуць праз увесь парнік трубы.

У кожнага агародніка ёсць невялікія памяшканні з печамі для вырошчвання расады агуркоў. Для атрымання агуркоў у канцы красавіка расаду сеюць у сакавіку густа ў апілкі. Калі расада падрасце, яе пікіруюць у невялікія цэлафанавыя мяшэчкі 7 × 12 см і ставяць у скрыні ў атапліваемых парніках на сцелажах. Калі расліна дасягае 40—50 см, яе падпіраюць калкамі, каб не падала. У красавіку расаду разам з апілкамі высаджваюць у цяпліцу. Да кожнай расліны працягваецца шпагат, які ўверсе прывязаны да дроту. Усе ніжнія пасынкі прышчыпваюцца, і агурок фарміруецца ў адзін ствол.

Самымі працаёмкімі для агароднікаў з'яўляюцца праполка, пасынкаванне. Праз дзень агуркі паліваюць са шланга вадой («летнай»), якая награваецца ў вялікіх ёмкасцях, пастаўленых для гэтай мэты на сонца.

Важнай справай агародніка з'яўляецца падкормка раслін мінеральнымі ўгнаеннямі, а таксама настоем каравяку. Ад хвароб ужываюцца розныя фунгіцыды і інсектыцыды. Штодня парнікі праветрываюцца з дапамогай адкрыцця люкаў.

Па сведчанні рэспандэнтаў з Альшан, асобныя жыхары, напрыклад, маюць парнікі не толькі каля дома, але і ў полі, плошча іх часам дасягае 30 сотак і болей[574]. А гэта патрабуе не толькі прыкладання рук членаў сям'і, але і наймання часовых рабочых.

Трэба адзначыць, што праца ў парніках больш цяжкая, чым праца ў агародзе, таму што тэмпература ў іх у цёплыя

дні вельмі высокая. Да таго ж дрэнна ўплывае на стан здароўя працуючых у цяпліцах па некалькі гадзін вялікая вільготнасць. Да гэтай працы прыцягваюцца і дзеці, якія часам вымушаны прапускаць заняткі ў школе. Свой адмоўны бок мае і некантраляванае ўжыванне мінеральных угнаенняў. Вядома, што памылкі і перадазіроўкі ў гэтым плане вельмі шкодныя. Агароднікі, як пабачылі мы на свае вочы, сыплюць іх столькі, што «аж бела ў парніку». Калі лісты пачынаюць закручвацца і жаўцець, гэта адзнака таго, што трэба спыніць падкормку. Звычайна ў адзін дзень паліваюць, а ў другі — падкормліваюць. Насенне агуркоў у пінскіх агароднікаў выкарыстоўваецца пераважна галандскае (часам польскае), якое дае роўныя, зялёныя, прыгожыя і хрусткія плады. Затое сапраўднага смаку такія агуркі не маюць, як не маюць яны і прыемнага паху, характэрнага для раяніраваных беларускіх і іншых гатункаў.

Калі агуркі вырастаюць, трэба праз дзень выбіраць іх, каб не перараслі і не страцілі сваёй таварнай якасці. Старыя жыхары в. Альшаны возяць здаваць агуркі ў прыёмныя пункты па 2—3 мяшкі на веласіпедзе[575]. Найбольшы прыбытак атрымліваюць тыя, хто вырошчвае раннія агуркі: у час масавага збору іх прыходзіцца здаваць прадукцыю па нізкай цане. Агароднікі самі ахоўваюць парнікі, да якіх ласыя злодзеі. Гэтая справа, такім чынам, патрабуе напружання сіл і шмат часу. Як адзначалі апытаныя, з-за парнікоў «нікуды не адлучыцца»[576].

Занятак прамысловым агародніцтвам, як сведчыць наша даследаванне, патрабуе і значных матэрыяльных затрат, бо на кожны парнік штогод патрабуецца да 200 м плёнкі, а таксама нямала ўгнаення для падкормкі раслін і г. д. Вядома, што ўвесь гной з гаспадаркі ідзе ў парнікі. З-за пасеву на адным месцы агуркі часта хварэюць, і патрабуецца нямала сіл для аздараўлення глебы. Апытаныя адзначалі, што з гэтай мэтай пасля збору ўраджаю ў глебу ўносяць даламіт, паташ, паліваюць зямлю кіпенем, медным купарвасам і г. д. Сеюць у парніках жыта, рапс, маслянічную рэдзьку, гарчыцу.

Акрамя агуркоў на Палессі вырошчваюць на продаж таматы, капусту, моркву, цыбулю і інш. У гэтым рэгіёне шмат

фермерскіх гаспадарак, якія забяспечваюць адзначанай агароднінай значную частку насельніцтва Беларусі.

Трэба сказаць і пра развіццё насенневодства ў агароднікаў. Па большай частцы, як адзначалася, насенне агароднікі набываюць праз гандаль, галоўным чынам беларускіх і расійскіх вытворцаў. Тым не менш сяляне і асобныя гараджане пакідаюць на семя лепшыя вырашчаныя на сваім агародзе гатункі асобных культур і паспяхова вырошчваюць сваё насенне. Самым буйным у Беларусі насенняводчым цэнтрам з'яўляецца Давыд-Гарадок і яго ваколіцы.

У Давыд-Гарадку, дзе традыцыйна склаўся цэнтр па вырошчванню насення розных культур яшчэ ў XIX ст., у тым ліку і агародных, і сёння працягваецца старадаўняя традыцыя. А звязана яна, на думку гісторыкаў, са з'яўленнем на гэтай зямлі крымскіх татар-агароднікаў, ад якіх пакрысе насенняводствам стала займацца і мясцовае насельніцтва. Сёння большасць жыхароў Давыд-Гарадка лічаць, што гэта традыцыя дасталася ім ад продкаў. Паводле нашага апытання пажылых жыхароў Давыд-Гарадка ў 2004 г., вопыт гэты з пакалення ў пакаленне, амаль без змяненняў, перадаецца ад бацькоў дзецям[577]. Нашчадкі агароднікаў ужо не звязваюць сваё паходжанне з татарамі, якія асіміляваліся тут, хаця антрапалагічныя адзнакі твару асобных з іх падобныя на татарскія.

Немагчыма ў горадзе знайсці хаця б адну сям'ю, у якой не займаліся б гэтай справай. У кожным нават невялічкім прысядзібным агародзе побач з градой цыбулі, часнаку, буракоў, пятрушкі, бульбы для асабістага спажывання вырошчваюць насенне агародніны, а таксама розных аптэкарскіх траў і кветак. Рэспандэнты адзначалі, што сёння прапорцыі паміж гэтымі культурамі схіляюцца на карысць кветак, якія займаюць 2/3 пасяўной плошчы[578]. Раней насенне агародніны вырошчвалася болей, чым кветак. І гэта, безумоўна, рэгулюецца попытам.

Трэба адзначыць, што для вырошчвання насеннага матэрыялу патрабуецца вялікая праца, якая стала ўжо нормай для кожнага новага пакалення. Акрамя 2—6 сотак градак высадкаў на агародзе каля дома асобныя жыхары Давыд-Гарадка маюць 10—25 сотак пад агароды на ўскрайку гора-

да, дзе амаль палова ўчастка адводзіцца пад вырошчванне насення. Склад агародных культур, як сведчыць апытанне, традыцыйны: морква, цыбуля, парэй, батун, радыска, рэдзька, пятрушка, кроп, буракі, агуркі, кабачкі, гарбузы, а таксама любіста, сельдэрэй, мята перачная, шалфей, базілік, пастарнак, ісоп, чабор, тархун (эстрагон), сунічны шпінат, духмяны гарошак і інш.[579]. Агароды гарадокцы аралі вясной, бо за зіму зямля злягалася і рабілася «нікудышнай», на думку агароднікаў.

Прадавалі і прадаюць насенне ў розных гарадах Беларусі, Расіі, на Украіне. Дабіраліся прадаўцы нават у далёкія раёны Крайняй Поўначы.

Насенне выспявала к канцу жніўня — пачатку верасня. Тады адбываўся асноўны збор насення агародніны. Агароднікі падкрэслівалі, што насенне любой культуры збіралася не адзіначасова, а паступовa, кожны дзень, па меры выспявання. Прыкметай спеласці лічылася распушванне, растрэскванне, жаўценне розных сямян. Чакалі, калі націнне такіх раслін пасохне, тады аббівалі драўляным пранікам[580]. Тым самым пранікам, з дапамогай якога яшчэ ў пачатку XXст., а некаторыя і пазней, прасавалі бялізну на рэчцы ці возеры.

Сушылі насенне абавязкова на посцілках у зацененым месцы, якое добра праветрывалася (гарышча, сенцы і г. д.). На сонцы яно перасыхала і страчвала сваю ўсхожасць. Спачатку семянныя каробачкі калацілі пранікам, потым ссыпалі ў рэшата і веялі з яго ў карыта. Пасля поўнай ачысткі і прасушкі насенне ссыпалі ў палатняныя мяшэчкі. Захоўвалі ў падвешаным выглядзе, каб не папсавалі грызуны.

Агароднікі дзяліліся паміж сабой насеннем. Стараліся пазычаць насенне толькі ў «добрыя рукі». Звычайна той, хто пазычаў, павінен быў даць хоць капейку[581]. Сёння агароднікі сеюць насенне як новых перспектыўных гатункаў, так і старых, якія трымаюцца, мабыць, болей за стагоддзе і добра адаптаваліся на гэтай глебе, а таму даюць стабільна добрыя ўраджаі. Так, і сёння давыд-гарадокцы адзначалі, што вырошчваюць белую цыбулю (не вельмі горкую), якую ведалі яшчэ іх продкі. Вырастае яна па 1—2 рэпкі з севаку. Асобныя агароднікі культывуюць насенне розных культур і кветак замежных краін. Папулярныя ў насеннR водаў доўгая салодкая морква польскіх вытворцаў, агуркі Аладзін, Шрэмскі.

Шмат агародных культур, якія яны вырошчваюць на сваіх агародах, атрымліваюць з галандскіх, расійскіх, украінскіх гатункаў.

Асобныя агароднікі Давыд-Гарадка кладуць пад грады перапрэлы гной пад зіму, другія — толькі ўвесну. Выкарыстоўваюць і кампост, які атрымліваюць наступным чынам. Складваюць на агародзе ў адным месцы каля плота падсцілку з саломы ці чароту з каравяком у шчыльную кучу, якую час ад часу паліваюць. На працягу лета скідваюць у яе пустазелле з агарода, націнне з паспелай агародніны, кветак[582]. За год усё гэта добра пераправае, і атрымліваецца кампост, які прыдатны як каштоўнае арганічнае ўгнаенне.

Увесь агарод тут да сённяшняга дня пераважная большасць гараджан ускопвае рыдлёўкай уручную. А гэта ні многа ні мала — 4—6, а то і болей сотак. Звычайна ён падзелены на прамавугольныя нешырокія (меней 1 м) грады, якія цягнуцца тут праз увесь агарод або падзелены на некалькі маленькіх. Практыкуюць і высокія грады, якія абумоўлены не нізкім месцам, а неабходнасцю паліву ў спякотнае лета ў барозны. Гэтыя грады з абодвух бакоў у канцы баразны маюць невялікі насып, каб не сцякала вада. У асобных агароднікаў, як адзначалі самі рэспандэнты, гэта робіцца з мэтай барацьбы з мядзведкай, якой тут шмат расплядзілася[583]. У баразнах рабіліся ямкі, у іх ўстаўляліся металічныя шкляначкі, якія служылі пасткай для мядзведак. Трапіўшы ў такую шкляначку, яна не магла выбрацца.

Трэба адзначыць, што грады высадкаў у агароднікаў, дзякуючы клапатліваму штодзённаму догляду (праполцы, паліву і г. д.), знаходзяцца ў ідэальным стане, тут няма ніводнай травінкі, яны роўныя, як струна. Усё гэта адпавядае і сядзібам давыд-гарадокцаў: акуратна вылажаным пліткай ці зацэментаваным дворыкам, упрыгожаным кветкамі. Гэта акуратнасць, чысціня двара, агарода, вуліцы прыемна спалучаецца са знешнім выглядам і ўнутраным убраннем даволі вялікіх старых, а таксама катэджнага тыпу сучасных дамоў давыд-гарадоцкіх жыхароў. Тут шануюць даўнія традыцыі продкаў, а таму ва ўбранні хат захаваліся ва ўжытку даўняя мэбля, вышытыя сваімі рукамі шторы, прыгожыя белыя фіранкі на вокнах, ажурныя сурвэткі і іншыя рэчы традыцыйнага побыту.

Некаторыя віды насення высявалі ў канцы лютага — пачатку сакавіка прама на градку (кветкі, радыску і інш.), калі адтае зямля. Другія агародныя культуры сеялі, калі зямля добра прагрэецца, у канцы сакавіка — пачатку красавіка. Перад пасевам насенне прагравалі некалькі гадзін на сонцы. Моркву, цыбулю, буракі садзілі радкамі. Усе расліны, як вядома, патрабуюць падкормкі на працягу лета. Падкармлівалі мачавінай, суперфасфатам, каравяком. Цыбулю, на думку асобных агароднікаў, нельга падкармліваць нічым: яна не любіць падкормкі, у выніку якой заводзяцца чэрві[584].

Зараз у горадзе выдзяляюць па 10 сотак на будаўніцтва дома і агарод. У кожнага ў двары ёсць калодзеж, а гэта значыць — і вада для паліўкі. Памідоры пасынкуюць разоў пяць. Найбольш пашыраны тут 7—8 гатункаў памідораў. Пры першым пасынкаванні расліну фарміруюць у 1 ствол, пасля — у 2. Сеюць памідоры на расаду прыкладна 10 лютага. Падкормка таматаў праводзіцца часцей каравяком. Ставяць пад расліны калкі, падвязваюць, каб яны не хіліліся да зямлі.

Агароднікі практыкуюць пасадку на адной градзе спачатку радыскі і цыбулі, пасля ўборкі якіх сеюць радкамі моркву. Цыбулю збіраюць звычайна ў канцы ліпеня, а морква расце далей да канца верасня. У такім пасеве наглядаецца не толькі эканомія месца для культур, але і добры ўплыў цыбулі на моркву, якую яна засцерагае ад маркоўнай мухі.

Як адзначалася, сённяшнія агароднікі шырока карыстаюцца дапаможнай літаратурай, якая дае веды правільнага вядзення гаспадаркі. Яны маюць магчымасць набыць сертыфікаванае насенне ў спецыяльных магазінах, а таксама ўгнаенні, сродкі абароны раслін, глебу для вырошчвання расады, розныя ручныя прылады працы і машыны для ворыва, акучвання і г. д. Зараз шмат у продажы дражыраванага насення, якое апрацавана і фунгіцыдам, і інсектыцыдам адначасова, не патрабуе прарэджвання.

Усё гэта дазваляе больш эфектыўна працаваць на агародзе і вырошчваць агародніны на невялікіх плошчах болей, чым раней. Вопыт лепшага гаспадарання, як і раней, перадаецца таксама і праз родных, сяброў, суседзяў. Прычым давер да іх практычных вынікаў часам перавышае літаратурны, таму што больш зразумелы і візуальна адчувальны. Трэба сказаць, што асабісты эксперыментальны вопыт асобных

агароднікаў мае вялікае значэнне з пункту гледжання новай больш перспектыўнай тэхналогіі вырошчвання. Так, згодна з апытаннем, пры вырошчванні на сваім дачным участку агародніны непадалёку ад Мінска гаспадыня прыйшла да высновы, што можна садзіць агародніну без ворыва. Таму пасля збору ўраджаю ў канцы жніўня яна высявае масляні-чную рэдзьку. Перад замаразкамі, у кастрычніку, асцярожна пераварочвае пласты зямлі разам з ёй, не разбіваючы пакідае на зіму. Вясной пласт з перапрэлай рэдзькай становіцца лёгкім і не патрабуе ўскопкі. Гаспадыня разбівае камякі з дапамогай жалезных грабель, дадаткова ўносіць кампост і робіць грады, у якія сеецца насенне розных культур[585]. Ураджаі на такой зямлі, дзе верхні пладародны слой застаецца на месцы, атрымліваюцца добрыя. Да таго ж дзякуючы пасеву рэдзькі зямля ўгнойваецца і аздараўляецца.

Прыкладаў правільнага вырошчвання агародніны можна прывесці шмат. Не заўсёды гэты вопыт становіцца вядомы іншым. А таму па-ранейшаму большасць агароднікаў узворвае ці ўскопвае агародную зямлю на непатрэбную глыбіню. Нярэдка можна ўбачыць каля сялянскіх хат на агародзе рыхлыя кучы гною, які вымываецца дажджамі, перасыхае пад сонцам і страчвае свае карысныя якасці. Не ўсе на вёсцы робяць кампоставыя ямы, дзе з карысцю можна было атрымаць добрае арганічнае ўгнаенне, якое істотна павышае ўраджайнасць. Часта больш дасканалую тэхналогію вырошчвання, шырокае выкарыстанне кампосту, мінеральных угнаенняў і г. д. прымяняюць агароднікі-аматары. Яны старанна рыхтуюцца да севу, спачатку высяваючы расаду таматаў, перцу і іншых культур у гаршочках. А для гэтага выконваюць усе аперацыі па прагрэву насення да 50—60 °С, яго абеззаражванню марганцоўкай, растворам паваранай солі. Супраць бактэрыёзу замочваюць на суткі ў растворы антыбіётыкаў, загартоўваюць пры нізкіх тэмпературах да двух сутак і г. д. Кожны агароднік сочыць за прыдатнымі тэрмінамі севу розных культур, рыхтуе парнікі, укрыцці ад замаразкаў.

Шырока прымяняюць агароднікі мульчыраванне глебы з дапамогай поліэтыленавай плёнкі, спанбонду, торфу, гною, якое зніжае выпарэнне вільгаці, павялічвае ўтрыманне ў глебе карысных рэчываў, паляпшае яе структуру і стрымлівае рост пустазелля.

Вядома, што сёння многія агародныя культуры падвяргаюцца пашкоджванню хваробамі і шкоднікамі. Многія лічаць, што гэта звязана з парушэннем севазвароту, калі ў глебе з года ў год накапліваецца вялізная колькасць шкоднікаў якой-небудзь культуры (каларадскі жук, мядзведка, провалачнік і інш.), а таксама хвароб (мучністая раса, антракноз, белая гніль, бактэрыёз і інш.). Да таго ж, калі вырошчваюць адну культуру на адным месцы, у глебе парушаецца баланс пажыўных рэчываў. Таму чаргаванне культур трэба выкарыстоўваць абавязкова.

У распаўсюджанні хвароб і шкоднікаў на сялянскіх агародах пэўную ролю адыграла адсутнасць барацьбы з імі ў папярэднія часы. Так, Магілёўскае абласное ўпраўленне сельскай гаспадаркі (1957 г.) адзначала: «не ведется борьба с вредителями сада и огорода на приусадебных участках колхозников, рабочих и служащих, вследствие чего они продолжают оставаться очагами распространения болезней и вредителей сельскохозяйственных культур»[586]. Узрастала патрэба змагацца з каларадскім жуком, а таксама з мышападобнымі грызунамі і суслікамі, якія хутка распаўсюджваліся. Па дадзеных апытання, да сярэдзіны 1950-ых гг. каларадскі жук быў амаль невядомы агароднікам і сустракаўся адзінкава, а таму, выяўлены на агародзе, знішчаўся. У 1980-ыя гг. ён паўсямесна пашкоджваў пасевы бульбы як на асабістых сядзібах, так і калгасных палях, і барацьба з ім стала неадкладнай справай. Часта не дае вынікаў традыцыйны збор жукоў з раслін, апырскванне іх інсектыцыдамі, да якіх ён хутка прызвычайваецца. У асобных месцах сустракаецца так званы драцянік, які робіць у клубнях шматлікія хады і хутка распаўсюджваецца.

Асноўным метадам барацьбы са шкоднікамі і хваробамі было пратраўліванне ўсіх відаў насення ядахімікатамі. Гэта былі дуст гексахларан, канцэнтрат мінеральна-маслянай эмульсіі ДДТ і гексахларана, медны купарвас, гранаван і меркуран, фармалін, негашаная вапна[587] і інш. Існавалі ранцавыя апырсквальнікі, апырсквальнікі ОБП, конныя, ОК-5, конныя ОПК-ІА[588] і інш.

Шырокае распаўсюджанне ў апошнія два дзесяцігоддзі атрымала такая хвароба раслін, як фітафтароз. Асабліва ўспрымальнымі да яе аказаліся раннія і сярэдняранння гатункі агародніны. Хвароба пашкоджвае найбольшую колькасць

раслін у дажджлівае надвор'е ў ліпені і жніўні. Прыкметай фітафтарозу з'яўляюцца бурыя плямы нявызначанай формы на долях лістоў ніжніх ярусаў раслін (бульбы, таматаў і інш.), а на цыбулі — шэрае пер'е, якое хутка псуецца. Фітафтора хутка распаўсюджваецца пры працяглым і вільготным надвор'і, і ў выніку батва гніе. Хвароба шкодзіць і клубням, ураджайнасць якіх рэзка зніжаецца.

З узнікненнем хваробы былі распрацаваны меры барацьбы з ёй, сярод якіх шырокае прымяненне знайшлі медны купарвас (0,02%-ны раствор), мачавіна з хлорвокісам медзі (4 кг на 1 га). Пачыналі апырскванне, калі расліны былі ростам 15—20 см, і апырсквалі з інтэрвалам у 7—10 дзён, паўтаралі некалькі разоў[589]. Стараліся ў пачатку змыкання батвы высока акучваць расліны, каб скараціць інфіцыраванне астатніх. Бульбоўнік, пашкоджаны фітафтарозам, спальвалі, клубні прасушвалі.

Хваробы, якімі пашкоджваюцца пасевы з-за парушэння правіл севазвароту, дрэнных пагодных умоў і іншага, прыносяць вялікія страты. Так, у пасляваенныя гады, як канстатавалі спецыяльныя службы, значная частка пасеваў бульбы была заражана ракам. У 1957 г. пасевы бульбы, устойлівай да бульбянога раку, склалі толькі 48,9 %[590]. Да таго ж здараліся адзінкавыя выпадкі нападу на яе каларадскага жука. Жукоў збіралі і атрымлівалі тры рублі ўзнагароды за знойдзенага жука (сума, не малая па тым часе), што сведчыць аб тым, што гэтая праблема была толькі ў зародкавым стане.

З мэтай ліквідацыі ачагоў паражэння бульбы ракам быў створаны інстытут пазаштатных каранцінных інспектараў. Пра вопыт правядзення імі мерапрыемстваў у асабістых агародах сведчыць апытанне насельніцтва. Сапраўды, у многіх гаспадароў бульба была пашкоджана ракам, яна была бугрыстай на выгляд. Калі інспектары знаходзілі рак бульбы, уся бульба падлягала знішчэнню, яе аблівалі газай, спальвалі ці закопвалі, а сям'я заставалася без харчу[591]. Магчыма, таму сяляне стараліся схаваць ад пільнага вока інспектараў пашкоджаную бульбу, што прыводзіла да распаўсюджвання хваробы.

У першай палове XX ст. і нават у 1960-ыя гг. у сялянскіх агародах вырошчвалі тытунь, праўда, у невялікай колькасці. Тытунь садзілі паблізу плота на добра асветленых месцах. Пасля збору ўраджаю сушылі і ссыпалі ў мяшэчкі. Выка-

